**Сяргей Панізнік**

# Бранiслава

*Дакументальная аповесць*

Мінск
«Юнацтва»
1985

Для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту

Рэцэнзент — старшы навуковы супрацоўнік
Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ
А. Л. Манаенкаў

© Панізнік С., 1985.

# У СААЎТАРСТВЕ З ЗЕМЛЯКАМІ

*Брацкі партызанскі край... Знаходзіўся ён на пауночным захадзе нашай рэспублікі і ў гады Вялікай Айчыннай вайны займаў каля 10 тысяч квадратных кіламетраў з насельніцтвам звыш 100 тысяч чалавек[1] Уключаў у сябе Расонскі, Асвейскі, Дрысенскі (зараз два апошнія складаюць Верхнядзвінскі), большую частку Полацкага раёна ў Беларусі, Себежскага і Ідрыцкага раёнаў Расіі, прылеглыя раёны Латвіі. 15 тысяч байцоў стаяла на ахове яго рубяжоў.*

*Тут білі фашыстаў рускія і беларусы, латышы і літоўцы, украінцы, казахі, грузіны, татары. У Брацкім партызанскім краі ваявалі ў с е!*

*Супроць партызанскай дзяржавы вораг кінуў у бой карныя сілы: нямецка-фашысцкія акупанты выконвалі тут загад фюрэра — ператварыць савецкую зямлю ў пустыню. Вось жудасныя лічбы: за гады вайны спалена і расстраляна ў Верхнядзвінскім раёне 11 233 чалавекі, 14 175 чалавек вывезена ў рабства[2].*

*Колькі ж было патушана сэрцаў? Колькі талентаў не расцвіло? Суровы лёс напаткаў і тых, хто застаўся ў жывых пасля вогненных вёсак Асвейшчыны. Ім была наканавана жудасная смерць — смерць у растэрміноўку. Асвейцы прайшлі пякельныя кругі Саласпілса, Майданака, Асвенціма, Дахаў, Маўтхаўзена, Гузена, Равенсбрука...*

*Але супроць гітлераўскай палітыкі «выпаленай зямлі» паўставалі партызанскія заслоны, інтэрнацыянальная еднасць, чалавечая спагада, узаемавыручка. Асвейскіх, росіцкіх, сар'янскіх дзяцей ратавалі жанчыны горада Рыгі, іншых латышскіх гарадоў, хутароў... І таму ў Рызе, напрыклад, па сёння амаль на кожнай вуліцы жыве адна ці дзве беларускія сям'і. Такое спарадненне, дружба народаў, узаемавыручка ў цяжкі час яшчэ раз даказваюць, што савецкіх людзей нельга перамагчы.*

*У пошуках матэрыялаў для гэтай кнігі аўтар прайшоў нямала дарог пад небам Асвеі, прайшоў па шляхах асвейцаў ад вогненных вёсак. Так і пісаліся гэтыя радкі — у сааўтарстве з землякамі.*

---

[1] Бандарэнка М. Дружбы яркае святло.— Звязда. 1984, 19 мая.
[2] ЦДАКР БССР, ф. 845, воп. 1, с. 64, л. 3.

## ПАД НЕБАМ АСВЕІ

*Хто ішоў у чорны дзень*
*на агні,—*
*тыя дні і тых людзей*
*памяні.*

*Безмагілле злых гаёў*
*адмяні.*
*Попел нашых каранёў*
*памяні.*

*Кожны хай адно імя*
*назаве!*
*Што ўспомню сёння я —*
*ажыве.*

*Нашу спадчынную грузь*
*азвані...*
*Прарастае Беларусь*
*з глыбіні.*

### Частка першая

Маленькую Броню ў той дзень укусіла гадзюка. Джгнула за нагу, калі дзяўчынка бегла праз кусты. За кожнай вёскай на Асвейшчыне лес, за кожным лесам — вёска. Мама загадала Броні знайсці цялё... Дзяўчынка пабегла. І вось цяпер каля драпіны над пятой выпінае пухліна. Маці — у слязах: здаецца, яна і кроў з раны высмактала, і настою на каранях дала дачушцы, але ўсё ж збіраецца бегчы да гарбатай Адэлькі, каб тая пашаптала.

Адэлька паспяшалася да заходу сонца, каб замова ад гадзюкі мела сілу. Прыйшла, схілілася над дзяўчынкай. Броня ў гарачцы і, можа, таму ніяк не зразумее ўсіх слоў, якія шэпча над ёй цётка Адэлька. І ўяўляе яна агромністую страшную змяю — усю ў іскрах, з чорнымі плямінамі... А цётка Адэлька ўсё шэпча і шэпча: «У чыстым полі, на сінім моры — там стаяў дуб... І пад тым дубам... чараваная кравацьь. А на кравацi ляжаў змей-шкурапей... А пад краваццю змяя падкалодная, страхавая, солнычная, палусолнычная, лунная, палулунная... Даждзявая, месячная, земляная... Палужаная, павудошная, межавая... Давай, бог, помач Броні... Давай... помач... Давай...»

Матчына зелле ці Адэльчына ласка дапамаглі Броні — невядома. Але назаўтра ёй здавалася, быццам яна павольнымі рыўкамі выплывае са сну, а сон чапляецца за яе плечы, рукі, ногі — не выпускае. У хаце было многа народу, але ўсе затаіліся, нібы анямелыя. Цётка Адэлька шаптала ёй на вуха, але ўжо не так, як учора,— без той важнасці, узнёсласці, таямнічасці; а так, як сваёй роўні: «Немец, змей-шкурапей, на нас пайшоў... учорака... Пранясіце яго над намі, сілы нябесныя...»

З Броняй я сустрэўся ў Латвіі некалькі гадоў назад. Што было з ёй 22 чэрвеня 1941 года — не памятае. Успамінае наступныя дні, уяўляе ласкавы, спа гадны твар цёткі Адэлькі. «Сілы нябесныя» міма вёскі пранеслі варожую калону. Людзі пашумелі-пашумелі і пачалі супакойвацца: «А, патузаюцца нашы з немцам і адкоцяць яго назад...»

Гаспадарамі тут былі свае — партызаны. Потым быў лес, спаленая родная вёска, чыгуначная станцыя і эшалон, барак, аўчаркі, бірка на шыі, апошні матчын крык...

Калі Бронінай дачцэ споўнілася столькі ж, колькі ёй самой было ў канцлагеры, Броня са сваім мужам Янісам адважылася паехаць у Саласпілс і на тым самым месцы, дзе стаяў барак, сфатаграфавала дачушку. Маці была сумная, разгубленая, і прыгожанькая Вэлта аказалася на здымку з вінаватай усмешкай. Толькі кветкі шыпшыны пранікліва ўглядаліся з-за Вэлціных плячэй, быццам гэта былі вочы не вядомых ёй брацікаў і сястрычак.

Пры сустрэчы Броня сказала, што так і не адшукала ні сваіх бацькоў, ні нават той вёсачкі, дзе нарадзілася. Толькі і ведае, што родам з Асвейшчыны.

— Паедзем да родных Яніса — у мяне аж сэрца заходзіцца: ва ўсіх ёсць прытулак, ёсць род свой, свае карані. І хоць не адна я на свеце, а ўсё ж нейкая сіроцкая струна шчыміць у маёй душы...

Пазнаёміўшыся з Броніславай, дазнаўшыся пра яе нялёгкі лёс, я ўжо не мог абмінуць, прыязджаючы ў Рыгу, старадаўні дом, не наведаць сціплую кватэру Броні і Яніса. Мы сталі перапісвацца, пасябравалі. Вось так я і распачаў нялёгкі пошук, каб дапамагчы Броніславе знайсці сваю радню. Але як гэта зрабіць? Дзе знайсці першую нітачку пошуку, першы вузельчык? І я зноў наведаў кватэру зямлячкі.

Мае рыжане былі ў разгубленасці...

— Але ж табе, Браніслава, у 43-м ішоў сёмы год. Пра Адэльку помніш... Абы зачэпку якую... А там у людзей...

— Што ты! Мае няшчасце ў тым, што я не магу ўспамінаць. Сілюся нешта ўспомніць — а ў галаве тады нібы полымя пачынае шугаць. Гэта я, відаць, калі была малой, блізка стаяла ад нашай хаты,

якую палілі. З таго і пачалося... Варта ўспомніць вайну — жар да сэрца падступае, млосна робіцца... Вось каб людзі мне расказвалі пра тое, што было з імі на Асвейшчыне...

— А што гэта дасць?

— Я ж кажу, што ўспамінаць не магу. А вось прызнаць успомненае, здаецца, змагла б.

— Як гэта? — не зразумеў я.

— Ну вось калі мне пачыналі расказваць былыя вязні пра свае пакуты, я нейкім пачуццём прызнавала, што са мною так не было. Было іначай, не з імі я тады была, а з другімі людзьмі. А як з усімі сустрэцца, каб выслухаць іх, каб апазнаць у іх бедах сваю бяду, у іх шляхах свой шлях? Гэта ж тысячы лёсаў...

— Так. Статыстыка Асвейшчыны вельмі страшная: з 14 175 чалавек, вывезеных у рабства, амаль усе прайшлі Саласпілс...

— Акрамя мяне, значыць, было яшчэ 14 174...— Браніслава задумалася.— А колькі вярнулася з іх дадому?

— Хто скажа. На Віцебшчыне пасля вайны не стала кожнага трэцяга. Ды нават і ўцалелыя не ўсе маглі прыйсці на роднае котлішча. Аднаго разу ў Драгобычы мне прызналася ў зямляцтве жанчына. Сказала, што яна нарадзілася каля Дрысы. Вядома, я запытаўся, чаму жыве так далека ад родных мясцін...

— Ды і я ж жыву не на бацькаўшчыне,— нібы з віною ў голасе, перабіла мяне Браніслава.

— Тая беларуска з Драгобыча пасля вайны паспрабавала вярнуцца. Толькі ўзышла, казала мне, на свой былы падворак, як уявілася ёй такая карціна: карнікі ў двары, яны загадалі бацьку капаць магілу для сваёй сям'і...

Тады, у вайну, яна цудам выжыла. Але памяць яе стала невыносным болем. І яна кінулася бегчы са свайго двара...

— Вось чаму многія мае землякі і жывуць там, куды закінуў іх лёс,— прамовіла Браніслава.— Значыць, ты зможаш зразумець, што сталася з маёй памяццю. Памяць маю знявечыла вайна...

— Таму і хочацца табе дапамагчы, Браніслава. Нядаўна я ў Дубултах гаварыў з латышскім пісьменнікам Эйжэнам Вэверысам. Тады яшчэ і не думаў, што ўбачуся з табой. Мо і выпадкова я запытаўся ў былога вязня Саласпілса, Штутгофа, Маўтхаўзена, ці не сустракаў ён на сваім нялёгкім шляху каго-небудзь з маіх землякоў. Эйжэн Вэверыс сказаў, што разам з ім у саласпілскім бараку быў партызанскі паэт, вывезены з Віцебшчыны ў час карнай экспедыцыі. У 1944 годзе ён загінуў у каменяломнях Маўтхаўзена. Я папрасіў латышскага паэта назваць яго імя. Эйжэн Вэверыс сумеўся: «Забыўся.

Усё помню: аблічча, голас, як разам чыталі вершы... Ён па-беларуску, а я па-латышску чытаў — каб падняць дух вязняў. А вось імя — забыўся».

— Не стала Вэверыса, і цяпер няма каму ўспомніць імя чалавека...

— Твая праўда, Браніслава. Але з табой мы дамовімся так: я буду шукаць тваю памяць, шукаць людзей з Асвейшчыны, дзе б яны ні жылі, і буду прасіць у іх расказаць пра свой лёс, пра тое, што было з імі п а с л я вогненных вёсак. І кожную запісаную гісторыю потым паўтару табе.

Броня ўсхвалявана паглядзела на мяне.

— Тады я змагу выбраць толькі тое, што было са мной. Няўжо да мяне вернецца мае прозвішча, мая вёска, мая мама?

— Будзем верыць, Браніслава. Абяцаю, што перакажу табе ўсё, што пачую ад людзей, Усё пра вайну, як сказаў адзін пісьменнік, можа помніць толькі народ. А з вялікай памяці лягчэй будзе выбраць тваю, Браніслава.

— Да сустрэчы!

— Да ўспомнення!

І вось я ў Бігосаве. Гляджу на карту і знаходжу лінію чыгункі, якая злучае Рыгу, Даўгаўпілс, Бігосава, Верхнядзвінск. Калі была вайна, то ўсё, што ляжала на поўнач ад гэтай лініі, карнікі спальвалі. І Бігосава было адным з тых пунктаў, праз які людзей, якіх не паспелі знішчыць,— адпраўлялі ў рабства, і ў першую чаргу на сарціроўку ў так званы працоўны і выхаваўчы лагер Саласпілс. Вядома, што тут трэба мне шукаць сляды той маленькай Броні.

Вёска Бігосава вядома з 1861 года. Называлася яна Георгіеўскай, калі адзін пан прайграў яе ў карты другому пану. Савецкая ўлада ўсталявалася на Прыдзвінні ў лістападзе 1917 года. Захавалася тэлеграфная перапіска Лукаша Барысавіча Урбана, першага старшыні Дрысенскага Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў, з Леніным, калі нахрапістыя нашчадкі крыжакоў, цяпер яны ўжо называліся кайзераўцамі, з новым запалам лезлі на Усход:

«Петраград. Леніну.

Немцы занялі Дзвінск і працягваюць далейшы рух. Тэлеграфуйце тэрмінова, што рабіць Дрысенскаму Саўдэпу, секцыям, казначэйству ў выпадку набліжэння немцаў да Дрысы.

Старшыня Дрысенскага Саўдэпа Урбан» [3].

---

[3] Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину. Мн., 1984, с. 24.

19 лютага 1918 года ў Дрысу прыйшоў адказ. Ленін заклікаў аказваць супраціўленне, дзе гэта магчыма, не пакідаць ворагу нічога.

«Дарагая Броня,— думаў я, ходзячы па Бігосаве.— Уся наша Беларусь, а не толькі яе гасцінцы і тракты, яе прасёлкі, была на скрыжаваннях крывавых вякоў. І за гэту лапінку зямлі, падпеCразаную Дзвіной, Росіцай, Дрысай, ішоў на штурм Зімняга Іван Мікалаевіч Клімаў, ваяваў супроць Калчака, Урангеля, Махно Антон Францавіч Варановіч, біў Дзянікіна Рыгор Макаравіч Зінько, вызваляў ад белапалякаў Полацк, Вільню, Гродна Браніслаў Ігнатавіч Замбар, абараняў Маскву Восіп Іванавіч Сардыка, двойчы быў прысуджаны да расстрэлу за сувязь з партызанамі, у мінулым георгіеўскі кавалер, будзёнавец Павел Ціханавіч Герасімаў... Усё гэта твае землякі, Броня.

Твой век перавысіў мой толькі на нейкія тры гады, а мы, я думаю, не трапілі з табой у шэрагі аднаго пакалення. Бо ты нарадзілася да 1941 года, а я — пасля. І мне не давялося перажыць столькі, колькі тваім аднагодкам. Я добра памятаю пасляваенную дзятлавінку, якую збіраў з бабуляй Альжбетай (потым галоўкі сушылі і дамешвалі да бульбы, каб спячы хлеб). Да таго ж мая хата стаяла на поўдзень, а не на поўнач ад той чыгункі, па якой ехалі карнікі, і вынішчэнне майго роду яны планавалі на пасля.

Але мы аднолькава ўдзячны тым, хто здабыў нам Перамогу. І, магчыма, таму ты засталася ў жывых, Броня, што твой зямляк-бігосавец Баляслаў Эдуардавіч Ашурак 21 верасня 1944 года на хвіліну раней уварваўся ў Маяры, курортны гарадок на Рыжскім узмор'і, і фашысты не паспелі атруціць дзяцей мо якраз у тваім прытулку. У Маяры, недалёка ад прыгожай гасцініцы, гарыць сёння Вечны агонь. Другі твой зямляк, Іван Вікенцьевіч Сцепановіч, зрабіў апошні стрэл па ворагу 20 красавіка 1945 года на чэхаславацкай зямлі. Толькі па Бігосаўскім сельсавеце загінуў смерцю храбрых, змагаючыся на франтах і ў партызанскіх атрадах, 221 чалавек[4]. Але вораг лічыў сваім працаўнікам, Броня, усіх да апошняга тваіх землякоў. І цябе таксама.

Нездарма обер-групэнфюрэр СС генерал паліцыі Фрыдрых Экельн, які ўзначальваў і накіроўваў дзейнасць усіх карных органаў у Прыбалтыцы, а да верасня 1942 года таксама і на тэрыторыі Беларусі, на судзе над ваеннымі злачынцамі даў наступныя паказанні: «Савецкія

[4] Кніга Славы Бігосаўскага сельскага Савета.

грамадзяне арыштоўваліся... за тое, што яны з'яўляліся савецкімі патрыётамі і былі настроены супроць нас як акупантаў»[5].

Савецкія патрыёты... Хто ж яны, нашы папярэднікі? Сваімі сэрцамі прыкрылі яны нас, абаранілі — ад рабства, ад пакут, ад смерці. Ратавалі нас, часта ахвяруючы сваім жыццём. Бо святая справа кожнага народа — абараніць ад ворага сябе, сваю зямлю, сваю будучыню.

На прыкладзе Асвеі можна і зараз паказаць кожнаму, што такое ўсенародная барацьба з фашызмам. Тут ваявала з акупантамі кожная савецкая сям'я.

У архіве Верхнядзвінскага райкома партыі я знаходзіў радкі, нібы баявое рэха асвейскіх мсціўцаў, пра тое, як летам 1942 года на чыгунцы Іваноў Яўген паставіў міну. Падарваўся эшалон, які ішоў на фронт з жывой сілай і тэхнікай. А праз некалькі хвілін з-за павароткі на вялікай хуткасці вылецеў сустрэчны эшалон, які ўрэзаўся ва ўжо разбіты састаў. Не паспеў асесці пыл ад крушэння, як па першым шляху, таксама ў бок фронту, на вялікай хуткасці імчаў эшалон з танкамі і войскам. І ён таксама пайшоў пад адхон... Загінулі на месцы крушэння многія дзесяткі гітлераўскіх ваяк.

34 палымяныя сэрцы — вось з чаго ўзнікла Асвейская падпольная арганізацыя супраціўлення. Даў імпульс яе баявому жыццю камуніст Сімацкі Уладзімір Уладзіміравіч. Гэта было ў пачатку жніўня 1941 года. 17 кастрычніка 1942 года ён загінуў смерцю героя.

23 камсамольцы налічвала Сар'янская падпольная арганізацыя. Загінула ад рук карнікаў камсамолка Лядак Еўдакія Іванаўна, памёр ад ран былы трактарыст Пілюшкін Павел Кліменцьевіч, у баі загінуў партызан Чыркун Мікалай Васільевіч... Усе яны смела выйшлі насустрач нязванаму чужынцу.

Герой Савецкага Саюза Іван Кузьміч Захараў пісаў, што ў Асвейскім раёне на 1 студзеня 1942 года было створана 9 партыйных і 8 камсамольскіх падпольных груп. Са 120 чалавек актыву вырасла праз некаторы час сапраўдная партызанская армія. Толькі партызаны брыгады імя Фрунзе, якой камандавалі І. К. Захараў і М. М. Кузьмін, з вясны 1942 года па 1 ліпеня 1944 года знішчылі некалькі тысяч гітлераўцаў.

А якіх байцоў выгадавала асвейская зямля! Так, Мікалай Самусёнак з атрада імя Арджанікідзе ўдзельнічаў у падрыве 20 варожых эшалонаў. Партызан быў узнагароджаны ордэнам Леніна. 18 чэрвеня 1942 года ў атрад «Баявы», напрыклад, добраахвотна ўступіў вучань 10

[5] Судебный процесс по делу о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков на территории Латвийской, Литовской и Эстонской ССР. Рига, 1946, с. 14.

класа Боркавіцкай школы камсамолец Іван Голубеў. Ён хутка вывучыў падрыўную справу. На перагоне Дрыса — Полацк падрываў эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага.

Ордэнам Айчыннай Вайны 2-й ступені, медалямі «За баявыя заслугі» і «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені адзначаны баявыя справы Лёні Касача, партызана 2-й Дрысенскай брыгады. Спачатку раскідваў лістоўкі ў вёсках Баравуха, Адамова, Боркавічы, збіраў і перадаваў партызанам зброю. Потым стаў мінёрам. Група, у якой ваяваў Лёня, пусціла пад адхон 12 эшалонаў, знішчыла 23 аўтамашыны... Вясной 1944 года Лёня, ужо камсамолец, быў назначаны камандзірам аддзялення падрыўнікоў. А потым Лёня Касач стаў байцом Чырвонай Арміі. Родным ён пісаў: «Я іду помсціць за сваю Беларусь родную, за пакуты беларускага народа, за разбураныя гарады і сёлы...» [6].

Загінуў Лёня Касач на фронце 19 снежня 1944 года.

Юныя патрыёты не схілялі галовы перад ворагамі іх роднай зямлі. Усяго на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў падполлі і партызанскіх атрадах змагалася больш як 50 тысяч школьнікаў[7]. Такіх, як Лёня Касач, як Лена Сураўнёва.

Разведчыца Лена Сураўнёва загінула каля вёскі Лісна. 23 мая 1944 года, вяртаючыся з Себежа пасля выканання адказнага задання, Лена трапіла ў засаду. Яе доўга катавалі фашысты, але так і не дабіліся патрэбных звестак. Обальская школа, у якой вучылася Лена перад вайной, ганарыцца юнай гераіняй.

Не давалі спакою акупантам і члены Прошкаўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі. Яны пакляліся, што не пашкадуюць сілы і нават жыцця для барацьбы з фашызмам. Сярод членаў гэтай арганізацыі былі Лукашонкі — Міхаіл Сяргеевіч, Васіль Ільіч, Пётр Аркадзьевіч, камуніст, арганізатар супраціўлення — Рыгор Сяргеевіч; сям'я Прошкаў — Марыя Барысаўна і Фрасення Паўлаўна; сям'я Фралёнкаў — Яўгенія Усцінаўна і Герасім Якаўлевіч. Гэта праз Герасіма Якаўлевіча была ўстаноўлена сувязь з латышскімі падпольшчыкамі, якіх узначальваў Аляксандр Гром. У 1943 годзе сям'я Фралёнка была арыштавана, дом спалены.

Потым падпольшчыкі ўліліся ў атрады лясных салдат.

Нельга без хвалявання чытаць баявую характарыстыку палітрука 1-га ўзвода, 1-га атрада імя М. В. Фрунзе брыгады імя М. В. Фрунзе

---

[6] Орлята Великой Отечественной. Мн., 1972, с. 8.
[7] Патриотизм учителей и школьников Белоруссии в борьбе против немецко-фашистских оккупантов. Мн., 1980, с. 74.

Лукашонка Васіля Ільіча: «Лукашонак В. І. — дабраволец партызанскага атрада з 23 мая 1942 года. Перад гэтым працаваў сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая складалася з 12 чалавек. Камсамольцы сабралі і здалі ў атрад ручных кулямётаў — 4, аўтаматаў — 3, вінтовак — 17, вялікую колькасць патронаў і гранат...»

Уся камсамольская група, чытаю далей, пайшла ў партызаны. Лукашонак быў актыўны, адданы таварыш, слаўны патрыёт сваёй Радзімы. Удзельнічаў амаль ва ўсіх баявых аперацыях атрада, праяўляючы мужнасць і геройства. Яго кулямёт метка біў гітлераўцаў пры разгроме гарнізона ў Палішчыне, Каханавічах, Асунах, пры ўзрыве Баніслаўскага чыгуначнага моста, пры знішчэнні паліцэйскіх упраў, у засадах. Лукашонак быў цяжка паранены ў руку і нагу. Пасля выздараўлення вярнуўся ў строй.

...5 верасня 1943 года пры падыходзе да чыгункі група, якой камандаваў Лукашонак, трапіла ў засаду. Ён быў паранены, але не выйшаў з бою, вёў агонь з аўтамата, закідваў ворага гранатамі.

Кожны з прошкаўскіх хлопцаў і дзяўчат, уступаючы ў падпольную камсамольскую арганізацыю, даў клятву «быць адданым Радзіме, не шкадаваць сілы і жыцця ў барацьбе з фашызмам, выконваць усе даручэнні арганізацыі...». На баявым рахунку адважных партызан з Прошак 6 спушчаных пад адхон і спаленых цягнікоў з баявой тэхнікай ворага, сотні знішчаных фашыстаў.

За актыўны ўдзел у Прошкаўскім камсамольскім падполлі, смеласць і адвагу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі Смычкоў Пётр Сямёнавіч і прадстаўнік латышскай моладзі Гром Аляксандр Міхайлавіч былі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, а Лукашонак Васіль Ільіч — ордэнам Айчыннай Вайны 2-й ступені.

Інтэрнацыянальная еднасць павялічвала партызанскія сілы. Пра гэта сведчыць Сцяпан Дзмітрыевіч Дзеліжонак, былы камандзір атрада імя У. І. Леніна 1-й Дрысенскай брыгады:

«У Смалоўках немцы трымалі моцны гарнізон. Адсюль яны часта ездзілі ў Якубава за боепрыпасамі, прадуктамі. Каля Самусеўкі, днём, мы, аб'яднаныя сілы латышскіх і беларускіх партызан, і дачакаліся ворага.

У абозе было 10 параконных падвод. Асобна ехаў афіцэр, камандзір гарнізона. На кожнай падводзе сядзела па 3-4 гітлераўды. Бой быў кароткі, жорсткі. Мы перайшлі ўрукапашную. І вось вынікі: забіта фашыстаў — 41, узята ў палон — 13, двум удалося ўцячы. Забіты быў і камандзір гарнізона.

Мы захапілі каштоўныя дакументы, 3 кулямёты, 12 аўтаматаў, 32 вінтоўкі, 7 падвод з боепрыпасамі. Асабліва вызначыліся ў баі началь-

нік штаба Гаркоўскі Антон Паўлавіч, кулямётчык Аляксандр Шурыгін».

Пра гэты нескароны куток савецкай зямлі — «Брацкі партызанскі край» — пісалі І. Захараў («Вайна ў краі азёр»), А. Шамаль («У Сар'янскіх лясах»), І. Мандрык («У суровыя дні»), У. Хазанскі («Спытайце ў бяроз...»), С. Аслёзаў («Узрыў на світанку»)... А таксама ў латышскай мемуарнай і мастацкай літаратуры часта згадваецца Асвейшчына. Вось некалькі радкоў з кнігі А. Грома і Л. Вацзэмнієка «Карчаломы» пра тое, як невыносна было акупантам на партызанскай зямлі. Самі фашысты прызнаваліся: «Ох гэтыя пушчы Беларусі: як непраходныя джунглі, дзе кожны на ўзгорку куст, кожны гнілы пень ці камель хвоі хаваюць у сабе неспазнаныя жахі, ад якіх дрыгодце бяжыць па касцях і ногі становяцца халоднымі, бы тыя ледзяшы! Як і дзе ставіць нагу на зямлю, якая начынена гневам і помстай, як адна суцэльная магнітная міна?»

Нямала сумесных аперацый правялі браты па зброі. 13 студзеня 1943 года каля 700 беларускіх і латышскіх партызан удала разграмілі валасны цэнтр Вэцслабада за Лудзай, варожы гарнізон Шкяўна. Латыш Імант Судмаліс агнём кулямёта падтрымліваў у баі беларуса Васіля Лукашонка.

І нездарма недалёка ад беларускіх вёсак Забор'е, Прошкі на сутыку трох рэспублік насыпаны Курган дружбы, куды ў кожную першую нядзелю ліпеня з'язджаюцца былыя партызаны, каб аддаць паклон Брацкаму партызанскаму краю, успомніць тыя суровыя гады. Пякучая памяць простых людзей вяртае нас у полымя пражытых гадоў.

Усенароднае супраціўленне ашаламіла акупантаў. І калі не даў вынікаў націск на партызанскія атрады, гітлераўцы пачалі спаганяць злосць на бяззбройных людзях. Ужо згаданы намі Экельн з лютага па красавік 1943 года з падначаленымі яму часцямі правёў карную экспедыцыю. Гэты злачынец загадаў «ачысціць ад мірнага насельніцтва раён возера Асвейскага і спаліць усе населеныя пункты»[8].

...16 лютага 1943 года. У гэты дзень пачалася адна з карных экспедыцый на Асвейшчыну. Слухай, Броня, што было ў ноч з 15 на 16 лютага, калі агонь, прызначаны для тваёй хаты, яшчэ спаў у запалцы карніка.

**Ліпаўка Марыя Станіславаўна** ўспамінае:

— Той карны атрад пасялілі ў Бігосаве па дамах. І ў маю хату прывялі некалькі чалавек. Трывожна было на душы. А больш за ўсё набралася я страху ўночы. Ваякі спалі на падлозе. Спрасоння адны з

---

[8] Судебный процесс..., с. 21.

іх ускоквалі, крычалі. Наслухалася трызненняў праз усю ноч. Раніцай усе пайшлі па дарозе на Росіцу. Праз некаторы час у тым баку дым зачаўся. Пачалі паліць...

Сведчыць жыхарка пасёлка Росіца **Мароз Валянціна Восіпаўна**:

— Каб не трапіць да карнікаў, мы ўцякалі аж пад Невель, пакуль фашысты нас не перанялі. Прыйшлося дамоў вяртацца. А там ужо пачалі гаспадарыць акупанты. Дазналася, што будуць страляць савецкіх актывістаў. У спісе на арышт была і я, былая настаўніца. Мне ўдалося ўратавацца. А мужчын расстралялі: Пятра Барону, Міхаіла Шутко, Паўла Уселенку...

У снежні 1942 года партызаны выбілі фашыстаў з Росіцы. Камендатура перамясцілася ў Бігосава... Якраз у ноч з 15 на 16 лютага 1943 года я на санях ехала пад Сушкі. Чую: на чыгунцы — страляніна...

Назаўтра першымі ад Бігосава гарэлі вёскі Марозы і Каменцы. Хто ўцёк адтуль, крычаць нам: «Паляць!» Тады мы і кінуліся ў Засценак, лес так называўся. А з поўначы таксама пайшлі на нас карнікі. Каго паспелі — злавілі, але ў самы лес не заходзілі: баяліся партызан...

Як цяжка, Браніслава, ісці па дарогах горкіх успамінаў. А яшчэ цяжэй прасіць людзей з вогненных вёсак Асвейшчыны ўспомніць вайну. Вось і зараз слухаю пажылую цётку, а сам уяўляю пажарышча, на месцы якога раніцой 16 лютага 1943 года была веска Каменцы.

**Грыбоўская Марыя Данатаўна** ўспамінае:

— Зараз у Каменцах толькі тры хаты стаяць. Сем удоў жыве. Адна з іх штозіму да дачкі з'язджае. Ушасцёх застаёмся. Да вайны тут 13 двароў стаяла. Ну, а тады... Выгналі з хат. Абглядаюць нас. Мароз Марыя, ёй 25 гадоў было, трымала пад пахай кніжку: з-пад курткі яна выпіналася. Дык тыя, мусіць, падумалі, што дзяўчына гранату схавала: былі ж напужаныя — на партызан ідуць...

Карнікі стрэлілі ў дзяўчыну, а потым на штыках занеслі ў агонь. Перад самым полымем Марыя яшчэ раз паспела крыкнуць: «Мама»! Карнік стрэліў ёй прама ў твар. Матка ад такога катавання без памяці крычала каля пажарышча, пакуль яе таксама не кінулі ў агонь.

У той дзень Каменцаў не стала, расказвала мне **Тозя Станіславаўна Гіруцкая**. Яна цудам уцалела са сваёй сястрой, Эльвірай. А Марыю Данатаўну Грыбоўскую са свякроўкай і з дзвюма дочкамі (трохгадовай і дзевяцімесячнай) перавялі карнікі з групы смяротнікаў у групу для адпраўкі ў канцлагер.

— Гасцявала нядаўна ў мяне ўнучка, — казала далей Марыя Данатаўна.— Глядзім гэта мы па тэлевізары фільм. Паказваюць вайну, эсэсаўцаў з аўчаркамі. Я аж калачуся, слёзы набягаюць, а ўнучка, гледзячы на мяне, пытаецца: «Бабуля, а чаго ты плачаш? Гэта ж

толькі кіно...» — «Во, як атрымліваецца»,— падумалася мне. Кіно... Але тое, што мы перажылі, гэта ж праўда!

Так, праўда. Праўда і тое, што ворагі нашай зямлі баяцца гэтай праўды. Бо праўда — гэта і памяць: памяць болю, смерці, пакут. А наша праўда, наша памяць — гэта і суд наш над фашызмам, над гвалтам, бесчалавечнасцю, подласцю.

Таму і патрэбна памятаць усё бядотнае, жудаснае, усё, чаго нельга дараваць фашысцкім злачынцам. І вялікі паклон усім тым, хто нясе ў сабе гэту цяжкую нескароную памяць.

Дарагая Броня! Я пытаў у Каменцах і пра цябе. Сказалі там, што ёсць адна маці, якая не знайшла сваё дзіцятка пасля вайны. Гэта Шпакоўская Бранiслава з Марозаў. А як звалі тваю маці?

Хто б нам сказаў пра гэта...

Іду далей. Вось што было ў лютым 1943 года ў вёсцы Плігаўкі.

Расказвае **Андруховіч Галіна Пятроўна**:

— Нас трое дзяцей было ў маці... Бачым — кулямёт праз акно ў хату прасунулі і загадваюць выходзіць. Выбеглі мы цераз дарогу да суседа. А суседава хата — гарыць. Мы — назад. Тут брату Зэнусю ў жывот стрэлілі, а сястры Яніне — у галаву. Падбягаю з мамай пад хату, а карнікі: «Назад!» Мама мяне схапіла за руку і кінулася да Панораў бегчы. Тут і маму забілі. З плігаўскіх сямей толькі 7 дзяцей у жывых і засталося.

— А ці памятаеце іх імёны?

— Як жа, помню: Галя, Іван, Іра, Зіна, Рэня... А вось як звалі адну дзяўчынку, не ведаю. Бо ёй усяго тры месяцы было...

Тры месяцы... Значыць, гэта была не ты, Броня. Таму я пайду далей: пытацца, слухаць, шукаць...

І вось сяджу ў новай хаце **Варахоб Настассі Мікалаеўны**. Гаспадыня кінула работу, прысела да стала:

— Росіца была такая: дзярэўня двароў на 80, а на ўзгорку — мястэчка. Мала хто з нас у лес пайшоў, хоць нам партызаны і казалі. Хто думаў, што нас караць прыйдуць. Вайна, але каб людзей паліць?..

Але як пайшоў з-пад Бігосава дым у неба, усе замітусіліся. Я была з сястрой Нюрай, маладзейшанькай. Дрэнна апрануліся: не думалі, што наўсягды. У лесе нас і пабралі, усіх — і з-пад Каханавіч, і з-пад Асвеі. Старэйшых адразу пагналі паліць. Народ крычыць... Ох ты божа, і ў памяці не змесціш, што перажыта... Пуня ў канцы вёскі стаяла. Там і палілі. Запяклася зямля. Ніводзін чалавек не ўзяўся парушыць яе... помнік там трэба паставіць...

Ох цётка Настасся, цётка Настасся... Разлучылася яна ў лесе са сваёй сястрою, набілі яе плёткамі ў Саласпілсе, Майданаку, Равенс-

бруку, дзе «дзень-ноч з трубы дым ішоў чарней, як з паравоза». Столькі смярцей каля яе прайшло...

Прагучала ўсяго некалькі ўспамінаў, запісаных ад цудам уцалелых сведкаў Асвейскай трагедыі.

Паслухаем, Браніслава, тваю зямлячку — маці пяцярых дзяцей **Кадыш Юзэфу Уладзіміраўну**:

— 16 лютага страшны быў дзень і для вёскі Мядзведзева. Усю зіму ў нас па хатах стаялі партызаны. Хадзілі на заданні. А мы, жанчыны, іх абшывалі, кармілі.

Аднаго разу кажуць: «Пойдзе карная экспедыцыя. Будзе страшна». Яшчэ 14-га так гаварылі. А 16-га самалёты паказаліся, пачалі біць з кулямётаў. Мы ж фашыстаў не бачылі на вочы з 41-га года, жылі ў партызанскай зоне.

Юзэфе Уладзіміраўне ішоў тады 20 год. Яе бацька быў на фронце, брат Осіп партызаніў. Праз год пасля гэтага ён загіне ў няроўным баі. А брату Ігнату ішоў тады 10-ы, сястры Людміле — і таго менш. А былі яшчэ ў хаце яе мама, дзед і бабуля.

— У Мілавіцкія лясы мы падаліся. Карнікаў стрымлівалі партызаны. А мы — столькі народу!— адыходзілі лясамі некалькі сутак запар...

І ўсё ж сілы былі няроўныя. Карнікі акружалі трупы бежанцаў і бралі ў палон. Шлях гэтай сялянкі пралёг праз Рыжскую цэнтральную турму, Саласпілс... У Равенсбруку яна насіла нумар 40 825...

У Росіцы мне расказвалі так. Некалькі гадоў пасля вайны шукала сваё дзіцятка Шутко Соф'я Цімафееўна з вёскі Росіца. І вось я ў сялянскай хаце, дзе Соф'я Цімафееўна жыве з братам:

— Там два дзеравы астаўшыся, дзе наша хата стаяла. Недалёка адсюль. Пасля грамніц гэта было. Як бы ўчора пагода стаяла... Былі парцізаны... Тапіла ім печку. А тут страшныя два самалёты паказаліся. І хаты запальваюць. Нехта як закрычыць на двары: «Уцякайце, паляць разам з людзьмі». Я за малога, за санкі і ў лес. Нас такіх чалавек сорак сабралася. А тут па нас страляюць. На снезе — людзі. Вядома, нас відзяць. А кулі не далятаюць... Кулі чамусьці не далятаюць...

Так і блукалі па лесе галодныя. Аднаго разу выйшлі на край лесу. З-пад елак глянулі. Грабяць Ціршава! Чулі мы — запалілі. А ў хатах крыкі, стогны. З усімі людзьмі спалілі Ціршава. Мы зноў у лес падаліся. Агонь пачалі распальваць. І назаўтра нас акружылі. А перад гэтым тры бабы і дзве дзяўчыны ў разведку пайшлі. Трапілі на засаду. Хто знае, што з імі. У адной бабы двое дзяцей з намі засталося. Сіроткамі сталі.

Нам крычаць: «Рукі ўверх!» Абшчупалі і ў касцёл павялі. Двое сутак, як толькі падавалі падводы, вывозілі некуды людзей. А мне ўсё не хапала падводы. Галодная стаю, мокрая.

Потым аддзялілі маладзейшых баб з дзецьмі і на падводы. Павезлі на Ворзава. У канцы Росіцы, што каменне чорнае, спаленыя людзі ляжалі. У Саласпілсе вырвалі ў мяне з рук сына. Толькі семнаццацігадовага яго зноў убачыла...

Гаворыць **Мароз Вячаслаў Дзяменцьевіч** з вёскі Марозы:

— Раніцай у Бігосаве мяне вядуць у дальні вагон, а дачка высунула галоўку з вагона і крычыць: «Тата!» А нас далей павялі. Толькі паспеў прыкмеціць, што на кожным вагоне крэйдай было напісана: «Партызанен»...

Колькі саставаў пайшло на захад з такім надпісам!

Але не заўсёды ўдавалася ворагу беспакарана распраўляцца з безабароннымі людзьмі. Чытаю выпіску з партызанскага загада ад 17.02.1943 г. Гэты дакумент быў знойдзены ў архіве Верхнядзвінскага райкома партыі:

«18 лютага гэтага года непрыяцель сканцэнтраваў свае сілы ў Латвіі, Дрысе і Бігосаве, з дапамогай самалётаў пачаў сваю грабежніцка-разбойніцкую дзейнасць. У Дрысенскім і Асвейскім раёнах на шляху свайго руху вораг па-зверску распраўляўся з мірным насельніцтвам. Жыхароў зганялі ў хаты, хлявы і спальвалі. Тых, хто меціў уцячы, расстрэльвалі. У адной толькі вёсцы Залешчына нямецкія бандыты спалілі больш як 100 чалавек жанчын, дзяцей, старых, а ў лесе каля вёскі Корнікі партызаны выявілі больш сотні чалавек расстраляных, у тым ліку і немаўлят. Статак, хлеб і пажытак карнікі забіралі і адпраўлялі да сябе ў тыл. Такімі разбойніцкімі дзеяннямі нямецка-фашысцкія бандыты пакінулі тысячы мірных жыхароў без жытла і куска хлеба.

16 лютага гэтага года нашы партызаны ўступілі ў бой з бандытамі, праяўляючы стойкасць, мужнасць і геройства, знішчылі сотні фашысцкіх мярзотнікаў.

За выяўленую стойкасць, мужнасць і смеласць у баях пад вёскамі Сар'я, Калюты, Аніськава, Мядзведзева ўсяму асабоваму саставу атрадаў, якія ўдзельнічалі ў гэтых баях, аб'яўлена падзяка...»

У тыя дні з апошніх сіл стаялі партызанскія заслоны, прыкрываючы адыход вёсак у лясы, ратуючы людзей ад вынішчэння.

Толькі пасля вайны выявіліся многія дакументы, адкуль стала вядома, як наш смяротны вораг планаваў забойства савецкіх людзей, каб ператварыць нашу зямлю ў сваю калонію.

Першапачаткова планавалася падзяліць савецкую тэрыторыю на 6 рэйхскамісарыятаў. У адзін з іх — Остланд — меркавалася ўключыць Прыбалтыку і — часткова — Беларусь.

Остланд — літаральна перакладаецца як «Усходняя зямля». З 17 ліпеня 1941 года так стала называцца асобная частка акупіраванай фашыстамі тэрыторыі Латвійскай ССР, Літоўскай ССР, Эстонскай ССР. Сюды ўключылі Баранавіцкую вобласць, частку Мінскай, Вілейскай, Брэсцкай і Пінскай абласцей Беларускай ССР[9].

Згодна з мэтай гітлераўцаў — знішчыць народы нашай краіны як нацыі — дзяленне генеральных камісарыятаў планавалася так, каб не ўзнікала тэрыторый з адзіным нацыянальным складам. Гітлераўскі Остланд — гэта крывавы пэдзел і беларускіх зямель.

Рэзідэндыяй рэйхскамісарыята Остланда была Рыга.

У інструкцыі Розенберга, афіцыйнага ідэолага германскага фашызму, для рэйхскамісара Прыбалтыкі і Беларусі, падпісанай 8 мая 1641 года, гаварылася:

«Мэтай імперскага ўпаўнаважанага ў Эстоніі, Латвіі, Літве і Беларусі павінна быць стварэнне германскага пратэктарату, каб у выніку ператварыць гэтыя вобласці ў састаўную частку Вялікай Германскай імнерыі шляхам германізацыі падыходзячых у расавых адносінах элементаў, каланізацыі прадстаўнікамі германскай расы і знішчэння непажаданых элементаў»[10].

А «непажаданымі элементамі» былі для гітлераўцаў усе савецкія людзі. Мы толькі што прачыталі некаторыя ўспаміны асвейцаў пра тыя жудасныя дні. Яны і не ведалі, як гітлераўцы «прыгожа» называлі крывавыя аперацыі. Напрыклад, «Зімовыя чары» — умоўная назва карнай экспедыцыі, якая праводзілася нямецка-фашысцкімі акупантамі з 14 лютага па 20 сакавіка 1943 года. Сілы карнікаў: 10 батальёнаў ваеннай паліцыі, 3 матарызаваныя ўзводы жандараў, 3 узводы зенітнай артылерыі і авіягрупа спецпрызначэння, некалькі атрадаў паліцыі, часці 201-й ахоўнай і 391-й вучэбнай палявой дывізій.

Вось з якімі сіламі ворага прыйшлося сутыкнуцца асвейскім партызанам. Мы ўжо ведаем іх дакумент ад 17 лютага 1943 года. А цяпер пазнаёмімся і з дакументамі ворага тых жа дзён:

---

[9] Мы обвиняем. Документы и материалы о злодеяниях гитлеровских оккупантов и латышских буржуазных националистов а Латвийской Советской Социалистической Республике. 1941-1945. Рига, 1967, с. 14, 16.

[10] Мы обвиняем..., с. 11.

«З загада вышэйшага кіраўніцтва СС і паліцыі Остланда і паўночнай Расіі обер-групэыфюрэра СС, генерала паліцыі Экельна камандзірам карных атрадаў. 16 лютага 1943 г.

У рамках аперацыі «Зімовыя чары» камандуючы паліцыяй бяспекі і СД разам з разведкай павінен правесці чыстку вобласці ад усіх бандытаў і асоб, якія падазраюцца ў бандытызме, а таксама збор сельскагаспадарчых і іншых прадуктаў...

Загад спаліць вёску ці сядзібу можа аддаваць афіцэр, ад камандзіра роты і вышэй. Пры гэтым трэба абавязкова пільнавацца, каб з хат, якія спальваюцца, быў узяты ўвесь інвентар... Бандыты і асобы, якія падазраюцца ў бандытызме, у прынцыпе павінны быць расстраляны. Усе астатнія, паколькі яны працаздольныя, уключаючы дзяцей, *якіх можна выкарыстаць* (курсіў мой.— С. П.), сіламі вайсковых часцей і СД пры іх цесным узаемадзеянні павінны быць адпраўлены ў тыл».

У час карнай экспедыцыі, паводле падліку саміх гітлераўцаў, было забіта 3 904 і адпраўлена ў канцлагеры 7 275 чалавек, у тым ліку ў Саласпілс — больш 1 000 дзяцей[11].

Як гэта было, сведчаць наступныя дакументы карнікаў.

18 лютага 1943 года карнай групе пад умоўнай назваю «Бэрта» прыйшло распараджэнне: «Правядзенне неабходных экзекуцый павінна быць па магчымасці прадастаўлена СД, з тым, каб пасля расстрэлу не заставалася ніякіх слядоў. У выпадках, калі СД паблізу няма, а расстрэлы неабходна праводзіць пры дапамозе войска, экзекуцыі павінны праходзіць у дамах. Трупы трэба прыкрываць саломай або сенам і там спальваць»[12].

Так камандаванне групы «Бэрта» вучыла карнікаў «працаваць».

Хто ж кіраваў карнымі сіламі, хто больш за ўсё вінаваты ў абязлюджванні Асвейшчыны? Вось яны, чорныя служкі фашызму.

Вышэйшым кіраўніком СС і паліцыі Остланда быў обер-групэнфюрэр СС Экельн, арганізатар крывавага тэрору. Галоўнакамандуючым вермахта (нямецкімі ўзброенымі сіламі) у Остландзе быў генерал кавалерыі Брэмер, які актыўна ўдзельнічаў у акцыях тэрору на тэрыторыі акупіраваных прыбалтыйскіх савецкіх рэспублік і Беларускай ССР.

Генерал-лейтэнант Мантэнон — спецыяліст па «мёртвых зонах» — з кастрычніка 1942 года па жнівень 1944 года камандаваў 391-й дывізіяй. «Ваяваў» з безабароннымі жанчынамі, нямоглымі старымі,

---

[11] Мы обвиняем..., с. 148.

[12] Мы обвиняем..., с. 55-56.

дзецьмі-малалеткамі ў Беларусі і Латвіі; у студзені 1942 года, у студзені і лютым 1943 года — на Прыдзвінні.

Быў навучаны ствараць «зоны пустыні» і генерал-маёр Вертэр.

Генерал-маёр Кюпер у 1943 годзе асабіста арганізаваў і правёў карныя экспедыцыі «Венскі лес» і «Зімовыя чары». Генерал-маёр Павель (гэта ён загадаў спаліць Хатынь) у канцы 1942 года быў назначаны начальнікам лагераў савецкіх ваеннапалонных у так званым Остландзе, у тым ліку ў Мінску, Баранавічах, Маладзечна... Гэты самы Павель так гаварыў на судзе: «Я зрабіў тады памылку (у час карных экспедыцый.— С. П.) — не аддаў адпаведнага загаду, каго лічыць партызанам... Справа ў тым, што партызанамі лічыліся і тыя людзі, у каго ў хатах знаходзілі гільзу або лішні кажушок».

Вось так фашысцкі мярзотнік спрабаваў выкруціцца, калі адчуў, што надышоў час расплаты.

Цытую яшчэ адзін абзац з хронікі судовага працэсу:

«С т а р ш ы н я: Вы чыталі кнігу Гітлера «Майн Кампф»?

П а в е л ь: Не, не чытаў.

На пытанне, што ж ён увогуле чытаў, Павель адказвае:

— Апошнія дзесяць гадоў я нічога не чытаў»[13].

Цікава, колькі ж кніг прачытаў Гітлер? Гэта ён гаварыў: «Культура, цывілізацыя, гуманнасць і другія падобныя рэчы з'яўляюцца сумессю глупства, баязлівасці і фантазіі... Мы павінны быць бессардэчныя...»[14]

## Частка другая

З хаты ў хату, з вёскі ў вёску іду я, Броня, па тваёй Асвейшчыне. Вось яшчэ адна клямка глуха празвінела за спіной. Ведаю, яшчэ доўга будзе супакойвацца, выціраць умакрэлыя вочы цётка. Колькі разоў прыходзіцца трывожыць скалечаную вайной памяць людзей, хваляваць чалавечыя сэрцы. Ніводная жанчына, ніводны мужчына, у каго пытаўся пра лёс іх, не маглі заставацца бясстраснымі, абыякавымі, калі ўспаміналася вайна. Бо не была яна для іх падзеяй даўняй, а была бядой учарашняй, болем сённяшнім, памяццю вечнай.

Вёска Карценева. За сталом гаспадары — **Станіслава Францаўна** і **Станіслаў Адамавіч Бернатовічы**:

— Ранкам 20 лютага 1943 года нас у Сушкі пагналі. Стайня ўжо набіта людзьмі, дык нас — у хлеў.

---

13 Судебный процесс..., с. 101.
14 Судебный процесс..., с. 116.

Сцямнела. Месяц свеціць. Нас на падводы. Вязуць. Першы дом — спалены. Едзем далей. І ад другога — адны апалкі. Пагыркалі і далей пагналі. Не хапіла на нас агню. Не было ў чым спаліць...

У Саласпілсе ён аказаўся з жонкай і дзецьмі Галяй і Аркадзем, маткаю Мальвінай, цёткаю Юляй, якая ў канцлагеры аслепла.

— Не знаю, і чаго мы не ўміралі? Праз два тыдні вочы белыя ад голаду былі...

Потым ад матак адабралі дзяцей. Аднойчы Станіслава Францаўна не вытрымала: «Пусціце! Хай дзеці на матку паглядзяць... Каб хоць фамілію помнілі!» Але яе не пусцілі, дык яна праз фортачку ў барак пралезла, бо худая была...

З Саласпілса Бернатовічаў разам з дзецьмі акупанты адправілі працаваць на хутар. Але пры набліжэнні Чырвонай Арміі ўсіх вязняў зноў сабралі ў лагер і адправілі ў Нямеччыну.

Толькі Перамога ўратавала іх ад рабства, ад безназоўнасці, адкрыла ім шлях вяртання на Радзіму.

Усё яшчэ кружу каля Бігосава. У пасёлку сустракаю людзей з былых спаленых вёсак, многія з якіх так і не адноўлены. З 15 двароў вёскі Фоміна Сар'янскага сельсавета засталіся чатыры сям'і. У той жудасны ранак 16 лютага 1943 года **Пірог ВалянцінаГаўрылаўна** была ў хаце з трохгадовым Пецем і чатырохгадовай дачкой Броняй. Муж — у партызанах. Іх хата стаяла на канцы вёскі. Валянціна Гаўрылаўна многае што паспела ўбачыць:

— Гляджу, Івана Дубаноса б'юць. Спужалася я — і пад сваю хату. Адзін карнік прыляцеў, паглядзеў на хату, на дзяцей. Крычыць і вінтоўкай водзіць. Загадвае выбірацца.

Прама без памяці, іду ў адным плацці. Гляджу — і вёску Стунжава запалілі. Стаю пасярод агнёў. І не страшна стала смерці.

Пачалі сарціраваць людзей. Адных — налева, другіх — направа. Мяне — направа. Каго налева — спалілі. Суседка Маня Мацкевіч добра выглядала — налева. Спалілі. А ў Стунжаве ўсіх выбілі. Толькі адна баба засталася: воўну хадзіла часаць у суседнюю вёску...

А Валянціну Гаўрылаўну спачатку адправілі ў Саласпілс, адтуль — у Люблін:

— Гоняць, б'юць чалавека, сабака нас рве — нічога ўжо не страшна. Во дзе пекла! Як цяпер бачу: каля дарогі замучаныя людзі штабялямі зложаны, на вышышо хаты пакойнікі ляжаць...

Не прычакала мужа з вайны. А як знайшла дзетак? Выпадкова. Сусед Лявон разам з яе мужам ваяваў. Застаўся жывы і пачаў шукаць сваіх родных, бо сям'ю таксама вывезлі ў Саласпілс. І вось знайшоў

дачку ў Латвіі. А Пеця, сын Валянціны Гаўрылаўны, на суседнім хутары кароў пасвіў. Заадно дзядзька Лявон прывёз і Петрака.

Не раз бачыў жанчын, у якіх дзеці маюць якраз столькі гадоў, колькі было іх мамам у вогненнай вёсцы, у Саласпілсе... І вырастае ў грудзях трывога: каб жа новае пакаленне не спазнала лесу бацькоў!.. Вось што расказала **Замбар Ніна Рыгораўна**... Родам з вёскі Зулава, а гутарыў я з ёй у Сар'і:

— Дождж ліў, руччы цяклі — а нас забіралі. Муж на фронце, а ў мяне трое дзяцей, да школы. Вядуць, а я вучу старэйшую, пяці гадоў: «За хвосцік, дзетка, дзяржыся, за спадніцу». Адзін сын — на руках, другога вяду побач. З Зулава — у Сар'ю прывялі, з Сар'і — у Росіцу, у касцёл. Я ўжо з астатняй сілы папрасіла людзей: «Мужчынкі, расхініцеся. Дайце жанчыне прайсці!» Я са сваімі дзецьмі на апошнюю падводу трапіла. Астатніх усіх спалілі...

Як жа абышоўся лёс з гэтай сям'ёй? З Бігосава Ніна Рыгораўна трапіла ў Саласпілс, адтуль у Люблін. Там, яна расказвае, кара за спробу да ўцёкаў такая: «Кручок пад сківіцу і табурэцік з-пад ног».

Яе дачку з Саласпілса адправілі ў Лібаву, у фашысцкі прытулак, а сына аддалі на хутар. На той час яго латышы ратавалі ад смерці, але фашысцкі здзек у канцлагеры зрабіў сваё: ад знясілення Вацік памёр пасля вайны. А меншы, Інька, адбіўся ад маці яшчэ па дарозе ў Сар'ю. Захацелася яму ўцячы ў партызаны. І сапраўды, некалькі хлопцаў прабілася ў партызанскі лагер. Пазней Іньку самалётам адправілі на Вялікую зямлю. І муж Ніны Рыгораўны, калі вярнуўся з фронту, знайшоў яго аж у Ніжнім Тагіле.

Мужчыны крапчэйшыя пры ўспамінах. Хоць і горка, але пасміхаецца над сваімі нягодамі **Мархель Савелій Ігнатавіч**, рабочы завода «Зоаветінструмент»:

— Жылі мы на граніцы з партызанскай зонай. Былі як бы нейтральныя. Днём акупанты заходзілі, ноччу — свае. А 19 лютага 1943 года наляцелі самалёты, агонь кідаюць. Бачым: з-пад лесу шарэнга прэ. Усё ўжо кругом гарыць...

Брат раніцай у Росіцу пайшоў. Перанялі. І ўжо карнікі многа людзей перад сабой гоняць. Усякія толкі між намі пачаліся — а ці будуць расстрэльваць? Страшнавата стала. Залез у пуню і сяджу.

Чую: свіней б'юць. Прайшлі факельшчыкі. У пуні мары стаялі: павозка такая — снапы вазіць, у другім баку пуні — сена. Гляджу, як адзін распальвае страху : з кішэні бутэльку выняў, папырскаў з яе і запаліў. Я з пуні і за вёску. Каля саду — карнікі. А тут Няміра Віцька да мяне далучыўся. Мы ў дыме і праскочылі за агароды. Я каля балота застаўся, а Віцька далей пабег. Ляжу ў лёд умерзшы. Як праз сон чую

— снег рыпіць. У мяне была шапка-будзёнаўка. Скасіўся — гляджу, што кругом мяне паўмесяцам у маскіровачных халатах пасталі.

Паднялі. Загадалі ісці наперад. Топаю перад імі ў лапцях.

Побач з нашым домам Сыльва Іжык жыў. Сям'ю Сыльвы стралялі ў яго ж хаце. Жонку, двух дачок, сына на месцы забілі, а Сыльва як выскачыў з хаты, дык адразу ж у гурбу снегу з размаху зашыўся. Мо й застаўся б там, каб не певень. Певень на плот — карнік за ім. Не ўтрымаўся і зваліўся ў гурбу, якраз на Сыльву. Той крыкнуў і кінуўся ратавацца.

І вось нас ужо двух гоняць. Даходзім да Баркова. Дарога завеяна, дык нас наперад адпраўляюць — дарогу таптаць. Сыльва шэпча мне: «Нас расстраляюць». А рэкі кругом падняліся, канавы набухлі. Я лапцямі па вадзе шлэпаю.

Ідзём далей. У Ціршаве стральба, лопаюцца гранаты. І Ціршава, і дарога наша гараць. А вуліца вузкая, полымя сцелецца. Чуць між агнёў прайшлі.

Ціршава паліў другі атрад. «Наш» ішоў, сваю крывавую работу справіўшы.

За Ціршавам убачылі каля рэчкі збеглага каня. Тры разы карнік страляў па ім і не пападаў. Пасля чацвёртага стрэлу конь падняўся на дыбкі і асеў на задніцу. Карнікі зарагаталі: ім дужа смешна было.

Перад намі прайшла калона з Ліпавак. Карнікі ў санях везлі шкафы, пасцелі, падушкі...

У Росіцы нас з Сыльвам зачынілі ў лазні і, можа, забыліся б пра нас, калі б зноў не кур'ёз.

Доўга сядзелі ў лазні. Сыльва, а яму было 50 гадоў, расказаў мне, як забілі сына Пецьку, майго аднагодка, дачок Вольку і Ніну, жонку Анэлю: п'яныя немцы ўваліліся ў хату і адзін з іх стаў страляць з пісталета.

Раптам праз акенца бачым: карнікі ідуць і два кулі саломы нясуць да лазні. «Усё, — кажа Сыльва,— зараз запаляць». Не вытрымаў дзядзька, адчыніў прылазнік і ўзмаліўся: «Паночкі, што мы зрабілі благога?» Карнікі, аказваецца, парасёнка забілі і на санках везлі пад лазню смаліць. Нічога ім не заставалася, як забраць нас і ў касцёл адвесці. Матка мая ўжо там сядзела разам з людзьмі.

Трое сутак у касцёле прабылі. Калі ехалі ў Саласпілс, то ніхто не даваў есці. Чыгуначнік лапату снегу кіне праз акенца — і ўсё на гэтым...

А на станцыі нас другія «гаспадары» перанялі: круглыя, мардатыя, з аўчаркамі.

Мы ўкатвалі дарогу нейкай вялікай цэментнай трубой, баракі строілі. Працавалі па 12 гадзін у дзень...

А зараз раскажу, як у Саласпілсе мы каранцін праходзілі.

Паступіла каманда:

— Раздзявацца! Дагала!

Бабы з плачам бегаюць, не хочуць распранацца. Тады адзін стражнік падышоў да жанчыны, уміг сарваў з яе ўсё адзенне. А на вуліцы снег, мароз, і трэба ў такую пагоду праз лагер голымі ў лазню бегчы. Ахоўнікі паабапал выстраіліся: у белых халатах, з аўчаркамі. Фатаграфуюць нас і на вуліцы, і ў лазні.

Наперадзе мяне бабулька ў чарзе за вадой стаіць, потым я, за мной маладзейшая жанчына...

Вот што добра запомніў — як фашысты смяюцца. Здаецца, і зараз чую, як гагочуць: і калі мяне злавілі, і калі каня застрэлілі, і калі з нас, голых, у лазні рагаталі. Розныя былі ваякі, а іх рогат аднолькавы быў.

Пасля лазні далі прастрэленыя яўрэйскія халаты. На некаторых яшчэ заставаліся жоўтыя зоркі і надпісы. Тры дні прасядзелі ў адным бараку, потым перагналі ў другі. Гэты барак быў разгароджаны дошкай. На адной палавіне мужчыны, на другой — жанчыны, усе абстрыжаныя.

Перажыў і разбіўку, калі сем'і разлучалі. Сястру Веру адправілі ў Рэзэкнэ. Сам пісаў ёй на папяровай бірцы імя. На тонкай вяровачцы матлялася гэта бірка на сестрынай шыі.

Потым знайшоў у бараку Ц9 свайго брата Дамініка, каторага яшчэ ў Росіцы злавілі, пасля далучыўся да нас Чэська Рубан, мамін хрэснік. Я сказаў, што ён — мой брат. Утрох і трапілі ў адну воласць, дзе работалі на хутарах. Гэта нас і ратавала ад галоднай смерці.

А ў Саласпілсе з намі не цацкаліся: як пастух скот бізуном гоніць, так яны нас дубінамі ганялі...

Што ж можна дабавіць да гэтага невясёлага апавядання Мархеля Савелія Ігнатавіча? Сыльва Іжык загінуў у Майданаку, Віцька Няміра ўцёк да партызан, і яны пераправілі яго ў Таржок, у дзіцячы дом. Зараз ён жыве каля Рыгі. Яго маці, Алена Адамаўна, прайшла Майданак, Асвенцім, Равенсбрук і вярнулася ў Бігосава. Сястру Веру знайшоў у Латвіі яе дваюрадны брат. Асела яна ў Даўгаўпілсе. Дамінік жыве ў Бігосаве. А пра сябе Савелій Мархель сказаў так: апошнім выйшаў з вёскі і першым вярнуўся... на папялішча.

З 1957 года ён член КПСС. Пяцёра дзяцей выгадаваў. Добры працаўнік, аптыміст... Яго вачамі мы глянулі на яшчэ адну дарогу праз полымя вайны. Падобная ці не падобная яна да Бронінай? Падобная ў

адным: вораг ваяваў з дзецьмі, і калі пакідаў іх жывымі, то толькі з адной карысцю — як свайго будучага раба.

Савелій Мархель бачыў атрад карнікаў, які закончыў сваю «работу» ў лясной вёсцы Ліпаўкі. Давайце мы зноў вернемся да тых падзей, бо знайшоўся яшчэ адзін чалавек, які ў лютым 1943 года там — зноў жа выпадкова! — застаўся жывы. Гэта **Пілюшына Валянціна Васільеўна**.

— У Ліпаўках да вайны было 96 двароў. У 42-х дварах жыла мая радня. Адна засталася з усяго роду. Хто вайной не памагаў партызанам? Усе памагалі. І бацька мой памагаў. Жылі мы тады ў Калютах, каля партызанскага лагера.

Аднаго разу прыйшлі з Латвіі, з разведкі, партызаны. Пытаюцца:

— Знаеце, што абстаноўка цяжкая? Добра, калі адаб'ём немца на латышскую тэрыторыю... А мо і не ўдзержымся.

Праз 10 дзён і пайшла тая экспедыцыя.

З 15 на 16 лютага сабакі брахалі ўсю ноч. У 6 гадзін раніцы чуем выстрал. Карнікі падняліся і пайшлі на вёску.

Хто быў быстрэйшы і смялейшы з вяскоўцаў — уцякалі. Па іх карнікі стралялі на хаду. А як акружылі вёску, з усіх жыхароў выбралі 25 чалавек, дзяўчат і маладзейшых кабет. У той гурт трапіла і я.

А карнікі ўсё ператрасалі ў хатах, людзей пераганялі з аднаго канца ў другі — з гранатамі і аўтаматамі напагатове. Рэчы перакідваюць, а самі аж дрыжаць: а раптам партызаны паявяцца.

Мучылі нас доўга, на калені ставілі і богу маліцца прыказвалі.

Як выбралі 25 чалавек — астатніх у пуню загналі. Насіліся са шпрыцамі такімі: кожны літраў 5 бензіну ўбіраў. Пуня, ток — адной будынінай стаялі. 178 чалавек туды ўмясцілася...

Мы сядзелі ў хаце наўпроціў будыніны, якую запалілі. Гляджу: тату з братам каля акон у агонь пагналі. Карнік сеў за стол і кажа: «Вашых пагналі ў красны лагер!»

Адна жанчына прызналася, што цяжарная. Думала, што, можа, яе і выпусцяць. Тады карнік падышоў да яе, пашчупаў: ці праўду сказала. Яе адразу ж вывелі з хаты і разам з маім бацькам і братам на вуголле кінулі: пастройка ўжо дагарала.

Маладзейшых пакідалі, астатніх гналі паліць. Ад жанчын адбіралі дзяцей, перадавалі іх бабулькам, каб з імі разам адправіць у агонь. Асірацелыя маткі ад гора валасы на галаве вырывалі. Потым у такой пакутніцы пена з рота пойдзе, і яна памірае.

У Саласпілсе мяне пратрымалі толькі месяц: з 20 лютага па 20 сакавіка. Тады ў лагеры адны асвейцы і былі. Там таксама выбралі маладзейшых і сказалі, што мы будзем працаваць афіцыянткамі.

Тады Гарбуль з Навікоў кажа: «Чорта ім! Можа, у бардак павязуць...» І мы чацвёра сутак хаваліся па прыбіральнях, глыточка вады не выпіўшы...

Доўга расказвала Валянціна Васільеўна пра сваё жыццё, пра тых, каго спатыкала на сваіх пякучых дарогах. Расказвала пра тое, як у Любліне праз кожныя чатыры гадзіны выгружалі трупы з газавых камер, як стражнікі стаялі каля задушаных і абцугамі вырывалі са сківіц залатыя зубы. А разыходзіліся — во такія карманы набраўшы золата...

...як у іх бараку ў Маўданаку за старшага быў масквіч па імені ці па мянушцы — Яра. Ён многіх выручыў ад немінучай гібелі. За тое, што Яра не далажыў пра ўцекачоў, яго білі 20 дзён запар. «Палажаць на бочку і сякуць, а ён і стагнаць ужо не мог: толькі вачамі варочае...» Апошнія дні яго насілі на экзекуцыю на насілках.

...як яна была вязнем Равенсбрука, як у Лейпцыгу толькі выпадкова турма засталася неразбомбленай, дзе трымалі Валянціну Васільеўну.

...як яна чатыры разы ўцякала з арыштанцкіх калон...

Мая дарагая Броня, і ў Пілюшынай я пытаўся пра асірацелых матак. У Броні Станіслаўны і Сямёна Пятровіча Бажэнаў у Саласпілсе аднялі дзвюх дачок, Анфісу і Валю. Ды ў Рызе не далі ім загінуць латышкі. Уратавалі.

У Саласпілсе спалілі трох дзяцей Гажэўскай Ляксашы: Ядзю, Стасю і Валодзю. Засталася толькі старэйшая дачка, Лёнця.

У Амяльчонак Гелены спалілі сына і ў Барэйкі Мар'юты — сына.

У самой Валянціны Васільеўны з шасці чалавек сям'і — толькі яна адна выжыла. З 42 двароў, дзе была яе радня,— толькі яна адна засталася.

Мая дарагая Броня! Бачыш, і сведкі ёсць, столькі імён згадваюць. А дзе шукаць тваю маму?

У Каханавічах я гутарыў з **Бадынскай Ганнай Карпаўнай**. Ёсць дзеці-сіроты, але ж ёсць і маці-сіроты:

— У Саласпілсе нашы мужыкі шапкамі гразь насілі. Катавалі нас страшна. Многа тады дзяцей атруцілі.

А я яшчэ два гады ў Любліне прабыла. Шалушачкі елі. Раніцай — вада цёплая. Вечарам — добра, калі бульбіны ў мундзірах пападуцца. 150 грамаў хлеба на суткі. А вызвалілі нас аж за Эльбай, 19 красавіка 1945 года.

У Саласпілсе была і мая родная сястра. Яе дачушку латышка ратавала ад смерці. А ў мяне ж адабралі сынка. Бадынскі Уладзімір Ста-

ніслававіч, 41 года, 13 верасня нарадзіўшыся... Мо дзе акажацца? Якую раду іскала — анічога. Можа, вы дзе спросіце?

Пытаўся і пытаюся зноў пра нявернутага сына. Таму перад намі, Броня, яшчэ многа дарог, сустрэч, пісем. Але найперш мне хочацца, Броня, пагаварыць з табою вось пра што. Калі я сам крыху падрос, мая мама расказала пра тое, як прытуляла мяне, калі штоноч бачыла ў небе Задзвіння, між Бігосавам і Дрысай, гарачыя чырвоныя сполахі. Там акупанты рабілі пустыню. І вось праз многа гадоў пасля гэтага я сам ступіў на зямлю, якая калісьці была ператворана ў пустыню.

У нас ужо існуе, Броня, вялізны па сваёй сіле дакумент — кніга «Я з вогненнай вёскі...». Пісьменнікі Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік паказалі боль людзей, «што выйшлі з агню, з-пад зямлі». У кнізе яны сведчаць, як перажывалі хатынскую трагедыю на працягу сутак, дня, на працягу пакутных жудасных імгненняў, калі карнікі «забівалі вёску». Таму, калі гутарыў у партызанскім краі з яго ўцалелымі насельнікамі, я стараўся як мага больш даведацца: а што было пасля вогненных вёсак.

Пацвердзілася мярзотная і агідная тактыка фашыстаў-звышнелюдзяў, якія ў здзеках над сваімі ахвярамі часта не давалі ім нават такой «міласці», як магчымасць памерці. На гэтым заканчваўся такі гітлераўскі эксперымент, як «вогненная вёска», і пачынаўся эксперымент новы — «смерць у растэрміноўку».

# СМЕРЦЬ У РАСТЭРМІНОЎКУ

Нялёгка несці боль гаротны.
парушыць болю берагі,
калі дрыготкія кругі
страсаюць сэрца.
Дух народны
нязгодай з ворагам — нязводны.
І дружалюбствам — дарагі.

## Частка першая

«Вогненная вёска». Вогненная. «Я не з гэтай, але таксама з вогненнай...» — пачулі пісьменнікі Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік у Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці. Гэтыя два словы сталі ў Беларусі азначэннем усенароднай трагедыі, азначэннем жорсткага генацыду. 5 295 вогненных вёсак у Беларусі. І з іх 628 Хатыняў, дзе ўратаваліся толькі адзінкі[15]. Абязлюджана была і Асвейшчына. Вось факты: 258 вёсак і былы райцэнтр Асвея былі знішчаны поўнасцю. У былым Асвейскім раёне каля 60 вёсак увогуле перасталі існаваць, бо не было каму адрадзіць іх[16]. Яшчэ б: вёску Канчаны, напрыклад, тут палілі акупанты ажно тры разы! Каб было надзейна, каб выпаленая зямля ніколі не ажыла. Аляксей Талстой у 1943 годзе выступіў у газеце «Правда» з публіцыстычным артыкулам «Асвейская трагедыя», які быў адразу ж перакладзены і выдадзены як лістоўка:

«Лютуюць нямецка-фашысцкія каты. Патокі нявіннай крыві льюцца там, дзе ступае нага фашысцкага звера. Ап'янёныя крывёю, гітлераўскія нягоднікі не спыняюцца ні перад чым. Нож і атрута, агонь і сякера, шыбеніца і аўтамат — усё пускаюць у ход нямецкія людаеды, каб толькі знявечваць, катаваць, зніпічаць савецкіх людзей. Кроў стыне ў жылах ад страшэнных злачынстваў фашысцкай зграі. Здаецца, няма канца садызму, лютасці акупантаў...

Жудасная, крывавая трагедыя разыгралася нядаўна ў Асвейскім раёне Віцебскай вобласці.

У страшэнную пустыню ператварыўся гэты прыгожы куток зямлі беларускай. У ім нельга пазнаць ранейшы цудоўны азёрны край, шчодры і багаты. Усё, што доўгія гады стваралі тут асвейскія калгаснікі, загінула пад цяжкім ботам нямецкіх катаў-акупантаў.

---

[15] Нацистская политика геноцида и «выжженной» земли в Белоруссии. 1941-1944. Мн., 1984, с. 45.
[16] Захараў І. Нязгасная памяць.— Звязда, 1980, 3 ліп.

Гэта было ў сакавіку...»

Пра тое, што было ў сакавіку 1943 года ў адной з вёсак Асвейшчыны, мне расказала **Феадосія Іванаўна Аржанік**.

— Мы дапамагалі латышскім партызанам. Я сама вазіла ў Мілавіды хлеб...

А каб хлеб той быў, мы зямлю аралі, жыта сеялі. Праўда, і партызаны памагалі зямлю ўрабляць.

Яны часцей за ўсё прыходзілі ноччу. Есці дасі і жджэш дня — што будзе? Дужа каралі акупанты за любую спагаду і дапамогу партызанам. Аднойчы роднага дзядзі сын — Лукашонак Серафім Пятровіч — прыйшоў з партызанскага лагера на дапамогу майму старэнькаму бацьку. Два ці тры дні парабіў ён. Фашысты прыкмецілі яго на полі. Акружылі і пачалі здзекавацца. «Бяжы ў лес!» — загадвалі, каб страляць па ім, як па партызану-ўцекачу. Ён не пабег у лес. Яго на полі і замучылі: то наперад на вярсту ганялі, то — назад...

Слухаю Феадосію Іванаўну і ўяўляю тое сялянскае поле, якое павінна было карміць нескароных людзей. За гэту нескаронасць вораг помсціў і людзям і зямлі. Фашысты прымусілі чалавека самому вытаптаць тое поле, якое ён урабляў. Зямля прымала тупат здранцвелых ног... Ёй хацелі зрабіць балюча — каб сам земляроб глуміў яе. Са свайго дзяцінства ведаю, што лічылася ледзь не грэхам проста так ступіць на засеяную зямлю. Бо зямля — святая, калі ў яе лоне стаіліся парасткі, калі яна адухоўлена будучым ураджаем.

Які пакутны вобраз паўстае перада мною. Земляроб палівае родную зямлю і потам і сваей крывёю.

Не гневайся, поле, што праз здзекі над чалавекам так глумілі і цябе. Ты церпіш датуль, пакуль не паглынеш тое зло, якому не павінна быць месца на зямлі. Вышэй твайго чала бьщь толькі расткам і парасткам вольнага жыцця.

Лукашонак цаной свайго жыцця ўратаваў вёску. Яе спалілі пазней, з тымі людзьмі, якія не паспелі ўцячы пад ахову партызан.

Гэта было ў сакавіку...

Феадосія Аржанік дапаўняе: «Самалёты аж сцелюцца над лесам: людзей ішчуць. Наўкруг вёскі гараць. І наша Красова спалілі. І тых людзей, хто не ўцёк у лес,— спалілі. Маю свякроўку — Марыю Аржанік — і дзядзьку Пятра Іванавіча Лукашонка — жыўцом...»

...Тры тыдні хаваліся ў лесе ад карнікаў Марта Аляксандраўна — яе мама — і сама Феадосія з дочкаіі Нінай і Лізай. Муж яе, Аржанік Парфен Іванавіч, загінуў яшчэ на фінскай вайне.

А вясной, калі адчулі людзі, што час зямлю араць, ажыло Красова. 105 уцалелых вярнуліся з блуканняў. «Нада было сеяць!» — апраўдва-

ецца Феадосія Іванаўна. І ўзаралі красоўцы зямлю, і яшчэ раз паспелі засеяцца. А 3 чэрвеня 1943 года, калі партызаны пайшлі на заданне, карнікі дапалілі тое, што не змаглі ў першы раз. 105 чалавек: жанчыны, малалеткі, немаўляты — апынуліся ў палоне. Далейшая іх дарога ішла праз Саласпілс...

Красавала жыта ў Красове, налівалася, спаласаванае віхурамі вайны, здратаванае ботамі карнікаў. І выспелі каласы дзядзькі Серафіма, зярняты свякроўкі Марыі і дзядзькі Пятра. І зноў стала зерне партызанскай зброяй...

— Гэта было ў сакавіку 1943 года. Заве мяне сын: «Глядзі, ляціць прыгожы самалёт!» І раптам самалёт застрачыў па чалавеку, які ішоў па вуліцы. Той упаў. Загарэліся хаты. Я хуценька запрог кабылку, прывязаў карову, адпусціў сабаку з ланцуга — шкода ж пакідаць, каб мучыўся,— і ў лес...

Так пачаў сваю гаворку **Бараноўскі Аляксей Данатавіч**. Ён бачыў, як самалёт нізка лятаў над лесам, як варочаўся ў кабіне лётчык, выглядаючы ахвяры. Не дабраліся ў той дзень карнікі да Бараноўскага. Але ў вёсцы Засценкі паставілі яны на калені 200 чалавек і з кулямётаў расстралялі.

Бачыў ён, як у Саласпілсе...

Але пра Саласпілс, які́м бачыў яго Бараноўскі, мы раскажам пазней. Як у кожнага твайго земляка, Броня, была свая Асвейская трагедыя, так у кожнага асвейца быў свой Саласпілс, свой Майданак, Штутгоф, Равенсбрук... І я шукаю, дзе між тысяч дарог ляжыць шлях тваіх родных.

Пакінула свае родныя Ярохі і сям'я **Сямёна Сцяпанавіча Валадзёнка**. «Нашы партызаны,— піша ён з Рыгі,— не змаглі стрымаць узброеных да зубоў карнікаў, а іх было розная масці... Праз некаторы час яны і спалілі Ярохі. А мы ў гэты час хаваліся ў лесе. Па начах яшчэ былі даволі моцныя маразы. Мы зрабілі ў лесе зямлянку, дзе і сабралася разам 12 чалавек. 12 ці 13 сакавіка 1943 года, раніцай, нас акружылі. Думаў, што пастраляюць адразу ж на месцы. Ажно не. У Мілавідах пачалі сарціраваць: старых і мацярок з дзецьмі — у адзін бок, а падлеткаў і людзей маладзейшага веку — у другі. Першую калону загналі ў хлеў і спалілі. Як мы крычалі, як плакалі! Гэта быў кашмар... Падумайце: адрываюць ад нас маму і разам з яе дзвюма сёстрамі і іх маленькімі дзецьмі — паляць... Я застаўся толькі з роднай сястрычкай Аняй. Пасля таго агню мы былі як не свае: і глядзець не хацелася на свет белы...»

А зараз прывяду яшчэ адну цытату: «Калі мы хочам стварыць нашу вялікую Германскую імперыю, мы павінны перш за ўсё выцес-

ніць і знішчыць славянскія народы — рускіх, палякаў, чэхаў, славакаў, балгар, украінцаў, беларусаў». Так нацкоўваў на нас сваю армію гнюсны Гітлер.

...Валадзёнак спазнаў, як выконвалі загад фюрэра яго служкі. Але ж гэта людаедская доблесць — ваяваць з дзецьмі і мацяркамі. І ўсё ж жудасны тэрор не запалохаў асвейцаў. Вось некалькі радкоў з райкомаўскага дакумента — з тэксту характарыстыкі Ніны Міхайлаўны Літвінавай: «Да вайны працавала ў Асвейскім маслапраме касірам. У жніўні 1941 г. Літвінаву далучае да падпольнай дзейнасці яе муж. Яна выконвала заданні: дастаўляла зводкі Саўінфармбюро ад Слічнага Мікалая з вёскі Вышнарава ў Асвею і другія населеныя пункты, ратавала ад смерці яўрэйскае насельніцтва, назапашвала прадукты для партызанскага атрада, забяспечвала партызанскіх сувязных канспіратыўнай кватэрай...»

А гэта — пра яе мужа... «З баявой характарыстыкі Антона Ігнатавіча Літвінава, 1911 г. нараджэння, 5 класаў адукацыі, член ВКП(б): «У жніўні 1941 года быў адным з арганізатараў Асвейскай падпольнай групы. Устанавіў сувязь з многімі камуністамі і заахвоціў іх да актыўнай падпольнай работы. Сярод насельніцтва пасёлка распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, быў удзельнікам першай нарады камуністаў-падпольшчыкаў. У снежні 1941 г. выбраны членам бюро падпольнага кіраўніцтва і вёў вялікую работу па стварэнню і актывізацыі падпольных груп у сельсаветах, па збору зброі і боепрыпасаў, рыхтаваў людзей у рады народных мсціўцаў.

У маі 1942 г. Літвінаў стаў партызанам. У ліпені 1942 г. назначаны камісарам партызанскага атрада імя Пархоменкі.

Загінуў смерцю храбрых у верасні 1943 г.».

Вось такія людзі вялі свяшчэнную барацьбу з праклятым ворагам, з такіх ачагоў супраціўлення і складалася тады сіла ўсенароднага змагання з ворагам. У звароце народнага паэта Беларусі Янкі Купалы да ўсяго беларускага народа ад 7 лістапада 1941 года пра гэта і гаварылася: «...У нашай свяшчэннай барацьбе з праклятым ворагам — нямецкім фашызмам ваюе кожны дом, кожнае дрэва, кожны пагорак. Камяні ўстаюць, каб забіць ворага, рэкі выходзяць з берагоў, каб утапіць яго, зямля расступаецца, каб праглынуць яго... У гэтыя грозныя дні, калі п'яныя дзікары па ўказцы свайго вар'ята-атамана па-зверску знішчаюць усё тое, што намі пабудавана, забіваюць старых, дзяцей, жанчын, я ўсю сваю сілу, мужнасць аддаю вам, сыны нашага вялікага народа. Родныя мае, яснавокія волаты!.. Абараняйце сваю зямлю, змагайцеся так, як змагаліся нашы продкі, не давайце літасці ворагу!»

А вораг ваяваў... з дзецьмі, з будучыняй народа. Ён хацеў забраць і зямлю нашу, і нашы душы, забраць усё. Бо зямля і чалавек непадзельныя.

Таму калі я хаджу па Асвейшчыне і размаўляю з людзьмі, я ўяўляю, што і ты, Браніслава, ходзіш побач і разам са мною – слухаеш сваіх землякоў. І ўжо тваімі вачамі, тваім сэрцам углядаюся ў далягляды, у нязведаную прастору, у таямніцу чалавечых жыццяў. Вось чаму пры кожнай нагодзе і заклікаю цябе на дапамогу, на суперажыванне. Бо твой лёс стаў лёсам гэтага краю. І наадварот, лёс гэтай зямлі, яго насельнікаў стаў і тваім лесам. І ўжо ты — сведка, як лясы і людзі станавіліся бранёй і славай Айчыны, як усенароднае супраціўленне варожай навале мацавала неўміручасць і незнішчальнасць Радзімы. Слухай жа далей, Браніслава, бо ў кожным новым знаёмстве з асвейцамі можа таіцца згадка і пра твае карані...

...У **Жынгель Марыі Вікенцьеўны** было да вайны сямёра дзяцей: Пётра — з 1922 года нараджэння, Люся — з 24-га, Ніна — з 28-га, Ліда — з 30-га, Марыя — з 32-га, Віктар — з 34-га, Ваня — з 38-га. Я гутару з Нінай, **Нінай Паўлаўнай Высоцкай**. Яе шлях з расіцкага касцёла пралёг у Саласпілс, адтуль— у Люблін, Равенсбрук.

У Майданаку цэлы год пражыла недалёка ад бацькі: Павел Пятровіч быў у суседнім бараку, але бачылася з ім толькі адзін раз. За нейкую правіннасць (можа, за тое, што хацеў пабачыць дачку) яго засеклі плёткамі, папярэдне прывязаўшы да каша — каб ямчэй было катаваць.

У Равенсбруку, калі яе разлучылі з маці, дзяўчыну ратавалі чэшкі. Яны хавалі Ніну на трэцім паверсе нараў, кармілі са свайго пайка. Ляжала пад матрацам і не дыхала, каб аўчарка не ўчула, калі па бараку праходзілі наглядчыкі.

— Аднаго разу я была ў крэматорыі,— успамінае Ніна Паўлаўна.— Нехта спыніў транспарцёр, які рухаўся ў душагубку. Адна мінута мне да смерці аставалася...

Той равенсбруцкі жах і зараз студзіць жылы гэтай пакутнай жанчыне.

Хай прабачаць нам чытачы, што мы расказваем пра столькі сустрэч, што людзі гавораць часам і не вельмі складна. Тут амаль без змяненняў пададзена іх жывая гаворка, іх гутарковая мова. Многія ўжо страцілі некаторыя асаблівасці беларускага вымаўлення, бо самыя пераломныя гады іх прайшлі далека ад Асвейшчыны.

Але ж наша галоўная задача: пошук. Мы з табою, Броня,— сведкі страшнай, варварскай дзейнасці: вораг ссякаў галіны, парасткі на дрэве чалавецтва. А гэтыя парасткі — дзеці.

...У хаце Скрыпкі Аляксандра Сцяпанавіча была яго жонка Марыя Пятроўна і дачка Ніна, якая прыехала з Рыгі наведаць старых бацькоў. Я і перадаю тую бяседу:

— У Росіцы па вайне і гнілой бані не асталося. Пустыр стаяў...

Тры дні ўсіх палілі. Жывым відам — усіх, здаровых і інвалідаў. Міцкевіч Пётра забраўся ў касцёле на верхатуру і схаваўся там. Бачыў, як апошніх сто чалавек у аборы палілі: яна стаяла за рэчкай Росіцай.

Пётра бачыў, як з аборы вырвалася жанчына і, раскінуўшы рукі, бегла з агню. А яе паднялі на штыкі і зноў у абору кінулі...

У сям'і Скрыпкаў да вайны было пяцёра дзяцей. Старэйшы, Міша, у 16 гадоў памагаў партызанам. Валя «пагібла пасля вайны: галава была спорчаная». Сяргей і Мікалай — яны мужчыны — трымаюцца, а вось Ніна з вайны не мае здароўя.

Два месяцы прамучылася сям'я Скрыпкаў у саласпілскім канцлагеры. Мужчын прымушалі ў насілках зямлю пераносіць з аднаго месца на другое. Жанчыны «з карнём на балацявінах верас ірвалі».

Памаўчаўшы, **Аляксандр Сцяпанавіч Скрыпка** гаворыць:

— Аднойчы ўсіх хворых загналі ў два баракі. Назаўтра на бараках віселі аб'явы, каб забралі іх рэчы, бо самі хворыя як быццам адпраўлены ў манастыр. Не ў манастыр іх адправілі, а ў сасоннік. На расстрэл...

Сям'ю Скрыпкі фашысцкая няволя загнала ажно ў Аўстрыю. Вярнулася на радзіму з-пад Інсбрука.

— На голае поле вярнуліся. З жывата работалі. Посніцу елі. Цяпер жывём у дастатку. Толькі б вот здароўя дзе ўзяць...

— Зараз нам толькі б жыць! А вот няма галоўнага — гэта здароўя...

Дзе толькі не прыйшлося мне пабыць, каб сустрэць сведак асвейскай трагедыі!

...Перада мною было Задзежжа. Сюды я трапіў невыпадкова. Шукаючы былых вязняў Саласпілса, ураджэнцаў Асвейшчыны, я звярнуўся за дапамогай у Музей рэвалюцыі Латвійскай ССР, дзе мне паведамілі некалькі адрасоў. Я паслаў пісьмы, прыйшлі адказы.

Паведаміла **Паліна Снапок** з вёскі Лапісава, што была ў Саласпілсе, дзе ў яе аднялі дзяцей, а потым адправілі ў Майданак, адтуль — у Равенсбрук, а з Равенсбрука — у Лейпцыг. І вызвалілі цётку Паліну каля ракі Эльбы, у тым месцы, дзе адбылася сустрэча саюзнікаў. Расказала пра капітана Чырвонай Арміі, які ратаваў іх, вызваленых з фашысцкай няволі: «Ён нас перавозіў праз рэчку Эльбу, ратаваў ад голаду...»

Не вярнуўся з вайны муж цёткі Паліны. Але яна не адна: знайшла ў Латвіі сваіх дзяцей. Зараз на пенсіі.

А **Юхневіч Кацярына Сцяпанаўна** з Задзежжа так і папрасіла ў пісьме: «Калі б вы прыехалі, канечне, мы многа чаго б расказалі...»

І вось я сяджу ў звонкай хаце Юхневічаў. Дома і Кацярына Сцяпанаўна і Арсеній Андрэевіч. То адзін з іх, то другі размотвае перада мною доўгі і пакручасты клубок сваіх дарог.

Я н а: Мой мужык восенню 42-га пайшоў у партызаны. Спачатку быў у брыгадзе Воранава. Потым ваяваў у атрадзе Арджанікідзе брыгады Захарава... У партызанах ваявалі і два мае браты — Пётра і Дзмітрый Валадзёнкі.

Ё н: Мы выйшлі за фронт. Быў у запасным, потым на перадавой. 5 лютага 1944 года мяне раніла: руку перабіла. У Іркуцку лячыўся. Па радыё чую — занялі нашы Асвейшчыну. Пішу пісьмо. Паведамляюць: жонка жывая, робіць у Латвіі. Я і вярнуўся пасля 8-месячнага лячэння ў шпіталі. У Задзежжы — ніводнай хаты. А са мной — як стаю — анічога. І зямлянкі ў нас не было: адной рукой не зладзіш. Папрасіліся мы з жонкай да суседзяў.

Ачуняў я крыху пасля ранення. Выклікалі ў ваенкамат. І я зноў на фронт трапіў. Аж да Берліна дайшоў!

Я н а: Вайной у нашых хатах адны старыя заставаліся. А калі пайшла на нас экспедыцыя, я з сынам Дзмітрыем, тым самым, каторы зараз у Рызе жыве, з суседкамі Насцяй Гузік, Васілісай Ігнацёнак у Клясціцкі лес падаліся. Многія ўглыб пайшлі. А мы з дзецьмі спрыхаду засталіся. І папаліся. Было гэта 14 сакавіка 1943 года. Нас са станцыі Дрыса таварнякамі даставілі ў Рыгу, у яўрэйскае гета. Праз трое сутак адтуль пяшком заставілі ісці ў Саласпілс. 17 сакавіка там у нас аднялі дзяцей і адправілі на катаргу. У Саласпілсе я пражыла толькі адзін тыдзень. 5 красавіка мы ўжо будавалі дарогу над Ленінградам. Пасля прарыву нашымі войскамі ленінградскай блакады лагернае начальства разбеглася. Што рабіць? Які быў у каго пажытак — на саначкі і ходу. Пайшлі на Рыгу: сваіх дзяцей шукаць. Са студзеня па сакавік 1944 года дабіраліся... Прыблізна ў 40 кіламетрах ад станцыі Абрыно спыніліся. Гэта была вёска Паўлавы Бліны (зараз на тэрыторыі Пскоўскай вобласці). Акупанты пачалі хапаць бежанцаў і зноў заключаць у лагер. Тады мы як бы наняліся да латыша Артура Пальмы. У яго доме і пражылі з сакавіка аж па лістапад 1944 года. Ставіліся да нас добра.

Тут яшчэ адну гісторыю варта прыпомніць.

У чэрвені 44-га вылучылі 5 матак ісці ў Рыгу ў разведку : дзе нашы дзеці? Сярод іх была і я. Нам удалося знайсці тыя адрасы, куды

вывозілі дзяцей з Саласпілса. Але майго сына не знайшла ні ў спісках памёршых, ні ў спісках жывых. Я пачала ездзіць па адрасах тых дзяцей, прозвішчы каторых былі падобнымі.

Так я трапіла ў Сунтажы, дзе адна сям'я ўсынавіла хлопца — Юхневіча. Прыехала, паглядзела: не, не мой. Гэта быў Федзя Юхневіч. Яго матка, Маня, ума лішылася, калі ў Саласпілсе ад яе аднялі дзіцёнка, гэтага ж Федзю. Там яе і застрэлілі.

Вярнулася назад. І ўсё думаецца: а мо дзе ў паперах прапусцілі радочак?

І вот адна старая манашка параіла пераглядзець самыя першыя спіскі паступіўшых у манастыр дзяцей. На шчасце, там і знайшоўся адрас, куды забралі майго хворага сына у маі 1943 года.

Аказваецца, Міця гадаваўся ў Рызе ў Жукавай Аляксандры. Гэта яна ратавала сына ад смерці. Не хацела мне аддаваць Міцю: вылечыла, падгадавала яго...

І ўсё ж 20 чэрвеня 1944 года я ўзяла сына з Рыгі і прывезла ў Паўлавы Бліны. 12 ліпеня нас вызваліла Чырвоная Армія. І толькі ў лістападзе прыехаў па мяне муж.

Ё н: У сваю зямлянку ўзяла нас Феня Рублеўская. Дзякуй ёй за гэта. А потым мы і сваю так-сяк зладзілі...

Я н а: Мы хоць жывыя засталіся. А ў Мілавідах жа палілі ўсіх, хто толькі з малымі дзецьмі стаяў. Тапілі народ у Свольні, у азёрах Лешня, Доўгае. Марку Мядзела, Тумаша Стому ў раку разам з коньмі піхнулі... Некаму ўжо расказваць пра тое, што там дзеелася...

Ё н: Каля 45 двароў было ў Задзежжы. Пасля вайны сямей пяць вярнулася.

Я н а: Гузік Настасся згубіла двух сыноў у Саласпілсе: Віктара, 39-га года нараджэння, і Анатолія, 41-га года. А муж Настассі не вярнуўся з вайны, прапаў без вестак...

Зараз Юхневічы на пенсіі. Тры сыны прыязджаюць у іх звонкую хату: Дзмітрый — з Рыгі, Міхаіл — з Наваполацка, малодшы Пётр — з Ленінграда. Старыя ніяк не маглі пакінуць дзедаўшчыну: пасля Перамогі нават на пажарышчах будаваліся.

Фашысты ўсіх людзей на акупіраванай тэрыторыі бачылі сваімі рабамі. Яны нават дазвалялі браць знясіленых і замучаных саласпілскіх вязняў. І дзіцячыя прытулкі, створаныя акупантамі, былі не больш і не менш як форма назапашвання рабочай сілы. Не аб ратаванні дзяцей клапаціліся фашысты. Меркавалася так: той, хто выжыве ў экстрэмальных умовах, стане цяглам, нумарной істотай. Гэты ганебны і мярзотны разлік сцвярджае і той факт, што незадоўга перад сваім разгромам акупанты зноў стараліся забраць з сем'яў

усыноўленых рыжанамі дзяцей, запоўніць імі трумы караблёў і вывезці з Рыгі ў Нямеччыну.

Да гонару нашых суседзяў — і ў самы цяжкі час, і ў самых неспрыяльных умовах, як гэта даказваюць сведкі, ніводнае дзіцё на хутарах не загінула, а рыжане хавалі ад жандараў сваіх гадаванцаў, не давалі вывозіць іх на чужыну...

Вось што пра лёс сваёй сям'і расказвае **Хадзюк Лідзія Міхайлаўна** з Росіцы:

— Наш дом стаяў амаль што на гэтым самым месцы. У той дзень мая мама Фрасення Іванаўна пайшла ў касцёл. Прыбегла, калі самалёт пачаў біць па Росіцы. Хто ў лес, а мама ў доме хоча застацца. І ўнучку хоча з сабой пакінуць, маю дачку. Але я не аддала ёй. Як ведала, што можа згарэць у сваёй роднай хаце.

12 сутак мы ў лесе скрываліся, пакуль не акружылі нас карнікі і не павялі на Дубнікі. Там, на заставе, і палілі.

Наша хата на два канцы была. Дык кажуць, што ў ёй спалілі каля 500 чалавек. Дзяцей многа было... А яны ж многа месца не займаюць... Вунь тое пажарышча, на маім агародзе... Шыпшына там штогод расцвітае...

У Саласпілсе я прабыла 5 тыдняў. Хто не помніць той лазні... Аднаго разу стражнік узлез на нейкае ўзвышэнне, у касцюме, пры гальштуку і здзекліва крыкнуў нам: «Гаспада, раздзявайцеся!»

Хто гэта будзе раздзявацца, вось так, пры ўсіх? А стражнік: «Мы з вамі яшчэ як з людзьмі абрашчаемся!»

Пасля той «лазні» трое сутак адстаялі ў загарадках, дзяцей трымаючы на руках. Гэта так мы іхні «каранцін» праходзілі...

У Майданаку Лідзія Міхайлаўна была рабыняй № 3676.

Потым быў Равенсбрук. Разам з ёю адбывала каранцін яшчэ 76 тысяч чалавек.

У Ноенрандэнбургу пад зямлёй працавала. Майстар зэдлікам амаль штодня біў страшна, бо з яе работы было многа браку.

І зноў пытанне да Лідзіі Міхайлаўны — пра малых дзетак. У Саласпілсе адабралі яе дачку Тамару. Многіх саслабелых вязняў ратавалі хутаране. Тамары выпала жыць на хутары Зімітас, што каля станцыі Ліелварды. У самога гаспадара было пяць дзяцей, а тут і Тамара.

Яна спала ў кузні ля печы. Але ж і то добра, што жыва засталася. Расказвала дачка: калі з Саласпілса вывезлі дзяцей, размясцілі іх у нейкім хляве вялізным. Згаладалым прывезлі каня здохлага. Хто еў — у страшных муках памёр.

І яшчэ Лідзія Міхайлаўна дадала:

— Тут у нас не так даўно з Рыгі людзі прыязджалі. Адзін з іх, былы вязень, сіратой застаўся: яго ў Саласпілсе ад маткі адабралі. Мужчына шукаў каго-небудзь з родных. Ён толькі помніць адно, што родам з Росіцы. Дазнаўся толькі, якой ён фаміліі быў. І вось хацеў знайсці роднага чалавека.

З Бігосава цётка Юзэфа хадзіла глядзець, але не прызнала: імя не падыходзіць...

Іду далей па дарогах Асвейшчыны. Блакнот напаўняецца ўсё новымі запісамі-сведчаннямі...

Новыя Марозы пабудаваліся недалёка ад старых, спаленых. І як часта бывае ў вёсках, у Марозах, канечне, жыве многа Марозаў.

Гутару з **Мароз Фёклай Міхайлаўнай**.

— Сёння ж якраз гадавіна, 16 лютага. Трыццаць восем гадоў назад у гэты дзень нас палілі. Дык мужык пайшоў на сяло: успомніць з людзьмі дзень наш чорны.

...І Фёкла Міхайлаўна, пакуль мы чакалі Вячаслава Дзяменцьевіча, гаспадара, расказала, як у пачатку вайны ў іх лазні хаваліся акружэнцы. За старшага быў Іван Пятровіч з Каўказа. «Яны былі харошыя, тыя людзі»,— зазначае гаспадыня. Яна разузнала, дзе ёсць партызаны, і па просьбе акружэнцаў правяла ў атрад.

Карміць прыходзілася не толькі двух-трох чалавек. Аднойчы ноччу 20 партызан увайшлі, пастукаўшыся ў хату (каб дзяцей не разбудзіць!), і папрасілі паказаць дарогу на чыгунку. Прапанавала і паесці, свае ж людзі... Бульбы зварыла, прастаквашы наліла...

Той жудасны дзень 16 лютага 1943 года так запомніўся Фёкле Міхайлаўне...

— Самалёты чуць не за стрэхі чапляліся. 14 хат было ў вёсцы — усе запалілі. Мы амаль голыя стаялі на снезе: добра, калі хто на плечы які лахман паспеў накінуць... За некалькі мінут згарэла ўсё, што мы гадамі збіралі...

У Саласпілсе сям'я Марозаў (у іх было двое дзяцей) прабыла да красавіка. Потым бацькоў адправілі на работы, а дзяцей пакінулі адных.

— Па сотні малых памірала з голаду ў лагеры. Труцілі іх нейкай кавай салодкай, уколы дзецям рабілі.

Нас, старэйшых, нават у царкву вадзілі. Поп пытаўся, як з намі ў лагеры абыходзяцца. Мы гаварылі папу, ды... Не на нашым баку той бог быў...

Знайшоў на вёсцы Вячаслава Дзяменцьевіча. Слухаю яго ўспаміны пра тое, як 16 лютага 1943 года за некалькі гадзін былі спалены

разам з Марозамі вёскі Вароны, Данькі, Кавалеўшчына, Спругі... Вось некалькі прыпамінаў з перажытага Вячаславам Дзяменцьевічам.

У Саласпілсе перад кожным ахоўнікам трэба было здымаць шапку, кланяцца... Праца была цяжкай, здзеклівай. Вось адзін прыклад: 24 чалавекі запрагаліся ў дышла калоды, якою ўкатвалі дарогі. Жылі вязні ў цесных і халодных бараках. Па яго словах, у іх бараку было тры рады нараў па пяць ярусаў. Да іх прыходзілі агенты, яны вышуквалі ахвотнікаў пайсці ў паліцыю, за што абяцалі надзяліць зямлёй. Толькі ахвотнікаў такіх не знаходзілася. Ніхто не хацеў ісці на службу да гэтых варвараў, дзікуноў.

Спачатку мяне здзівіла тое, што Вячаслаў Дзяменцьевіч праз усе лагеры пранёс дакументы: паеведчанне, якое было выдадзена 9 студзеня 1892 года яго бацьку — Дзяменцію Сцяпанавічу Марозу — аб заканчэнні Сушкоўскага народнага вучылішча, і ўласную метрыку, выдадзеную 21 сакавіка 1917 года.

Гэта не першы выпадак, калі ў няволі людзі зберагалі хоць нейкі доказ уласнага імя. І Мароз Вячаслаў, вязень № 13503, хоць бацькоўскім дакументам, хоць сваёй метрыкай даказаў, у першую чаргу сабе, што ён народжаны чалавекам і не гітлераўская «арбайтскарта» з адбіткамі пальцаў і нумарам-кляймом — яго галоўны дакумент. Успомню тут і настаўніка Ліпаўку Яфіма Трафімавіча. 29 снежня 1943 года ён быў арыштаваны фашыстамі і толькі 29 красавіка 1945 года выйшаў на волю. Праз увесь час акупацыі Яфім Трафімавіч зберагаў сваю партыйную кандыдацкую кніжку. І калі вярнуўся на бацькаўшчыну, перадаў яе ў райком.

Вельмі многія людзі расказвалі мне, як яны ў выключных умовах канцлагераў берaглі даваенныя сямейныя фотаздымкі, асабістыя дакументы. Безназоўнаму чалавеку, які быў нумарам у фашысцкай гаспадарцы, лягчэй было толькі ад таго, што недзе ў куртцы ён адчуваў зашытае фота бацькоў, метрыку... А Мароз Валянціна Восіпаўна з Росіцы нават праз славутую лазню ў Саласпілсе, калі голай па снезе трэба было бегчы не адну сотню метраў, пранесла адразу некалькі дакументаў: пашпарт, камсамольскі білет, здымкі родных, сярод якіх фота брата-чырвонаармейца.

Яшчэ не ўсё расказаў я пра сям'ю Марозаў. Па вайне знайшліся іх двое дзяцей. На маё пісьмо адклікнуўся сын — Вячаслаў Вячаслававіч. Ён жыве ў Ліванах. У 1980 годзе Вячаслаў закончыў Даўгаўпілскі педінстытут і стаў працаваць там выкладчыкам. Я і папрасіў яго дапоўніць сямейную хроніку. Вось што ён мне напісаў:

«У 1943 годзе акупанты пачалі аперацыю для стварэння «санітарнай» зоны ў прыгранічных з Латвіяй раёнах, каб не дапусціць пашы-

рэння партызанскага руху на тэрыторыю Латвіі. Былі поўнасцю спалены ўсе населеныя пункты. Уцалелых жыхароў змясцілі ў канцлагеры. Так вось наша сям'я аказалася ў Саласпілсе.

Там частку дзяцей, якіх адлучылі ад бацькоў, пакінулі ў дзіцячым бараку, а другую частку, куды трапіў і я, адправілі ў Лібаву (зараз Ліепае) — у «дзіцячы прытулак»...

Нас, дзяцей, вывелі, пасадзілі ў аўтобус. Машына кранулася, і я ўбачыў жанчын, якія беглі за аўтобусам і крычалі. Сярод іх наперадзе пазнаў сваю маму.

Пасля даведаўся ад яе: жанчынам у апошні момант сказалі, што нас адвозяць, і яны прабіліся з суседніх баракаў да машын... Было позна.

Запомнілася тая падарожная ноч. Шафёры ў аўтобусе кураць, перагаворваюцца па-нямецку. Дзеці паснулі, ды не ўсе: адны румзаюць, усхліпваюць. Мне не хапіла месца на сядзенні, і я ўладкаваўся на запасным коле. Потым скруціўся абаранкам. Засынаю. Бачу сон. Еду верхам на кані. Гэта наш сусед у вёсцы конюх Мікола ўзяў мяне на выган. І я, шчаслівы, еду на начлег...

І вось я ў «дзіцячым прытулку».

Памятаю, я павінен быў зубрыць малітвы, спяваць нейкія гімны і маршы. Там былі дзеці рознага ўзросту: ад года да дзесяці. Рэжым для тых, хто мог хадзіць, быў армейскі: пастраенні, перамяшчэнне строем.

Відаць, і там з нас бралі кроў, бо памятаю, як страціў прытомнасць, калі ў бальнічнай палаце нешта са мной рабілі.

Нам забаранялася падыходзіць да акна. Калі наглядчык прыкмеціць, што хто выглянуў на волю, таго каралі: на некалькі гадзін ставілі на калені. Помню знясіленую работу на кухні: я сяджу ў вялікім катле і драю яго жалезным драчом. Млосна, пот цурчыць руччом. Чую з катла, як клопчыкі ходзяць строем і спяваюць маршы.

Ці думаў я пра родных, пра сям'ю? Спачатку — часта. Потым — радзей. А мне ж тады ішоў толькі сёмы год...

Калі праз сем месяцаў маме перад адпраўкай у Германію дазволілі ўзяць мяне, я з ёй гаварыць не ўмеў, хоць яе словы да мяне яшчэ даходзілі.

Памятаю, выклікае выхавацелька, прыводзіць мяне ў пакой. Каля сцяны стаіць жанчына: знаёмая, незнаёмая... Углядаюся. Мама! Кідаюся ёй на шыю.

Нас вядуць у кладоўку, дзе знаходзіцца мая вопратка. Пазнаю сваё паліто, у кішэні знаходжу сухар, які праляжаў там 7 месяцаў. Ідзём праз начны горад. Баюся фараў сустрэчных аўтамабіляў... Мама

пра нешта пытаецца. Расказваю пра сябе, а мама мяне не разумее. З яе вачэй сыплюцца слёзы...»

Да слоў Вячаслава Мароза можна дабавіць наступнае. У 1944 годзе, незадоўга да наступлення савецкіх войск, немцы стараліся як мага хутчэй вывезці з акупіраванай тэрыторыі гвалтоўна захопленых людзей. Сям'ю Марозаў везлі параходам з Рыгі ў Гданьск, з Германіі перавезлі ў Аўстрыю. Іх вызвалілі ў Куфштэйне, што недалёка ад Інсбрука.

Усё настойлівей клічуць далёкія дарогі: трэба ехаць у Латвію, каб паспець пагаварыць з усімі жывымі саласпілцамі. Ды раптам ліст з Ліепае:

«...Вы просіце, каб мая мама — Кандратовіч Ксенія — успомніла пра сваё жыццё. Прайшло вось ужо колькі гадоў, як закончылася вайна... Мая мама — хворая, старая жанчына. Успомніць што-небудзь з тых ваенных гадоў ужо ёй не пад сілу. Дый пытацца пра тое баюся. З кожным успамінам аб вайне ў яе пачынаецца сардэчны прыступ. У мамінам уяўленні навечна застаўся Саласпілс такім: доўгія баракі, плач дзяцей, матак, крыклівая нямецкая лаянка.

Ад сябе магу дабавіць, што ў нашым горадзе жыве многа беларускіх жанчын, былых вязняў Саласпілса. Раю звярнуцца ў мясцовую газету... Блудніцкая Т. С.».

Я і звярнуўся. Адклікнуўся толькі адзін чалавек. Нялёгка ўзяцца за пяро, калі пры адной думцы пра вайну захлынаецца сэрца...

Для ўсіх людзей з прыдзвінскага вогненнага краю вайна так і не заціхла. Кожная хвіліна той, такой ужо даўняй бяды, пульсуе нясцерпным болем. Тут пра вайну памятаюць штодзённа, штоночна, не думаючы пра тое, што яе трэба помніць. І радзіма твая, Браніслава, уяўлялася мне яшчэ не адкрытым мацерыком, яшчэ не спазнанай зямлёю нескароных людзей. Верылася, што сярод гэтай нясцерпнай памяці тлеюць іскрынкі слоў пра твой нязрушны род, Браніслава. Ды і сама зямля прыдзвінская мне адгукалася новым імем: у брані, у славе стаялі курганы і бары, новыя вёскі і новыя хаты... У славе былі і самі людзі былога Брацкага партызанскага краю. Тваё імя, Браніслава, гучала мне тут на кожным кроку, пры кожнай новай сустрэчы.

Праглядаю свае запісы. І зноў паўстаюць перада мною асвейцы, гучыць іх трапяткая мова... Нібы само полымя — іх успаміны...

...З вёскі Стунжава ўратаваліся двое: Маня Жук і яе братавая Вера Жук. Вера Восіпаўна жыве зараз у Бігосаве. Гаворыць нібы пра ўчарашняе:

— У Вознаве стаялі партызаны. Мы і пайшлі туды воўну часаць. Вяртаемся дадому, а кругом усё гарыць...

Карнікі ішлі ад Росіцы на Сар'ю. Пад мур мельніцы сабралі чалавек 300. І зараз уяўляю: стаіць перад намі немалады і брухаты карнік. Я адвярнулася да сцяны, каб не бачыць, што будзе. Выбралі 20 чалавек. Астатніх павялі ў сушылку, паліць. Падвод, можа, з 400 было. Сама бачыла, як на іх нагружалі карнікі наша дабро...

Мужа Веры Восіпаўны і яе двое дзяцей спалілі ў пуні Хведзькі Дзярка. А яе далейшы лёс быў такі.

У Саласпілсе яна павінна была круціць шнур з саломы, па 800 метраў за суткі. У Майданаку не раз каралі яе па 25 удараў: жывога месца не было — ні легчы, ні сесці... Потым — Асвенцім, Равенсбрук.

Росіца, Саласпілс, Майданак, Равенсбрук, Асвенцім — такі пакутны шлях яшчэ ў адной маці — **Уселенак Настассі Аляксандраўны**. Фашысты спалілі яе бацьку Аляксандра Пятровіча за сувязь з партызанамі. Загінуў былы старшыня калгаса Павел Якаўлевіч, яе муж. Уратаваўся толькі сын, Павел Паўлавіч. Быў сынам палка. Зараз працуе ўрачом у Віцебску.

**Шыдлоўскі Іван Іванавіч** выратаваўся ў доўгай і пакутнай дарозе да Саласпілса толькі таму, што перад адпраўкай яго маці злаўчылася выдаіць карову і вядро малака людзям удалося пранесці ў вагон. Хто млеў, таго паілі гэтым малаком.

Іван Іванавіч не дасказаў мне пра свой лёс і лес сваіх сясцёр. Не вытрымаў чалавек: затросся, заплакаў і выбег з хаты...

Зноў вяртаюся я ў думках да **Снапок Паліны Аляксандраўны**. Мне пашанцавала: да старэнькай жанчыны нехта з родзічаў прыехаў у госці і яна папрасіла напісаць пра ўсё тое, што сама не змагла паведаміць у першым сваім лісце.

«3 сакавіка 1943 года нас забралі ў Галубаўскім лесе. Хацелі расстраляць, ды, відаць, прыйшоў нейкі загад, каб забраць у няволю. Вялі нас праз вёскі Галубава, Свіроўшчыну, Востры Канец. Пры нас ужо карнікі, спыніўшы калону, падпальвалі хаты, нішчылі ўсё жывое. У вёсцы Пажарышча загналі частку нашых людзей у пуню і спалілі. У Бондараве выбралі старых і слабейшых, каб спаліць у хляве. Начавалі ў вёсцы Бацекі. Назаўтра зноў сарціравалі: хто быў хворы, аслабелы, старога веку — тых спалілі ў пяцісценцы. Поўна-поўна хату напакавалі. А ўсіх астатніх прывялі ў Бароўку, дзе і пагрузілі ў поезд.

У Саласпілсе ўсіх нас узялі на ўлік, запісалі былыя адрасы, 20 сакавіка забралі дзяцей, а нас павезлі ў Майданак. Працавалі па 12 гадзін. Пяць раз у суткі падоўгу стаялі мы на пляцу.

Там было некалькі палёў-агародаў. І вось аднойчы з аднаго поля ўцёк мужчына. Тады нас выгналі на пляц, і мы там стаялі некалькі дзён і начэй не еўшы, не піўшы, пакуль уцекача не злавілі.

Разам са мной стаяла маладая дзяўчына з Ленінграда — Наташа. Прозвішча не памятаю. Яна нам вельмі памагала, падымала настрой. Наташа гаварыла, што мы ўсё роўна выйдзем на волю. Яе пачуў, відаць, шпік і прадаў. Загубілі Наташу.

Калі нас толькі прывезлі ў Майданак, там былі невялічкія крэматорыі. Фашысты не спраўляліся знішчаць людзей і вось тады і пачалі трупы спальваць на стагах. Месяцы два палілі на адным месцы, потым касцёр пераносілі на другое. А той попел нас прымушалі разносіць і рассяваць па палях, каб зямлю ўгнаіць.

І вось праз некаторы час з'явіўся новы крэматорый, у які ўмяшчаліся адразу 100 чалавек.

Аднойчы нас на работу не пагналі, пакінулі ў бараках і нават праз вокны глядзець забаранялі. Падумалася, што прыйшоў канец. А гэта прыгналі новы транспарт з яўрэямі. Каля крэматорыя загадзя былі падрыхтаваны траншэі. Дык вось каля гэтых траншэй ставілі яўрэяў і стралялі. Казалі, што за адзін той дзень было расстраляна ці не 48 тысяч чалавек.

У Майданаку я адбыла 1 год і 2 месяцы. Вясной 1944 года трапіла ў Равенсбрук.

А праз два месяцы мяне з Равенсбрука перавезлі ў Лейпцыг на ваенны завод. Працавала на ўпаковачнай. Знарок пакалечыла руку і трапіла ў бальніцу. Хацелі адправіць у крэматорый. Прыйшлося з хворай рукой выйсці на работу. Ды ўскорасці прыйшло вызваленне. Мы апынуліся каля Эльбы. Нехта параіў, што трэба пераходзіць на ўсходні бераг ракі, дзе нашы салдаты. А ўсяго нас, вязняў, было 458 чалавек. І мы толькі паспелі перайсці мост, як яго ўзарвалі. Перайшлі мы Эльбу каля горада Рыза.

Сабраліся ў нейкую хату: хто плакаў, хто спяваў, хто смяяўся ад радасці. Раптам убачылі, як з лесу выскачыў атрад на конях. Гэта была наша разведка! Сустрэчу гэту апісаць немагчыма. Салдаты спыталі, хто вывеў нас, хто ратаваў. Тады мы паказалі на немца. Гэта былы наглядчык вывеў нас на ўсходні бераг Эльбы, але папрасіў нас, каб і мы яго ратавалі ад кары. Салдаты, праўда, яго не кранулі. Толькі сказалі, у які бок нам ісці, а самі паехалі наперад. Мы знайшлі на полі бурт бульбы і сталі грызці яе, сырую, і набіраць у кішэні. У гэты час падышоў наш салдат і сказаў, каб мы кінулі гэту бульбу, і параіў ісці за ім. Спачатку прапанаваў памыцца і пераапрануцца, а потым — паесці. Але мы адразу кінуліся ў падвал, дзе была прыгатавана страва. Салдаты прасілі нас многа не есці. Ды як паслухацца? І многія з нас адразу ж захварэлі. Нам, згаладнелым, трэба было паціху прывыкаць да яды..

Назаўтра да нас далучыліся ўкраінцы. Яны і правялі праз увесь горад, які яшчэ быў акружаны гітлераўцамі.

26 красавіка 1945 года ў горадзе Рыза адбылася сустрэча нашых войск з англа-амерыканскімі салдатамі. А потым нас адправілі на зборны пункт у Шпрэмберг. Адтуль я і напісала дадому пісьмо. Але толькі восенню змагла адправіцца на Асвейшчыну: дапамагала ў санчасці нашым хворым і параненым. 16 сутак была ў дарозе, але дабралася.

А як прыехала, пачала шукаць дзяцей. Вясной з Латвіі прыйшла вестка, што маіх дзяцей гадуе адна латышская сям'я. Я паехала туды. Дзеці мяне спачатку не прызналі. Давялося застацца на гаспадарцы і працаваць там да восені. А восенню, калі прыйшоў з арміі брат, ён прыехаў і забраў нас на радзіму.

Дзеці сталі вучыцца. Мы пабудавалі дом. Абжыліся.

Зараз я на пенсіі. Сын і дачка маюць свае сем'і.

Вось такія мае кароткія ўспаміны. Што будзе незразумела — напішыце. Снапок Паліна».

Усё, усё зразумела, шаноўная цётка Паліна. Дзякуй вам за вашу памяць. Схіляюся перад вашымі далёкімі шляхамі вяртання ў жыццё.

Ніколі не надзівіцца з невымернай мужнасці ўсіх маіх субяседнікаў, з іх умення ўзвысіцца над былымі бядотамі.

Як тут забыць сухенькую, рухавую цётку **Ушакову Анюту**.

Яшчэ ў маладыя гады яна вывучылася на трактарыстку. Колькі калгасных палеткаў апрацавала сталёвымі плугамі!

У тым чорным 43-м ёй было крыху больш за трыццаць. Яе не расстралялі ў агародзе каля студні, дзе палегла 7 чалавек з вёскі Вароны. Нядоўга яна прабыла і ў Саласпілсе ў бараку Б12. Там, забраўшы ад яе сямігадовага Сашу, пасадзілі ў транспарт, у якім знаходзілася тысяча жанчын і дзвесце мужчын.

— Дзе сучок вышчапнуўся ў дошцы, глядзелі праз дзірачку ў вагоне, як ад'язджаем усё далей і далей на чужыну. Доўга везлі ў Люблін.

У Майданаку Ганна Васільеўна Ушакова жыла ў адным з 36 драўляных баракаў. У кожным — па тысячы чалавек. Яда: авёс непрасеяны, буханка хлеба на 5 чалавек. «Опель» —пляц: тры гадзіны раніцай трэба было прастаяць, чатыры гадзіны вечарам. Спачатку Ушакова працавала ў пральні, потым даглядала хворых дзяўчат, на якіх фашысцкія «ўрачы» праводзілі доследы (выдаленне органаў).

Ушакова расказала і пра метады пакарання вязняў у Майданаку: ахвяру клалі жыватом на скрыню, абабітую калючым дротам, і білі палкамі.

Калі толькі ў вязня пачынала праяўляцца хвароба: ацёк твару, ног — яго адпраўлялі, як гаварылі там, на 6-е поле, гэта значыць, у крэматорый.

Плакаць вязням забаранялася.

Майданаўскі стаж Ушаковай — без адзінаццаці дзён год, крыху меншы, чым у Паліны Снапок.

Потым — медагляд, фатаграфаванне і — Равенсбрук.

З 200 мужчын, адпраўленых разам з ёю ў Саласпілс, дадому вярнулася трое. Сярод іх — Сяўрук з Крэўнікаў, жонка якога загінула ў Саласпілсе.

— Памятаю, у Майданаку нам лазню рабілі. Вакол стаяць мужчыны ў чырвоных штанах з нагайкамі. А нам пусцілі халодны душ. Так мы і памыліся. А плакаць нельга было. Тады білі. За дзень работы давалі акрайчык хлеба. А прыйдзеш у барак — холад. Вокны незашклёныя, нары без матрацаў. Потым — Равенсбрук. Запомніўся карны блок. Сядзелі мы там амаль што адзін на адным.

Спрабавала ўпарціцца, не рабіць. Два разы галавой у сцяну як «з'ездзілі» — «навучылася»! За любую правіну садзілі ў бункер. Сядзім — голыя, як цапы,— па тры дні ў вадзе. А чаго варта было 7 гадзін у дзень прастаяць на пляцу. Адзін раз у суткі ў цэх прыносілі кіблы з ежай. Паясі — яшчэ больш хочацца. Бывала яшчэ ў Майданаку: калі рабілі на полі, дык бульбіну разразалі і да ног прывязвалі — каб у лагер перанесці. Ахова часта рабіла рэвізію. Калі знаходзілі прыпасы, білі па-страшнаму.

А яшчэ вось як здзекаваліся. На ўвесь лагер толькі адна прыбіральня з трыма дзюркамі была. Калі хто не датрывае, не дабяжыць — усяму лагеру есці не давалі.

Гэта ў Майданаку мы склалі песню пра волю, пра салаўя, які нас выведзе вясной з няволі...

І вось дачакаліся вызвалення. Калі перад наступленнем Савецкай Арміі збегла варта лагера, мы затаіліся. Раптам чуем: тарахцяць калёсы.

— Выходзьце, рускія прыйшлі!

Мы высыпалі са сваіх схованак. Аднаго нашага салдата паваліў з радасці на зямлю, качаемся ўсе ў кучы...

А потым Ганна Васільеўна расказвала мне і пра сына. Яго знайшлі ў дзіцячым доме ў Сігулдзе.

Не можа забыць Ушакова першыя словы, сказаныя потым яе сынам:

— Мамка, дай хлеба. Я хачу з хлебам заснуць...

Так маленькі чалавек хацеў займець надзею, што і заўтра ў яго будзе што з'есці, што не прападзе хлеб, калі будзе заціснуты ў кулачок...

Першае жыллё іх было такое: стог сена. Другое, бо не было сякеры, крыху лепшае: наламала алешніку і склала ў пірамідку. Потым гэты алешнік абклала сенам, і каб яно не развальвалася, прыкрыла зямлёй і дзірваном.

І яшчэ некалькі эпізодаў, пачутых у хаце Ушаковай.

...У Майданаку аднойчы задушылі паставога. Адзін вязень пераапрануўся ў яго форму, стаў за начальніка каманды і вывеў групу мужчын з лагера на чыгуначную станцыю. У пакаранне тры дні ўвесь лагер стаяў на пляцу. Уцяклі смельчакі. Сярод іх быў і Іван Чорны з Воранава, сусед Ушаковай.

## Частка другая

Для далейшай гаворкі, мая дарагая Броня, вазьму ўспамін пісьменніка Надара Думбадзе.

Аднойчы ў Турцыі да групы грузінскіх пісьменнікаў падышоў чарнавокі, чарнабровы хлопчык. Нос з горбікам.

— Я грузін,— прызнаўся хлопец.

— А па-грузінску чаму не гаворыш?

— Мама памерла.

І мне не раз даводзілася сустракацца з людзьмі, якія па волі лёсу былі разлучаны з бацькамі, і матчына мова прыходзіла да іх тады, калі трэба выказаць нешта душэўнае... А колькі выпадкаў, калі дзеці і зусім забываюць, як гаварылі іх бацькі.

І як сведчанне гэтаму — горкія словы **Гяч Ядвігі Дзяменцьеўны**:

— Мой муж пайшоў на фронт па першай мабілізацыі. Незадоўга пасля гэтага і сын нарадзіўся — у 41-м. Спачатку я жыла ў Старых Марозах. А вайной — у Ворзаве. Веска невялікая, на 12 двароў. Амаль што на мяжы з Латвіяй. Аднаго разу карова дрот паралезла, за «граніцу» трапіла, дык доўга мяне цягалі паліцэйскія: чаму карова «мяжу» парушыла?

Праз некаторы час пачулі: збіраецца карная экспедыцыя. Ой, а што потым пачалося! Глядзім і думаем: гарыць гэты свет! Ноччу не распранаемся. І есці не варым.

22 лютага мая дачка шаснаццацігадовая ўбегла ў хату:

— Мамачка, салдаты ў белых халатах нас акружаюць!

Растаропная была дачка.

А карнікі ўжо блізка. Мама мая хворая на печы ляжыць. Прашу яе:

— А мамачка, не стагні ж ты, бо ўчуюць.

А карнікі — на парозе.

На вуліцы зерне сыплецца, свінні хрыпяць, ад курэй галовы адлятаюць, сабака наш заенчыў і заціх. І як гэта ў мяне вырвалася:

— Мільыя! Не страляйце толькі карову! Карову аддайце!

Як стукнуць у грудзі — лячу ў снег.

Падымаюся — і зноў крычу.

Спачатку павезлі ў Сушкі, у хлеў. Не палілі. Я змагла б уцячы па дарозе, ды мая мама заплакала:

— А на каго ж дзеткі застануцца? Куды ты мяне дзенеш?

Так і паехалі ў Саласпілс. Па дарозе не кармілі. Лёду, праўда, кідалі ў вагон.

Праз тры дні ў Саласпілсе пачалі адымаць дзяцей. Падышоў паліцай у чорных акулярах, вырывае сына. Набралася сілы і смеласці і крычу яму:

— Сама панясу!

А малы так плача, аж залівaецца, не магу больш трываць. Падношу яго да машыны:

— Зося, Дуся! Глядзіце ж Генадзіка!

Вось ужо і бірачку яму вешаюць. Я закруціла яе пад самую шыйку: года ж дзіцёнку не было, яшчэ адарве бірку незнарок.

Куды павезлі сына — не ведала. А ў бараку ад мяне і дзяўчынку шасці гадоў адабралі. У галаве — памарачэнне. Акамянела ўся. А тут і з мамай разлучылі. Ёй 60 гадоў было, трапіла да гаспадара на хутар.

А мяне пасадзілі на цягнік, завезлі ў Майданак. Там дзень і ноч народ падаў. У гэтым лагеры загінулі расіцкія Гажэўскія з дзецьмі, з Каменцаў — Оля Уселенак... Як снапы валіўся народ. Сілас елі, шпінат з карэннем, бо нам, рускім, пакеты Чырвонага Крыжа не перадавалі. А мы працавалі і пасля сіласу.

Нас там і ў басейнах тапілі, і так здзекаваліся. Аднойчы Лаўрыновіч Маня ад стомы прысела на дарозе — тут жа застрэлілі. Маёй дваюраднай сястры Зосі Іванчук з Каменцаў сабака-аўчарка выдрала мяса на назе. Аднойчы бачыла ў лагеры, як дзяўчаты ляжалі пад дротам, токам забітыя... Відаць, хацелі ўцячы.

Як сын знайшоўся?

Ратавала яго Мініч Ядвіга з Рыгі. А быў Генадзька спачатку ў Лібаве ў прытулку. Мініч расказвала, што ў яго жылы сінія ўздуліся па ўсім целе.

Калі я вярнулася з Нямеччыны, да мамы далучылася: яна раней мяне з Латвіі прыехала. Стала ў дэпо рабіць. Пачала я шукаць сына. У Рызе паказвалі спісы дзяцей. Хто памёр — закрэслены. Сказалі, што мой сын гадуецца ў дзіцячым доме Ігатэ, што за Лімбажы. 75 вёрст — не жарт: добрыя людзі мне хлеба па дарозе давалі, салдаты на машынах падвозілі.

Прыехала. Паказалі сына. Кінулася да яго, а ён мяне ўжо і не разумее. Мой сын ужо па-нашаму і слова не вымавіць.

Мне раілі ў дзіцячым доме: «Не бяры сына. Дзе будзеш з ім жыць?» Як гэта «не бяры»? Сэрца мае і так усё спяклося за гады разлукі. У голадзе — не ў бядзе. Тады выхавацелька напісала на паперыне пераклад слоў, з якімі часцей за ўсё сын мог бы звяртацца да мяне... Ну, як хлеб называецца. Мне пераклалі і другія словы...

Вось і ехала на Беларусь: з сынам і паперкай той, па якой мне на першым часе даводзілася разумецца з родным сынам.

...Не раз размаўляў з Ядвігай Дзяменцьеўнай. Яна жыла ў Бігосаве, працавала прыбіральшчыцай на паштовым аддзяленні. У Саласпілсе ёй было 30.

Да тэмы майго пошуку далучаліся ўсё новыя факты. У кнізе «Мы абвінавачваем», якая выйшла ў 1967 годзе ў Рызе, сярод матэрыялаў пра зладзейства гітлераўскіх акупантаў і латышскіх буржуазных нацыяналістаў у раздзеле «Крывапійцы» пад № 125 надрукаваны такі дакумент: «З гісторыі хваробы Д. Саксона ў 1-й Рыжскай гарадской бальніцы. Рыга, красавік 1945 года».

Прачытаўшы яго, я даведаўся, што Дзіма нарадзіўся і жыў у асвейскай вёсцы Крэўнікі. Калі карнікі занялі раён, яны арыштавалі ўсіх жыхароў з дзецьмі і загналі іх у саласпілскі канцлагер. Там людзей марылі голадам, два разы ў дзяцей бралі кроў. Пасля гэтага хлопец адчуваў вялікую слабасць, у яго балела галава. Пасля лагера адно лета быў пастухом, а потым трапіў у Булдуры, у арганізаваны акупантамі дзіцячы прытулак. Пра бацькоў нічога не ведаў. І ў дзіцячым доме бралі кроў праз кожны месяц. Штораз бралі па паўшклянкі крыві.

Гісторыю хваробы падпісаў намеснік галоўнага ўрача д-р Заліціс.

Ніжэй зноска: «Дзіма Саксон нарадзіўся ў 1937 годзе».

Яшчэ раз імя асвейскага хлопчыка сустрэў у часопісе «Огонек» №№ 12-13 за 1945 год. Ішла вайна, але Рыга была ўжо вызвалена, і латышская пісьменніца Анна Саксэ змясціла ў часопісе самыя свежыя назіранні.

Пра што ж пісала Анна Саксэ ў артыкуле «Дзеці абвінавачваюць»? Яна наведала толькі адзін з былых акупацыйных дзіцячых прытулкаў Булдуры:

«Усмешка рэдка калі асвечвае твар Тамары Пузанскай. Зараз ёй дзесяць гадоў. Цэлы год у прытулку яна не вымавіла ні слова, і ўсе думалі, што яна нямая. На вачах у гэтай дзяўчынкі карнікі спалілі яе маму. Гэта было ў Беларусі, у вёсцы Любасна Віцебскай вобласці...»

Анна Саксэ пісала і пра дзяцей Лемяшонкаў, бацьку якіх забілі ў турме, а маці разам з чатырнаццацігадовай дачкой Нінай адправілі ў Германію.

Пра сям'ю Лемяшонкаў можна было б напісаць цэлую кнігу. Саласпілс адбіўся на лёсе кожнага самым неверагодным чынам. Дзеці страцілі бацькоўскае імя, аказаліся параскіданымі па шырокім свеце.

У Аляксандры і Георгія Лемяшонкаў было сямёра дзяцей. Вось што я пра іх даведаўся. Клара (яна ж — Галіна Сіманаўна Ігнаценка) — юрыст Мінскага трактарнага завода; Ніна (Ніна Георгіеўна Абрамава) — настаўнічала ў Рызе; Жэня (Яўгенія Ігараўна Рамашонак) — выхавацелька аднаго з рыжскіх дзіцячых садоў; Наташа (Наталля Георгіеўна Зубкова,— урач у Рызе); Барыс Георгіевіч Лемяшонак жыве і працуе ў Карагандзе; Шура (Аляксандр Рыгоравіч Лемяшонак) — у Рызе...

Пра сваю маленькую сястру Аню Наташа Лемяшонак так расказвала на судовым працэсе па справе аб зладзействах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Латвійскай, Літоўскай і Эстонскай ССР, які праходзіў у Рызе з 26 студзеня па 2 лютага 1946 года:

— Калі падышла мая чарга, доктар вырваў Аню з рук. Пры гэтым доктар уваткнуў мне ў руку іголку, і калі набраў поўную шкляную трубку, адпусціў мяне і стаў выбіраць кроў у маёй сястрычкі. Я стала крычаць і плакаць. Немец паглядзеў на нас і нешта сказаў, а салдат, які стаяў побач, рассмяяўся, сказаў па-руску: «Господин врач говорит, чтобы не плакали, девочка все равно умрет, а так от нее хоть какая-нибудь польза будет». Потым праз дзень нас зноў павялі да доктара і зноў бралі кроў. У хуткасці Аня памерла. У нас усе рукі былі паколатыя. Кружылася галава. Кожны дзень паміралі хлопчыкі і дзяўчынкі.

На гэтым жа судзе людзі даведаліся, што ў Латвіі гітлераўцамі самым жорсткім чынам было знішчана больш як 40 тысяч савецкіх дзяцей. У Саласпілсе насільна бралі кроў у 12 тысяч дзяцей.

Толькі ў 1976 годзе ўбачыліся дзеці з роду Лемяшонкаў — і то не ўсе. Пра гэту сустрэчу пісалі ў газетах «Известия», «Вячэрні Мінск».

А зараз нагадаем яшчэ некалькі радкоў з названага вышэй артыкула Анны Саксэ:

«Вельмі бледны і схуднелы выглядае і Дзіма Саксон, у якога гітлераўскі ваенны ўрач браў кроў 15 разоў».

Гэта і ёсць той самы Дзіма Саксон з вёскі Крэўнікі. Удалося знайсці яго маці — Валянціну Аляксандраўну Мядзюту. Яна нам дапоўніць тых некалькі радкоў латышскай пісьменніцы:

— Зараз пералічу, колькі двароў было ў Крэўніках.— Яна лічыць у памяці, варушачы пальцам.— Ага, вось — 15! Ранкам 16 лютага ўскочыў сынок на парог і закрычаў: «Мама! Гарыць кругом!»

Кінуліся мы ўцякаць. У полымі, у страляніне мы ўсе пагубляліся. Сямёра жанчын без дзяцей аказаліся ў Лазоўскай пушчы. Аднойчы чуем з боку нашай вёскі страляніну. Мы — далей у лес. І раптам — наперарэз падымаецца засада. Вось і ўсё тут, думаем. Паб'юць? Не — адвялі ў Сар'ю. Дзве ночы трымалі ў Росіцкай школе, ноч — у касцёле. А ў Бігосаве нехта нам перадаў:

— Вашых дзяцей павезлі ўжо ў канцлагер...

Рада была імчацца за імі, абы толькі знайсці, прытуліць родную крывінку. Але ў Саласпілсе знайшла аднаго — Дзіму. Шэсць гадоў было хлопчыку. У лагеры нехта са сведкаў расказаў самае страшэннае: майго сына Вацлава, старэйшага, у Росіцы жывым спалілі. А яму ж нада было ісці ў 4-ты клас...

Пасля каранціну нядоўга прабыла ў Саласпілсе. Сілком аднялі ў мяне і Дзіму. Назаўтра павезлі ў Майданак. Мне ўжо ўсё роўна стала, што са мной будзе... Толькі маленькая надзея, што вярнуся калісьці да Дзімы, і трымала мяне. Дзіму знайшла пасля вайны ў Сігулдзе, у савецкім дзіцячым доме. Быў хворы. Прывезла дадому. Даглядала. Так і не ачуняў з вайны. Памёр ён у 1949 годзе.

У часопісе «Огонек» я ўжо бачыў маркотны воблік Дзімы сярод падобных на яго аднагодкаў. І вось Валянціна Аляксандраўна паказвае яшчэ адзін здымак, 1946 года. Такі ж засяроджаны тварык. Дзіма сядзіць з маці і трымае яе падарунак — гармонік. Праз тры гады гэты гармонік асірацее.

Асірацела і маці. Яе муж Саксон Андрэй Станіслававіч загінуў у 1943 годзе ў Майданаку. Так і вякуе жанчына ў нялёгкай адзіноце. Пад адным са здымкаў у згаданым нумары «Огонька» было напісана: «Ратаваныя дзеці адчуваюць клопат, ласку, увагу. Персанал дзіцячага дома робіць усё для таго, каб дзятва хутчэй забыла перажытае ёю. І, вядома, жыццё возьме сваё, залечыць іх раны. Але мы, старэйшыя, не павінны гэтага забываць, не павінны даравацць!»

Да сённяшняга дня не забыты маімі дарагімі асвейцамі жар Асвеі, жах Саласпілса... Пасляваенныя гады толькі прытупілі іх боль, не сцёршы з экрана памяці ніводнай пакутнай рыскі.

Іхніх дарог не вымераць, не змераць іхняга цярпення, чакання, пераможнай радасці. У вачах кожнага чалавека, з якім даводзілася

сустракацца,— бяздонныя нетры незнішчальнай волі, нязрушанай моцы...

Уяўляю: кінастужка нейкага фантастычнага фільма раскручваецца па зямлі і, нібы тая Дзвіна, выгібаецца і звіваецца па планеце... На экране памяці — сілуэты сэрцаў тысяч асвейцаў. Як метраном, як пульс — словы: «Мы не павінны... не павінны гэтага... забываць...»

Браніслава, паслухаем далей. Гэта пра цябе, пра вас...

Па шляху ў канцлагер людзі, у тым ліку і многія асвейцы, праходзілі ў гітлераўскіх засценках «ступені смерці». Першая — Рыжскае гестапа і СД па вуліцы Рэймерса. Рыжская цэнтральная турма была другой «ступенню смерці». Апошняя — канцлагер. На тэрыторыі Латвійскай ССР фашыстамі было створана 23 канцэнтрацыйныя лагеры, самым большым з якіх быў саласпілскі лагер смерці.

Будаўніцтва яго пачалося ў кастрычніку 1941 года, у 18 кіламетрах ад Рыгі ў балоцістай мясцовасці, плошчаю ў 30 з лішнім гектараў. Тут загінула больш як 100 тысяч чалавек. Яны былі з Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Бельгіі, Галандыі, СССР... Праз Саласпілс прайшлі палітвязнямі амаль усе забраныя ў партызанскай зоне асвейцы.

Як жа выглядаў саласпілскі лагер? Тэрыторыя былога стрэльбішча была абнесена плотам з калючага дроту. Вышыня яго — 3 метры. Наўкруг стаялі вышкі дзяжурных пастоў, дзе знаходзіліся кулямёты і пражэктары.

У кожным бараку трымалі па 350-900 чалавек пры норме 100-150. Унутры баракаў — чатырох-пяціярусныя нары.

Працавалі па 12 і больш гадзін у суткі. Пад'ём у пяць гадзін раніцы. Частка вязняў будавала чыгуначнае палатно, другая — працавала на тарфяніках.

Хто не мог працаваць, адпраўлялі ў амбулаторыю. Калі, па заключэнню ўрача, хворы не мог вытрымаць рэжым лагера, тады яго забівалі.

За любую правінку вязняў кідалі ў карцэр, білі гумавай дубінкай, пераводзілі ў штрафную групу, расстрэльвалі або вешалі.

На тэрыторыі лагера забаранялася перамяшчацца без паліцэйскага, курыць, размаўляць з другімі вязнямі, аказваць дапамогу другой асобе.

Фашысты і іх пасобнікі разбівалі вязняў на групы: «А», «Б», «Ц». Напрыклад, група «Ц» азначала «штрафнікі». Гэта група на грудзях павінна была насіць белы круг. Іх пасылалі на самую цяжкую работу, і працавала яна не менш 14 гадзін у суткі. Акрамя таго, яны мелі

зменшаную норму пайка. Асвейцы, як ужо гаварыў нам Мархель Савелій, жылі пераважна ў бараках, пазначаных літарай «Ц».

Хворых дзяцей адносілі ў бальніцу лагера, дзе іх купалі ў халоднай вадзе, ад чаго яны праз два-тры дні паміралі. Толькі такім чынам у лагеры на працягу аднаго года было знішчана больш чым 3000 дзяцей да пяцігадовага ўзросту.

Вось як пачынаўся адзін з самых звычайных чорных дзён Саласпілса. На высокіх мачтах развяваюцца два сцягі. Адзін — чырвоны з белым кружком і чорнай свастыкай усяродку, другі — чорны з дзвюма белымі літарамі «СС».

Староста лагера рапартуе каменданту лагера: — Гаспадзін камендант! У вашу адсутнасць у саласпілскім працоўным і выхаваўчым лагеры было ўсё ў парадку. На работах — 2360 чалавек, хворых — 212, у карцэры — 7, памерла — 38, з іх 36 дзяцей!

І гэта лічылася «ўсё ў парадку».

Мы ведаем імёны, хто змагаўся і гінуў за нашу свабоду, мы ўспамінаем імёны ахвяр, замучаных нямецка-фашысцкімі акупантамі. Варта згадаць, каб навекі праклясці іх, таксама імёны гэтых варвараў. У катаваннях вязняў Саласпілса ўдзельнічалі фашысты розных рангаў і іх памагатыя: Лангэ, Нікель, Краўзэ, Тэкельмейер, Бергер, Хэйрэр, Відуж, Тонэ, Сэліс, Качараўскі, Труцыс, Майзнер...

Вось што ўспамінае пра такіх мярзотнікаў сведка, былы вязень Саласпілса, латышскі мастак **Карліс Буш** у кнізе «В саласпилском лагере смерти»:

«Сярод іх не было ніводнага, чые рукі не былі б у чалавечай крыві. Каб ім лепш налаўчыцца ва ўсіх фашысцкіх зверствах, іх праз чатыры пяць тыдняў мянялі. Яны павінны былі пабыць усюды, дзе смерць праяўлялася ў самым страхотлівым выглядзе. Даўжэй заставаліся толькі гітлераўцы з асобымі выслугамі. Вырадак Лаўрыс арудаваў у лагеры ўжо пяты месяц. Ён заўсёды знаходзіў прычыну крычаць на вязняў і збіваць іх. Сваім калегам па зверствах ён любіў расказваць пра крывавыя оргіі ў Польшчы і на Беларусі, аб удзеле ў знішчэнні людзей у Бікернісках і Румбуле. Куляй ён карыстаўся толькі ў адносінах да асабліва моцных людзей, для слабых было дастаткова прыклада вінтоўкі, а дзяцей ён браў за ногі і забіваў аб дрэва... За сэканомленыя кулі яго заўсёды хваліла начальства».

Карліс Буш нарадзіўся ў 1912 годзе ў Рызе. Выхаванец дзяцячага дома. Працаваў малярам. Вывучаў графіку і жывапіс у Рыжскім народным універсітэце. З 1931 года — член Камуністычнага Саюза моладзі Латвіі, удзельнік рэвалюцыйнага падполля. У 1936 годзе трапляе ў турму за прыналежнасць да Камуністычнай партыі Латвіі.

Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў 1940 годзе К. Буш — старшыня прафсаюза работнікаў выяўленчага мастацтва, загадчык мастацкай рэдакцыі Латвійскага дзяржаўнага выдавецтва, дырэктар Музея выяўленчых мастацтваў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічае ў баях супраць гітлераўцаў, трапляе ў акружэнне. З рыжскай цэнтральнай турмы яго, палоннага, перавозяць у саласпілскі лагер.

Пасля вайны Карліс Буш стварыў серыю гравюр пра саласпілскі лагер смерці. Калі я быў яго госцем, ён перадаў мне некалькі сваіх работ, якімі ілюструецца гэта кніга.

Не магу прамінуць і яшчэ адно сведчанне, на гэты раз латышскага пісьменніка Міервалдыса Берзынь-Бірзэ, таксама былога вязня Саласпілса: «Ахова барака, як і канваіры на месцах работы, былі з латышскіх рот СД. У склад гэтых рот уваходзілі «хлопцы Арайса», якія прымалі ўдзел у карных экспедыцыях у Латгале, Беларусі, а таксама ў Заходняй Еўропе. Старажавая служба ў Саласпілсе і ў яго аддзяленнях для гэтых рот была свайго роду адпачынкам пасля здзейсненых на фронце «подзвігаў». «Хлопцы Арайса» — гэта была банда, якая складалася з айзсаргаў, панскіх сынкоў, нашчадкаў гандляроў і чыноўнікаў...»[17]

Ужо вядомы нам Экельн на судзе сказаў, што ў лагеры згодна з дырэктывамі Гітлера і Гімлера, праводзілася масавая стэрылізацыя жанчын і кастрацыя мужчын. Гэтыя варварскія меры праводзіліся з ведама і ўхвалы Экельна. Прычым кастрацыю і стэрылізацыю праводзілі не толькі на дарослых, але і на дзецях ад 8 да 15 гадоў. Той самы Экельн прызнаўся, што ў саласпілскім лагеры на поўную магутнасць «працавалі» тры «душагубкі». Пра вопыты з аўтамабілямі, якія душаць людзей адпрацаванымі газамі, ён дакладваў асабіста Гімлеру[18].

Былы вязень Саласпілса Я. Каўліньш сведчыць, што ў лагеры практыкаваліся самыя зверскія метады знішчэння арыштаваных. Асабліва распаўсюджаным быў метад «дэзінфекцыі» баракаў. Звычайна вязняў выганялі на дождж ці сцюжу, а праз некаторы час зноў заганялі ў баракі, напоўненыя атрутным газам. У выніку многія вязні пакутна паміралі. Аднойчы пры такой «дэзінфекцыі» было атручана газам каля 300 малалетак[19].

Той жа Я. Каўліньп яшчэ ў 1946 годзе расказваў на судзе над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, што ў лагеры ад найбольш зда-

---

[17] В саласпилском лагере смерти. Сборник воспоминаний. Рига, 1964, с. 289.
[18] Судебный процесс..., с. 66.
[19] Судебный процесс..., с. 73.

ровых людзей бралі па 800 кубікаў крыві запар. І яшчэ: «...аднойчы ўсе дзяўчаты ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў былі распрануты і пастроены каля баракаў перад германскімі афіцэрамі, якія прыехалі з Рыгі, на шыю кожнай дзяўчыны гітлераўцы павесілі бірку з нумарам. У той жа дзень іх пагрузілі ў машыны і адправілі ў дамы цярпімасці».

З паказанняў палітвязня Эвеліны Вібы пра Саласпілс: «У лагеры ў мацярок адбіралі дзяцей, пачынаючы ад немаўляці да 14 гадоў, і змяшчалі ў спецыяльны барак, у якім яны і паміралі. Толькі ў сакавіку 1942 года памерла 500 дзяцей, іх закапалі на могілках недалёка ад лагера».

Чытаючы сотні старонак дакументаў пра Саласпілс, я напаткаў вельмі важнае сведчанне былога вязня гэтага канцлагера Лідзіі Лігер:

«Тым, хто сёння запытаецца: «Як вы засталіся ў жывых?», хачу адказаць: «Няма больш надзейнай падтрымкі, чым плячо сябра. У час пададзеная рука сябра, бывае, робіць тое, што называецца дзівам»[20].

Вось пра адно такое ратоўнае дзіва і хочацца расказачь.

Сярод саласпілскіх вязняў быў латыш Мікеліс Страздынь, якому пашчасціла вырвацца на волю. У хуткасці ад яго з Рыгі сталі прыходзіць пасылкі з ядой.

У адной з пасылак быў сюрпрыз. У булцы хлеба сябар Страздыня, беларус Сяргей Грашанік, знайшоў газету. Гэта было выданне аднаго са злучэнняў беларускіх партызан. «У нашых руках была газета, якая расказвала пра перамогі савецкага народа,— успамінаў пазней Павел Каршуноў-Сапожнікаў[21].— Газета пераходзіла з рук у рукі. За некалькі дзён яна абышла ўвесь лагер і зрабіла сваю справу. Газета падымала настрой і баявы дух вязняў, заклікала да барацьбы і поўніла надзеяй на хуткае вызваленне. Нібы свежы вецер уварваўся ў лагер — у ім з'явілася небывала» актыўнасць, выспявала магутная сіла, гатовая вырвацца вонкі».

Але і вораг быў заўсёды напагатове, каб душыць у вязняў імкненне да свабоды, да супраціўлення. Прыгадаю толькі адну падзею.

У сакавіку 1943 года рэйхскамісару Лозэ паведамлялася: «У працоўным і выхаваўчым лагеры ў Саласпілсе... удалося напасці на след адной з камуністычных арганізадый і ліквідаваць яе. У лагеры сярод змоўшчыкаў былі створаны тры групы. Адна займалася камуністычнай прапагандай сярод вязняў, другая — падрыхтоўкай уцёкаў і трэцяя — кражай узрыўчаткі... Падбухторшчыкі расстраляны»[22].

---

[20] В саласпилском лагере смерти, с. 257.
[21] В саласпилском лагере смерти, с. 215.
[22] В саласпилском лагере смерти, с. 33.

Гэта былі камуністы К. Фелдманіс, Я. Логін, К. Стрэльчык.

Мяне зацікавіў іх лёс. І вось чытаю дакументальную аповесць Георгія Міронава «Паданне пра Фелдманіса» — кіраўніка антыфашысцкага падполля ў оаласпілскім канцлагеры Карліса Фелдманіса, пра яго памочнікаў і аднадумцаў — рабочых Канстанціна Стрэльчыка і Яніса Карандзея, селяніна Язэпа Канепа, паэта і журналіста Яніса Логіна, мастака Карліса Буша... Разам з імі змагаліся настаўнікі Эйжэн Вэверыс і Херберт Крумінын, палонныя савецкія афіцэры Іван Шалаеў і Міхаіл Зяленскі, сотні другіх патрыётаў, вядомых і невядомых.

Вось некалькі радкоў з аповесці: « ...Шарэнга смяротнікаў гнеўна гула. Некалькі галасоў пачало «Інтэрнацыянал».

Песню падхапілі ўсе сто трыццаць пяць чалавек. Спявалі на рускай, латышскай, украінскай, польскай, нямецкай, беларускай, яўрэйскай, цыганскай мовах».

Услухайцеся! Непераможны напеў «Інтэрнацыянала» хоць і абарвалі аўтаматныя чэргі гнюсных забойцаў, але не заглушылі — ён гучыць і сёння. І ў тым барацьбітным напеве — смелы і гнеўны голас маіх землякоў. Рэха нязломнага гімна калышацца ў затоках Даўгавы, лунае над вірамі Дзвіны, даносячы той перадсмяротны спеў на Асвейшчыну.

Я ўжо згадваў, што Саласпілсу папярэднічала рыясская цэнтральная турма, якую фашысты называлі другой «ступенню смерці». Праз яе таксама прайшлі многія асвейцы.

Якой была рыжская цэнтральная турма, расказвае ўцалелы А. Ліедэ:

— У турме быў уведзены галодны рэжым: многія месяцы толькі 200 г хлеба ў дзень, а на абед зваранае ў пустой вадзе бацьвінне, ад чаго пачыналася крываўка. Вязні надзвычай худнелі і масамі паміралі. Вясной 1942 года прыкладна з 4 тысяч вязняў памірала 30— 40 чалавек у дзень.

У агульных камерах корпуса, разлічаных прыблізна на 20 чалавек, было па 60—70 і больш. Вязні спалі на халоднай цэментнай падлозе. Тараканы, клапы і вошы развяліся ў фантастычных памерах. Эпідэмія тыфу, якая пачалася ў студзені 1942 года, забрала многа жыццяў...

Да 1943 года па прыблізнаму падліку,— як сведчыў **А. Ліедэ**,— лік вязняў, вывезеных з рыжскай цэнтральнай турмы на расстрэл, перавышаў 10 тысяч.

Паказанні былога палітвязня Я. Вэйдэ Надзвычайнай Дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-

фашысцкіх захопнікаў і іх прыспешнікаў у Латвійскай ССР сведчаць, што «у турме была арганізавана асобая каманда мучыцеляў, якія з закасанамі рукавамі і «чорным нутром» спяшаліся туды, куды іх на дапамогу выклікалі электрычным званком...». Вельмі часта людзей пасля допытаў выкідвалі без прытомнасці, часта — мёртвымі. Сцены ў гэтых пакоях былі, як у бойні, заліты крывёю.

Каб больш поўным было наша ўяўленне, прывяду яшчэ некалькі сведчанняў тых, хто быў у фашысцкім пекле.

Карліс Буш: «Гэта быў час, калі на нашай Радзіме ў гітлераўскіх банд зямля ўжо гарэла пад нагамі... З Беларусі сталі прыбываць эталоны з жанчынамі, дзецьмі, старымі. Прывозілі тысячы людзей, сарціравалі, труцілі, забівалі. Састаў пахавальнай каманды павялічыўся...»

Яніс Клявінь: «Нас прывезлі ў другі барак. Першы збіраліся дэзінфіцыраваць. Газ у барак пускалі праз вентыляцыйныя шчыліны. Мы заглянулі ў акно і засталіся стаяць, застылыя ад здзіўлення. Уся падлога барака, нібы пакрытая кілімам, калыхалася. І толькі ўважлівей прыгледзеўшыся, мы прыкмецілі, што гэта блохі. Мільёны блох кішэлі на падлозе пустота барака...»

Яніс Кроніціс: «З крыкам эсэсаўцы[23] выстройвалі атарапелых лгодзей перад будынкам камендатуры. Яны былі з Беларусі. Гітлераўцы прыгналі іх з раёнаў, дзе дзейнічалі савецкія партызаны. Каля будынка камендатуры на высокіх мачтах развяваліся сцягі на халодным асеннім ветры...

У канцы шарэнгі стаяла маленькая светлавалосая дзяўчынка з блакітнымі вачамі... Даведаўся, што сінявочцы пяць гадоў, бацькоў у яе няма, а тут яна разам з бабуляй і брацікам, што ёй вельмі хочацца есці, але апошнюю скібачку хлеба яна яшчэ ўчора з'ела, а больш нічога няма...

Таня, так звалі дзяўчынку, не вытрымала пакут. Знясіленая, яна памерла ў канцлагеры».

І вось чытаю апошнія абзацы ўспамінаў Я. Кроніціса: «...Праз санітара барака мне ўдалося дабіцца, каб і мяне паслалі пахаваць нядаўна памёршых дзяцей. Таня стала лёгкай, як былінка. Пад аховай

---

[23] СС — скарочана ад «шутцштафэльн» — ахоўныя атрады. Спецыяльна падабраныя тэрарыстычныя банды нацысцкай партыі. Створаны ў 1925 г. як ахова фюрэра, у 1934 г. атрымалі статус самастойнай аргапізацыі. Ваенныя атрады СС у 1940 г. былі рэарганізавайы ў «войскі СС». Эеэсаўцы былі галоўнымі выка- наўцамі злачышных планаў надыстаў і тварылі нечуваныя зладзействы як у самой Германіі, так і ў акупіраваных краінах. На Нюрнбергскім працэсе СС аб'яўлены злачыннай арганізацыяй, але, нягледзячы на гэта, у ФРГ спрабуюць рэабілітаваць эсэсаўцаў. У 1961 г. бундэстаг нават прыняў закон аб пенсійным забеспячэнні былых чыноў СС.

мы разам з другімі шасцю маленькімі трупікамі вынеслі беларускую дзяўчынку праз вялізныя вароты лагера, у якія яна, учапіўшыся за спадніцу бабулі, увайшла некалькі месяцаў назад».

Ніводнага слова тут не дададзена да таго, што сказана людзьмі, што сведчаць дакументы. Ды і ці можна дадаць да позірку Асвеі — слязінкі, да ўздыху Сар'і — тугі?

Усяго было — удосталь. І як сказала мне ў Рызе ўраджэнка Асвейшчыны **Ганна Фёдараўна Шандар**, якая прайшла праз вайну разам са сваімі пяццю дзецьмі: «Матчына сэрца ніколі не гасне!» Так, матчына сэрца ніколі не гасне, як не гасне ніводнае імгненне з тых векапомных гадоў, асвятляючы нам першародныя вытокі любові, мужнасці, незнішчальнай сілы жыцця.

## СІЛА МАЦЯРЫНСКАЯ

*Нас не зрушыў чорны ледавік!*
*Зноў краіна песнямі засеяна:*
*пад карэнне вораг не пранік.*
*І бярозу свеціць сакавік,*
*І зямля надзеямі заселена.*

### Частка першая

— Слаўная старажытная Рыга,— гаворыць Броня,— за гэтыя гады стала для мяне роднай. Паслухай, што табе раскажу...

Яшчэ ў 1201 годзе былі накрэслены на пергаменце першыя радкі «вечнага міру» між гэтым горадам і маёй Полацкай зямлёй. Мы здаўна жылі ў добрасуседстве. Па сёння ў канцэртнай зале рыжскай філармоніі ў былой Мюнцэрскай зале Вялікай гільдыі сярод гербаў гарадоў свету, з якімі гандлявала Рыга, ёсць такі знак: над трызубай каронаю надпіс «Контора в Полоцке», а пад каронай прыгожа акрэсленая лацінская літара Р. Сам скарынінскі род меў цесныя гандлёвыя справы з Рыгай. Лука Скарына меў свае «канторы» ў Вільні і Рызе. А родзіч Францыска Скарыны Раман служыў у Рызе. Там для купцоў з уеходу быў адбудаваны Рускі двор. Ад царквы Якуба з XIII стагоддзя забудоўваўся так званы Рускі канец, дзе аж да 1580 года знаходзіліся праваслаўныя царква Міколы, багадзельня, бальніца, могілкі, канвент (купецкая гільдыя), склады, будынкі для жылля. Для ўстаноў патрабавалася вялікая колькасць абслугі, і многа палачан месціліся ў Рызе...

Так цікава расказвала мне Браніслава...

Рускі двор, Рускі канец, вуліца Руская ў Рызе, Руская рака ў Рыжскім раёне, Руская гара ў Курзэмэ... Цікавае першапачатковае значэнне слова «рускія». Па-латышску гэта тлумачыцца так: крієві. Такое абазначэннне ўвайшло ў латышскую мову з латгальскага наймення «крывічы». Спачатку латышы крэвамі называлі непасрэдна крывічоў, палачан, потым усіх усходніх славян, а потым толькі рускіх, а беларусаў сталі называць балткрэвамі...

Яшчэ раз углядаюся ў карту нашай краіны. Быццам зялёны ліеток на ёй — Беларусь. Здаўна і назаўсёды Савецкая Беларусь у вянку шчырага добрасуседства.

Цяпер ужо я расказваю Бранісілаве пра наша савецкае пабрацімства, пра гісторыю ўзаемасувязей Беларусі і яе паўночнай суседкі — Латвіі. Як пачаць гаворку пра вытокі спараднення гэтых двух народаў? Мо сягнуць аж у васьмісотгадовую гістарычную глыбіню,

калі ўсталёўваліся першыя, як сказалі б сёння, дыпламатычныя сувязі між Полацкам і Рыгай? Мо нагадаць, што першыя элементы маёй роднай мовы зафіксаваны якраз у тых дагаворных граматах? Мо ўспомніць, як самаахвярна змагаліся нашы продкі разам з продкамі латышоў супроць крыжацкага нашэсця, як бараніўся легендарны палачанін «кароль» Вячка, утрымацель умацаванага Кукейноса (Кокнэсэ)?

А лепні дамовімся, Броня, так. Хай промні латышска-беларускіх сувязей збяруцца ў адной расінды: буду пісаць пра Латвію, якую ўдалося ўгледзець мне, буду пісаць толькі пра тыя шляхі, якімі сам ішоў і дайшоў да Латвіі. А скарыстаю для гэтага толькі адно права — права роднасці з латышскай зямлёй. Паясняю сказанае наступным фактам: беларусы ў Латвіі складаюць 4,5 працэнта ўсяго насельніцтва рэспублікі. І сярод гэтых жыхароў даўно ўжо ўкараніліся і мае бацькі, і многія мае родзічы. Рыга, стольны горад латышоў, стаў сталіцай майго дзяцінства, шчымлівай прывабай юнацтва, натхнёным памкненнем дня сённяшняга...

Рыга... Мой першы ў жыцці горад. Калісьці я знаёміўся з Рыгай так: з раніцы адпраўляўся па адной якой-небудзь вуліцы. Яе хапала на дзень экскурсіі. Але і сёння Рыга для мяне — незнаёмка. Горад, які любіш, нанова адкрываеш з кожнай чарговай сустрэчай.

І я сёння ўсклікаю: «Лабдыен, скайста мэйтэнэ Рыга! Дабрыдзень, прыгожая дзяўчына Рыга! Не ў госці да цябе, а нібы дадому прыязджаю штораз. Прымі паклон, наталі сваёй непаўторнай прыгажосцю».

У свой ча.с я даведаўся, што з Рыгай свята спалучана імя Уладзіміра Ільіча Леніна. На мемарыяльнай дошцы на вакзале можна прачытаць, што ўпершыню Ленін наведаў Рыгу ў 1900 годзе. Пра ўсё, што датычыцца тэмы: «Ленін і Рыга», можна даведацца ў музеі Уладзіміра Ільіча, а таксама ў мемарыяльнай кватэры-музеі.

Сталіца, узнагароджаная ордэнам Леніна, падтрымлівае сяброўскія сувязі і супрацоўнічае з Талінам, Вільнюсам, Мінскам, Тбілісі і іншымі гарадамі СССР. Ёсць у яе і гарады-пабрацімы: Росток, Шчэцін, Русэ...

У назвах адміністрацыйных цэнтраў Рыгі — уся рэвалюцыйная гісторыя першай паловы XX стагоддзя: Пралетарскі, Кастрычніцкі, Ленінскі, Маскоўскі, Кіраўскі... Калі Старая Рыга (Вэцрыга) — гэта своеасаблівы горад-музей (Домскі сабор, царква Пятра, Рыжскі замак, Парахавая вежа...), то новыя мікраараёны Югла, Кенгаракс, Пурвцыемс, Іманта — сучасныя жылыя масівы. У Беларусі добра ведаюць прадукцыю самых буйных прадпрыемстваў Рыгі — заводаў ВЭФ, РЭЗ, вагонабудаўнічага, аб'яднання «Радыётэхніка» і іншых.

З Рыгай звязаны жыццё і дзейнасць многіх відных дзеячаў латышскай і савецкай культуры. Тут, да прыкладу, нарадзіліся пісьменнік і дзяржаўны дзеяч В. Лаціс, піянер ракетабудавання Ф. Цандэр, скульптар В. Мухіна, кінарэжысёр С. Эйзенштэйн.

У свой час Латвію наведалі Арцём Вярыга-Дарэўскі, Карусь Каганец, Сяргей Палуян, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі... У Рызе на каморніка вучыўся Ігнат Буйніцкі. Каля Даўгаўпілса, былога Дзвінска, нарадзіўся Еўсцігней Міровіч. У 1941 годзе ў Рыгу на Першы з'езд пісьменнікаў Савецкай Латвіі прыязджалі Янка Купала, Міхась Лынькоў і Пятрусь Броўка.

Мая Міёршчына трыма рачулкамі злучаецца са стрыжнем Заходняй Дзвіны: Дзісной, Волтай, Мёрыцай. І толькі перад Друяй невялікім ускрайкам берага глядзіць на латышскія задзвінскія пожні. А ў Міёрскім раёне ёсць вёсачка Бабышкі. Адтуль у дзяцінстве пачалася мая першая дарога ў бок Латвіі, пакуль што несвядомая, а можа, і проста выпадковая. За дзве вярсты ад Бабышак стаіць вялікае сяло Латышы. Якраз у гэтыя Латышы я хадзіў вучыцца з першага па чацвёрты клас. Хадзіў (не ведаючы да нядаўняга часу) старажытнай дарогай, пракладзенай у бок Друі, Дзвінска. Ды і адкуль мне было тады ўведаць, якія словы ў сваю калыханку збірала бабулька Альжбета:

Люлі, люлі, люлі,
прыляцелі гулі...

Цяпер варта паглядзець у слоўнік латышскай мовы, каб даведаца, што «гуля» — гэта «спячка». Відаць, ад былых заснавальнікаў Латышоў прыляцелі гуліспячкі. Спрадвечнае добрасуседства спарадзіла ў беларускай і латышскай мовах многа агульных слоў, і не толькі тыпу «пуня» — з рэалій сялянскага жыцця. Латышскі паэт Андрыс Веян, які родам з Латгале, нагадаў адно цікавае слова: сусед у іх — сабрыс. Адсюль недалёка і да беларускага «сябра», які, каб стаць шчырым дружбаком, вядома ж, павінен напачатку быць добрым суседам.

Як жа да сяброў-суседзяў пачыналася яшчэ адна мая дарога? Пасля маленькай рачулкі Волты, калі маці прывяла мяне да ракі ў мястэчку Лявонпаль, Дзвіна паказалася непераадольнай магутнай плынню. Такой «тоўстай» вады мне яшчэ не даводзілася бачыць. Вось гэтай Дзвіной-працаўніцай і былі пяднаны мае землякі з Латвіяй, з Рыгай. Не ўсе, а самыя смялейшыя. Каля Лявонпаля былі румы, і тут плыцілі ганкі, дзе корнікі (яны вялі караваны плытоў) набіралі сабе малайцоў (памочнікаў, якія на дрыгалцы стаялі, ганок на быстрак выводзілі). Ад іх засталіся апавяданні пра далёкую і нялёгкую дарогу, пра Рыгу, якая стаіць пры рыгве Дзвіны (месцы ўпадання ў мора). З

гэтымі ганкамі, гэтымі плытагонамі (чырвоныя кашулі, палатняныя штаны — іх «прафесійная» форма) звязана многа падзей. Згадаю толькі два моманты.

Народны пісьменнік Латвіі Андрэй Упіт выказаў аднойчы цікавае прызнанне адносна свайго паходжання. Далей цытую артыкул Мірдзы Абалы: «Латышскі пісьменнік сам лічыў, што адзін з яго продкаў, Грышка (памёр у 1747 годзе), быў беларус, які ажаніўся з латышкай. А. Упіт піша: «Велічная Даўгава заўсёды захапляла ўсіх жыхароў воласці ўздоўж берагоў, і асабліва ўвесну, калі рака, як толькі сыдзе лёд, напаўнялася караванамі плытоў і стругоў з зернем, ільном, ільняным семем і пянькой. Некаторыя плытнікі і стругаўшчыкі былі латышамі. Але большасць, асабліва плытнікі, гнала ганкі з бяскрайніх лясоў Беларусь І часта атрымлівалася так, што адзін з двух рулявых называўся Грышкам. Вось, як мне здаецца, адкуль паходзіць той Грышка, які аказаўся ў Вектэранах каля Айзкраўкля».

І яшчэ адна згадка пра плытагонаў, паяднаная ўжо з імем народнага паэта Латвіі, вялікага сябра Беларусі Яніса Райніса. Спачатку некалькі слоў самога Райніса, сказаных ім у Мінску ў 1926 годзе: «Я сам паходжу з Латгале, з таго краю, дзе жыве многа беларусаў. Мяне з беларусамі яднае дружба». Нядаўна я наведаў радзіму Райніса. Там, у раёне Ілукстэ, ёсць хутар Варславаны, дзе бацька паэта Крыш'ян Плiекшан арандаваў двор. На беразе рэчкі Эглоны вялізным глыжом пазначана мясціна, дзе калісьці стаяла лазня. У лазні, паводле старадаўніх звычаяў, і нарадзіла Дарта Пліекшан свайго сына. Назней сям'я пераехала ў Тадэнаву, а яшчэ пазней — у Рандэнэ, у маёнтак, які стаяў амаль што насупраць Даўгаўпілса.

У сям'і Пліекшанаў жыў начны вартаўнік Нядзвецкі — задумлівы, трохі пахмурны, не кідкі на размовы дзядзька. Ён служыў за хлеб і быў выхаваўцам мал ога Жаныня (так звалі Яна ў сям'і).

Вось якраз гэты Нядзвецкі, беларус паходжаннем, меў уражлівую, паэтычную душу. Часта дзядзька браў Жаныня з сабой на бераг Дзвіны-Даўгавы, дзе плытагоны-беларусы, прыстаўшы на кароткі адпачынак ці начлег,ігралі на дудах, спявалі свае песні, баялі байкі. Развярэдзіўшы душу, дзядзька Нядзвецкі вяртаўся з Жанынем дадому і ўсё не мог супакоіцца, трызніў роднымі мелодыямі. За чатыры гады да смерці Райніс у вершаванай аўтабіяграфіі «Сонечныя гады» так будзе прыпамінаць тую пару:

Зноў праз ноч спяваў Нядзвецкі
сумна, як асенні вецер.
Так спазнаў я, што на свеце
не для ўсіх і сонца свеціць,

не для ўсіх смяецца.

Безумоўна, той дзядзька Нядзвецкі ўздзейнічаў на выяўленне паэтычных уражанняў будучага пісьменніка. Нездарма пазней паэт пісаў: «...і да літоўскіх песень, і да прасякнутых смуткам мелодый беларусаў я прыслухоўваўся з пяці гадоў майго жыцця аж да пятнаццаці».

Як і ў Вязынцы, вісіць у райнісаўскім доме зыбка. Янка з Вязынкі сустрэў Яна з Варславан толькі ў 1926 годзе. І сябраваць двум Янам вечна, і будуць вісець іх зыбкі, уекалыхваючы ўсё новыя і новыя песні двух народаў-суседзяў, народаў-дружбакоў.

З радзімай Райніса Латгале найбольш зраслася мая полацкая зямля. Да 1920 года частка Дзвінскага, Рэжыцкага, Люцынскага паветаў уваходзіла ў Віцебскую губерню. І не было нічога дзіўнага, што каля 76 тысяч чалавек пры чарговым перапісе ў Латвіі назвал! сябе беларусамі. Споўнілася 60 гадоў з дня першай пастаноўкі ў Латвіі несмяротнай купалаўскай «Паўлінкі». А дачыніліся да гэтай падзеі, акрамя Райніса, Паўліна Мядзёлка і яе гадаванцы — навучэнцы Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі. Зараз у кожным томе «Беларускай народнай творчасці» — серыі, што выдае АН БССР, змяшчаюцца сярод іншых і фальклорныя запісы былога дырэктара гэтай гімназіі — Сяргея Сахарава, дзякуючы якому захавана багатая культурная спадчына беларусаў у Латвіі. Сам жа С. Сахараў прызнаваўся, што натхніў яго на навуковае збіральніцтва зноў жа Райніс, які да апошніх гадоў жыцця летуценіў напісаць фальклорную драму «Беларусь». Райніс перад смерцю паспеў стварыць у буржуазнай Латвіі (што было не так лёгка) «Таварыства культурнай сувязі з народам! Савецкага Саюза». Як сёння хораша высвечваюцца на скрыжалях дружбы савецкіх народаў райнісаўскія словы, сказаныя ім 3 чэрвеня 1929 года на сходзе па абвяшчэнню Таварыства: «З гэтага дня мы пачынаем збліжэнне з Усходам, з народамі Усходу. Два вялікія народы, з якімі мы хочам збліжаць сваю культуру, гэта беларусы і велікарусы...»

Традыцыі добрасуседства яшчэ больш умацаваліся з усталяваннем Савецкай улады ў Латвіі. На зямлю Яніса Райніса прыехаў Янка Купала... Але чорныя хмары вайны ўжо навіслі над Прыбалтыкай. І ўжо цягнік, на якім вяртаўся Купала з Рыгі ў чэрвені 1941 года, быў абстраляны фашысцкай авіяцыяй. Напад гітлераўскай саранчы на некаторы час перапыніў культурныя і працоўныя зносіны латышоў і беларусаў. Затое іменна Асвейшчына ў час Вялікай Айчыннай паказала, як гартуецца баявое адзінства патрыётаў нашай Радзімы,

як мацуецца інтэрнацыянальная еднасць, куецца адна на ўсіх Перамога.

А зараз нагадаю яшчэ адну маю дарогу ў Латвію. У тую зіму, калі мне не было яшчэ і года, за Дзвіною, як расказвала потым маці, кожную ноч палымнела неба. Гэта было неба змагарнай Асвеі. Куды ж ішлі шляхі людзей, якім не ўдалося сысці пад партызанскую ахову? Чытаю радкі латышскага пісьменніка Міервалдыса Берзынь-Бірзэ, былога вязня саласпілскага канцлагера: «Шлях да Саласпілскага мемарыяла кароткі, але няма ў Латвіі іншай дарогі, па якой насустрач сваёй гібелі прайшло б столькі людзей... Прайшлі гэтай дарогай тысячы беларускіх жанчын, дзяцей і старых... Іх смерцю хацелі супыніць тых, хто са зброяй у руках уздымаўся на барацьбу супроць захопнікаў».

На дарогу асвейцаў ступіў у свой час і я. Слухаў і запісваў, што мне гаварылі ў Латвіі.

Сёння на кожнай рыжскай вуліцы можна сустрэць маіх землякоў, і лёс амаль кожнай сям'і звязаны з Саласпілсам. Вось што мне паведамілі «беларускія рыжане».

Вуліца М. Горкага, **Лісоўскі Франц Іосіфавіч** з вёскі Масіва:

— Кожны дзень катавалі людзей у нашым бараку. Было чутна, як стагналі людзі за занавескай і сварыліся каты. Асабліва збівалі мужчын, некаторыя з іх на другі ж дзень паміралі. Ляжыць на нарах — як быццам спіць, а ўжо мёртвы.

Над асобнымі жанчынамі здзекаваліся інакш. Іх аднекуль прыносілі на насілках і скідвалі на нары.

У нас бралі кроў, але калі пачалі мы хварэць, перасталі. Потым акупанты аддалі мяне працаваць на хутар. Пры падыходзе нашай арміі мяне жандары адвезлі ў Рыгу, каб параходам адправіць у Германію. З порта я ўцёк, хаваўся ў падвалах, пакуль не выбраўся з Рыгі ў лес, дзе дачакаўся прыходу нашых.

А маму замучылі ў Германіі. Пасля вайны ўдалося знайсці сястру Ніну: яна помніла сваё прозвішча і ведала, дзе жыла да вайны. А вось малодшага брата мы знайшлі на 23 годзе пасля Перамогі.

Сястры і мне асабліва вучыцца не давялося: вайна адняла ў нас маму і тату, і нам з ёю трэба было думаць, як пракармідца, як апранущца, бо родных і блізкіх таксама не было...

Вуліца Дайнас, **Валадзёнак Сямён Сцяпанавіч** з вёскі Ярохі:

— З Асвеі нас гналі на станцыю Зілупэ. Канваіры крычалі: «Мы вас усіх прыкончым!» І сапраўды, пастараліся фашысты: з усёй маёй вялікай радні — чалавек 20 — я толькі з сястрой Аняй застаўся.

Вагоны былі набіты так, што двое сутак ехалі стоячы. Свае надабнасці людзі рабілі пад сябе...

Памятаю, як праходзіла ў бараку нейкая дзіўная камісія. Мы сядзелі голыя ў адным канцы барака, а ў другім канцы афіцэры аглядалі маладых дзяўчат. Нават праз павелічальнае шкло на іх з усіх бакоў глядзелі. Каторая прываблівала іх, адразу ж апраналі яе ў шаўковае плацце. Потым, як паведаміў старшы барака, а ім быў палітзняволены латыш, дзяўчат адправілі на пакуты, на здзекі гітлераўскай салдатні.

Вуліца Апшу, **Рудзіш (Варша) Марыя Альфонсаўна** з Росіцы:

— Для мяне Саласпілс — гэта аўчаркі, баракі без столі, страх.

Я ўратавалася ад вернай гібелі, бо разам з братам Дамінікам трапіла на хутар над Кегумс. Старэйшую сястру Ганну вывезлі ў Германію. Расказвала, што фашысцкія войскі, адступаючы, гналі калоны вязняў пасярод сваіх калон, каб іх не бамбілі зверху. Зараз сястра жыве на Югле, брат таксама рыжанін...

Вуліца Крыш'яна Барона, **Самусёнак Аліна Іванаўна** з вёскі Слабодка:

— У Саласпілс мяне і маю сястру Веру прывезлі разам з мамай, Елізаветай Сямёнаўнай. Прыблізна праз дзесяць дзён ад благога харчу і антысанітарыі пачаліся ў лагеры хваробы, нас мучылі вошы і другія паразіты.

Аднойчы пасля пакутнай лазні тыя вылюдкі пачалі ў мужчын, жанчын, дзяцей састрыгаць валасы, потым змазваць маззю і газай скуру на галаве. А яшчэ праз некалькі дзён пачалася рэгістрацыя. Немец запісваў даныя кожнага чалавека на бірцы і нумараваў нас. Калі бацькоў выгналі з баракаў, нас пачалі дзяліць. У першую трупу трапілі дзеці ад 1 года да 5-6, у другую — ад 7 да 12-13 гадоў. Мы пасля трапілі ў другую групу.

Потым пачаўся адбор па знешніх якасцях. Асобна пакідалі дзяцей, якія мелі нейкія знакі на скуры, барадаўкі, розныя драпіны... Толькі са здаровых дзяцей фашысты бралі кроў. Што з імі было потым, мы не ведаем. Пасля вайны мы дазналіся, што дзяцей-донараў з нашай вёскі ў жывых не аказалася.

А мы трапілі на хутар. Вось чаму і выжылі. І калі мама вярнулася з Равенсбрука, яна ўясо ведала наш адрас, бо мы самі напісалі на радзіму.

Мама прыехала да нас, і мы не разлучаліся з ёю аж да яе смерці ў 1957 годзе...

Зараз мы не толькі самі маем свае сем'і, але і нашы дзеці даўно сталі дарослымі. Хацелася б толькі аднаго, каб яны не зведалі тых

жахаў, якія прынёс гітлераўскі фашызм нашаму пакаленню, нашаму народу...

Вуліца Рупніцас, **Уселенак Антаніна А нтонаўна** з вёскі Немцы:

— Тут жыву з 1948 года, калі да дзяцей прыехала. У тым сорак трэцім годзе, калі ішла фашысцкая навала, у мяне дома шасцёра дзяцей было. Не магу ўспамінаць, што было ў той дзень... Толькі што просіце... Спалілі вёску. Жывых у гурт збіраюць. І во ўжо гоняць. Сыночку старэйшаму чатырнаццаць гадоў было. Мо ён і памкнуўся ўцячы... застрэлілі. За партызана палічылі. На дарозе застаўся ляжаць. Кінулася я да яго... Прыкладам у спіну палучыла. Астатніх дзетак са мною разам у Саласпілс адправілі. Там нас і разлучылі. Бо дзеці, па фашысцкаму закону, мне перашкаджалі. Вось і аднялі сілком ад мяне дзяцей. Усіх. З Рэняй больш і не ўбачыліся. Даведалася потым, што яе ў прытулку тыя людаеды атруцілі. На мае шчасце, астатніх ўратавалі ад смерці рускія і латышы. Выкупілі, выбралі, вырвалі з рук катаў. Пасля вяртання з Нямеччыны доўга шукала дзетак — і знайшла. Віцю ў пасёлку Ікшкіле Граўбэ Дамінік гадаваў. Лёню майго Духальская Ірына ўсынавіла. Жэня і Пеця знайшліся на хутары Янукі. Як можна не дзякаваць добрым людзям у Латвіі за такое шчасце — бачыць сваіх дзяцей? Лёшка, праўда, няма ўжо. Яго пасля вайны вайна дагнала...

Што яшчэ больш за ўсё запомнілася? Як нас праз Берлін гналі. Горад гарыць, а я са зламанай нагой кавыляю ў калоне. ПІэсць сутак — не піўшы, не еўшы — у Равенсбрук нас пераганялі. Ішла, бо ўпасці баялася: адразу ж застрэляць.

Перажыла нявіданыя жахі. Як той Берлін, гарыць мая дарога. І па сёння тыя гарачыя камяні пякуць ногі. Так у сабе і трымаю тое полымя... Трэба было б даўно памерці, а жыву... І за сябе і за дзяцей — жыву.

Вуліца Патверсмэс, **Урублеўская Ксенія Міхайлаўна** — прыёмная маці Скрыпкі Васіля з вёскі Дуброва:

— Васіль нарадзіўся на Асвейшчыне за тры месяцы да пачатку вайны. У адной з урнаў на могільніку спаленых вёсак у Хатыні ёсць і пыліны праху яго блізкіх, і попел бацькоўскай хаты...

Па разліках карнікаў, маленькі Васіль са сваёй маці Марыяй Варфаламееўнай не павінен быў жыць.

У Саласпілсе многія равеснікі Васіля былі атручаны. Ратавала Васіля тое, што ён у гэты час знаходзіўся ў ізалятары. Невядома, колькі яшчэ выпрабаванняў трэба было вытрымаць трохгадовай малечы, калі б у Рызе на манастырскім падворку (а туды на грузавіках вывозілі з Саласнілса дзяцей, якія дажывалі свае дні) на

яго не зірнула сардэчная жанчына — Ксенія Міхайлаўна. Што яна ведала пра яго? Толькі тое, што на шыі хлопчыка вісела бірка: «Скрыпка Васіль. 1941 г.». Разам са сваімі дзецьмі Лёнікам і Стэфай сагрэла Урублеўская душу змучанай істоты, вярнула яму жыццё, любоў матчыну.

Пасля вайны з Майданака вярнулася ў абвугленую Асвейшчыну родная маці Васіля, Марыя. Паехала ў Латвію шукаць сына. У манастырскіх запісах знайшла адрас Васі. Але ён так звыкся з Ксеніяй Міхайлаўнай, што не прызнаў роднага чалавека. Марыя Варфаламееўна была ў роспачы. Тады прыёмная мама Васіля пасяліла ў сваёй кватэры яго родную маму, каб хлопец не цураўся, прывык да яе. Не месяц, не два жылі побач тры душы.

Што адчуваў кожны ў гэтай кватэры? Не перадаць тут перажыванняў дзвюх жанчын. Было ўсё: і шкадаванне, і спагада, і разуменне. Але перамагла, зноў жа перамагла дабрыня. Васіль нібы адчуў патаемны кліч змучанай у чаканні жанчыны і нарэшце пайшоў у цеплыню матчыных абдымкаў.

З вуліцы Патверсмэс (Прытулкавай) прывезла Марыя Варфаламееўна свайго сына ў Мінскае сувораўскае вучылішча. Пры магчымасці праведвала яго, чакала на пабыўку. Але аднаго лета яе не стала. Асірацеў Вася. І тады Ксенія Міхайлаўна зноў прытуліла хлопца, зноў стала для Васіля за родную маму. Па сённяшні дзень яна адчувае яго любоў, сардэчную ўдзячнасць.

Пры першай магчымасці Васіль Васільевіч Скрыпка, ён зараз афіцэр Савецкай Арміі, ці то адзін, ці то з сям'ёй наведвае з дзяцінства знаёмы дворык, узбягае на драўляны ганак.

— Вось і я, мама! — чуе Ксенія Міхайлаўна голас узмужнелага сына.

Вуліца Атпутас, Пракапенкава Галіна Васільеўна:

— Мяне ад карнікаў схавала ў мяшку мама — Агурэцкая Ганна Міронаўна. На жаль, нічога я не ведаю сёння пра сваю выратавальніцу — «маму Жэню», Яўгенію Смірнову. Добра, што хоць яе фота захавалася ў мяне...

Калі я гутарыў у Каўгурах (Юрмала) з Валадзёнкам Пятром Маркіянавічам, то ад яго даведаўся, што з-за гэтай самай маленькай Анюткі не змаглі ўцячы па дарозе ў Асвею многія родзічы Агурэцкіх (хацелі быць разам, каб ратаваць немаўлятка). Сваімі ўспамінамі пра Брацкі партызанскі край, пра свой шлях у Саласпілс падзяліліся і дзве сястры Пятра Маркіянавіча — Зінаіда і Валянціна. Першая жыве ў новым раёне Рыгі — Кенгараксе, другая — у Старой Рызе.

На галоўнай вуліцы Рыгі — Ленінскай — жыве **Мажэйка Настасся Іванаўна** з асвейскай вёскі Вялікае Сяло. 17 красавіка 1943 года карнікі захапілі ўсю яе вёску, сям'ю. Вывезлі яе бацькоў, сясцёр Зіну, Марыю, братоў Васіля, Дзмітрыя і паўтарагадовую пляменніцу Любу. У той дзень спалілі ў стайні каля 500 чалавек з Вялікага Сяла і навакольных вёсак.

Усёй сям'і Мажэйкаў пашчасціла ўцалець. Найбольш прыйшлося памучыцца Зіне. З Саласпілса яе паслалі на катаржныя работы ў акупіраваныя раёны. Аднойчы машына, поўная вязняў, наскочыла на міну. Зіне патрушчыла ногі. Толькі яна адна выжыла ў шпіталі. І вось такую калеку, на кавёлах, зноў вярнулі ў Саласпілс.

Мала таго, што фашысты прымушалі працаваць вязняў у самім канцлагеры. Яны яшчэ зараблялі на іх такім чынам: адпраўлялі для работы на хутары, а з хутаран спаганялі за гэта грошы. І Зіне так прыйшлося працаваць. Але калі зусім паправілася, яе вывезлі ў Германію. Напакутавалася на чужыне. Вызваленне для яе прыйшло каля Данцыга.

Прашу Настассю Іванаўну расказаць пра свой лёс. Яна з удзячнасцю прыпамінае свайго збавіцеля ад смерці — гаспадара хутара Стурыш — Яніса Каркліня. Перад адпраўкай у Германію ён нават хацеў удачарыць яе, але акупанты не дазволілі.

Не так даўно Настасся Іванаўна зноў наведала той хутар, дзе яе вярнулі да жыцця. Карклінь прыняў яе як дачку. Пачаставаў яблыкамі з тых яблынь, якія пасадзілі яны разам у час вайны ў гонар яе збавення ад смерці.

Настасся Іванаўна не раз наведвала Саласпілскі мемарыял:

— Зараз там усё не тое. Там нічога і не ўспомніш. Усё дужа красіва. А я ўяўляю баракі з нарамі, дзе адзін рукаў клалі пад галаву, другім накрываліся. Уяўляю шыбеніцу: тры слупы з рамянямі, ланцугамі, дзе вешалі чалавека галавой уніз. Чую просьбу тых, каго вось так каралі: «Брацці і сёстры, дабейце нас...» Іх вешалі ў 10 гадзін раніцы, а яны яшчэ і назаўтра жывыя былі. Мучыліся. Бачу лаўкі, дзе мучылі ўцекачоў, бачу іх парванае крывавае цела, распухлыя галовы.

«Стойце за сваю ўласць! — гаварыў нам бацька.— Не скарайцеся!»

...Калі сям'я Мажэйкаў вярнулася з Нямеччыны на радзіму, іх у роднай вёсцы вітаў толькі ўчарнелы комін. Бацька вычасаў калкі і паставіў прывезены з Германіі адзіны трафей — рабую палатку. Сталі абжывацца. З'явілася і зямлянка. Потым бацька вырашыў адвезці сваіх дзяцей у школу ФЗН. Школа была ў Латвіі.

Настасся Іванаўна стала ткачыхай, стала рыжанкай. У Рызе працуюць і яе сестры: Зіна, Марыя...

На вуліцы Карла Маркса жыве са сваёй прыёмнай маці Вольга Пятроўна Чучына. Гаварыла спачатку Вольга Пятроўна.

Сапраўднае прозвішча яе — Гейжын. І родам яна са спаленай вёскі Цагельнікі. У яе бацькоў было пяцёра дзяцей: Аня, Ніна, Вера, Оля, Іван.

З Саласпілса акупанты аддалі іх на хутары. Потым саласпілскія дзеці былі сабраны з хутароў у рыжскі манастыр. Але з манастыра не ўсе дзеці былі ўзяты ў рыжскія сем'і: многія маленькія вязні Саласпілса аказаліся ў дзіцячым прытулку, дзе іх гадавалі як будучых рабоў рэйха.

Прыёмная мама Вольгі Пятроўны —**Чучына Ганна Мяфодзьеўна** — расказала, што было далей. Яе сяброўка, Клаўдзія Пятроўна Баброва, паведаміла ёй, што з манастыра ўзяла сіротку Аню. Але ў Ані, аказваецца, ёсць яшчэ сястрычкі. Толькі не ведала, дзе яны. Тады Ганна Мяфодзьеўна вырашыла іх адшукаць, каб Аня не расла адзінокая і няшчасная.

Аказалася, што Оля і Вера знаходзяцца ў вядомым ужо нам дзіцячым прытулку ў Ігатэ. Але Ганне Мяфодзьеўне не па сілах было гадаваць адразу дзвюх. Сабе ўзяла ў дочкі Олю, а Веру згадзілася ўзяць знаёмая Чучынай — Таццяна Майкапар.

Вольга Пятроўна пры развітанні расказала мне, што ўсе свае гады ахвяравала Ганне Мяфодзьеўне, ратаўніцы. Нават сям'ю сабе не стварыла. Усю любоў, усю павагу без астатку аддае чалавеку, якому абавязана жыццём.

Вуліца Кіеўская. Тут жывуць **Ермалаевы — Таццяна Ермалаеўна і Мікалай Іванавіч**, людзі, якія ратавалі ад смерці асвейскага хлопчыка Віталя Каляду. І сам ён жыве ў Рызе на вуліцы Карла Маркса, і яго сястра — Надзея Рыгораўна Кіпіч — таксама рыжанка.

У Саласпілсе, як расказала **Надзея Рыгораўна**, за адну толькі ноч адабралі дзяцей у 800 асвейскіх матак. Праз станцыю Шкіратава жанчын вывезлі ў Майданак. Яе дзеда Сімацкага Мікалая Іванавіча акупанты расстралялі ў Румбульскім лесе.

У манастыры ніхто не ўзяў Надзю, бо яна была занадта хворая, кволая, адным словам, не жылец. Так яна апынулася ў Ігатэ, дзе слабыя дзеці паміралі, а той, хто выжываў, павінен быў стаць рабочай сілай акупантаў. Потым Надзя вяртаецца да сваёй бабулі Сімацкай Марыі Фёдараўны, якая выпрасіла яе.

І ўсё ж як ні баялася бабуля Нямеччыны, прыйшлося пабыць і там. Параходам іх вывезлі ў Гамбург, потым у лагер, які размяшчаўся каля горада Франкфурта-на-Майне.

Летам 45-га года праз разбіты Кенігсберг Надзя з бабуляй вярнулася на бацькаўшчыну.

Для цябе і для мяне, дарагая Браніслава, гаворыць пра свой лёс, пра свае дарогі яшчэ адзін рыжанін.

Вуліца Карла Маркса, Віталь Антонавіч Каля да:

— У манастыры на падворку да мяне падышла жанчына. Пытаецца: «Ты будзеш зваць мяне мамай?» Я кажу: «Буду». Яна ўзяла мяне на рукі, бо я быў слабы і не мог сам ісці. Потым мы ехалі ў трамваі.

Людзі, якія мяне ўзялі, аказаліся вельмі добрыя. Яны ўзялі мяне за сына, хоць у саміх было тры дачкі. Я іх палюбіў, як родных.

У 45-ым мяне знайшла, вярнуўшыся з Асвенціма, мама. Я не хацеў прызнавацца, хоць і ведаў, што яна родная, бо мне здавалася: возьме мяне мама — і зноў пачнецца тое пекла, праз якое мы прайшлі.

Людзям, якія мяне выратавалі ад вернай смерці, я буду ўдзячны ўсё сваё жыццё...

Вось што дабавілі да гэтых успамінаў Ермалаевы:

— У нашым доме жыла і сястра мужа. Аднойчы прыходзіць і пытаецца: як накарміць дзіцёнка? Мы так здзівіліся, адкуль у пажылой жанчыны з'явілася дзіця. Яна нам і расказала пра галодных, хворых няшчасных маленькіх вязняў Саласпілса.

Яна была ўзрадавана, што і ёй дазволілі ўзяць у манастыры дзяўчынку. Гаварыла нам: выгадуе — будзе на старасці суцяшэнне. Але яе мары не збыліся. У лагеры дзеці былі настолькі даведзены да крайнасці, што ўратаваць сваю дзяўчынку нашай родзічцы не ўдалося.

Тады мы рашылі ўратаваць хоць аднаго чалавечка. Дужа балела душа за лес ні ў чым не вінаватых дзетак. Вось я і кажу свайму мужу:

— Возьмем хлопчыка. У нас ёсць тры дачкі. А калі ты хочаш сына — вось і вазьмі. Будзе з кім табе у лазшо хадзіць...

Ён згадзіўся. На другі ж дзень я паехала ў манастыр, дзе знаходзіліся дзеці Саласпілса. У манастыры мне паказалі на драўляны аднапавярховы дом. Пайшла. Гляджу: на лавачцы сядзяць пяць хлопчыкаў і некалькі дзяўчынак ва ўзросце 4, 5, 6 гадоў. Манашка спытала, што мне трэба. Я сказала. Тады яна распытала пра маю сям'ю. Выслухала мяне і дазволіла: «Выбірайце».

Каля першага хлопчыка я спынілася, паглядзела на яго і спытала імя. Ён адказаў: «Віця». Спытала яго: «Пойдзеш да мяне?» Ён кіўнуў галавой.

У манастыры запісалі мой адрас, запоўнілі нейкія паперкі. Хлопчык быў у шапцы, апрануты ў шэрую шынельку. Я ўзяла яго за руку, і мы паціхеньку пайшлі за вароты. Але чалавечак спыніўся і

паглядзеў на мяне. І так паглядзеў сваімі карымі вачаняткамі, што я аж схамянулася.

— Ну, пойдзем,— паклікала яе.

— Не магу,— прашаптаў ён.

Я была тады маладая і дужая. Абхапіла чатырохгадовага хлопчыка і ўвайшла з ім у вагон. У трамваі адразу здагадаліся, што гэта не маё дзіця. Уступілі мне месца, сталі частаваць.

Дома сустрэлі дочкі Зіна, Зоя, Люба. Яны так узрадаваліся, што ў іх з'явіўся брацік.

Само па сабе атрымалася, што мы сталі клікаць яго Валодзем.

Два тыдні прахварэў на панос. Медсястра параіла, як яго карміць. Адышло. Горш было з гнайнікам на шыі. Доўга вадзіла хлопца да доктара.

Дзеці мае падружыліся, увесь час былі неразлучныя. Аднойчы Валодзя нечакана пазваў мяне са двара:

— Мама! Кінь мне мячык!

З гэтай хвіліны ён пачаў мяне зваць толькі мамай.

А неўзабаве паявілася ў двары старэнькая жанчына, якая шукала нашу кватэру. Гэта была Валодзева бабуля. Яна расказала нам пра сваё гора, пра тое, як знайшла Надзю, сястру Валодзі. У Ігатэ, як толькі яна паявілася, яе акружылі дзеці, пыталіся, дзе іх мамы, прасілі перадаць, каб па іх прыехалі. Калі бабуля запыталася, а як жа завуць іхніх мам, ніхто не мог успомніць. Толькі адна дзяўчынка прыгадала, што ў яе мамы спадніца «ў кветачкі».

Валодзева бабуля плакала і дзякавала нам, што ратавалі яе ўнука. Потым прыехала яго мама. Ён нават два разы хаваўся ад яе, каб застацца з намі...

Мы, вядома, рады, што Валодзя вырас добры, сумленны чалавек. Жанаты, мае дачку і сына. Не забывае і пра нас, наведвае. Заўсёды ўспамінаем нялегкія тый часы. Мы вельмі рады, што змаглі дзіцяці замяніць маці і бацьку...

Вуліца Міера. Тут жывуць адразу дзве прыёмныя маці Эмы Цяплюк — Цэліс (Барысевіч) Франя Пятроўна і Думпіс Еўфалія Іванаўна.

Першая жанчына гадавала яе ў партызанскім атрадзе, калі родная маці Эмы — Вольга Рыгораўна — памерла ад прастуды. З Эміліяй Франя Пятроўна трапіла ў Саласпілс, дзе іх у хуткасці разлучылі.

Эму з Саласпілса хацела ўдачарыць адна рыжанка. Але хутка Эма апынулася ў дзіцячым прытулку, адкуль яе ўзяла Еўфалія Іванаўна Думпіс.

Гэтая жанчына ратавала не толькі Эму Цяплюк з вёскі Сенькава. Яна выгадавала, вывучыла і ажаніла Яўгенія Шутко з Росіцы.

Першы раз пасля карнай экспедыцыі Эма ўбачыла роднага бацьку Іосіфа Ігнатавіча, былога партызана, у 1944 годзе, калі ён, ужо вайсковец, вызваліўшы Рыгу, заглянуў на хвіліну да Думпісаў.

А Жэню Шутко знайшла родная мама Аляксандра Ягораўна толькі праз 20 гадоў пасля асвейскай трагедыі.

І яшчэ адзін адрас беларускіх рыжан. Былая партызанская сувязная брыгады «Няўлоўныя» Шпакоўская Марыя Мацвееўна падарыла мне зжаўцелую газетную выразку. У «Рыгас Балс» калісьці друкаваліся матэрыялы з судовага працэсу над прыслужнікамі фашыстаў. На пасяджэнне Вярхоўнага суда ў Рызе прыйшла і Марыя Мацвееўна Скавырка (Шпакоўская) родам са спаленай вёскі Гейжанава. Разам з маці яна таксама прайшла Саласпілс. Марыя Мацвееўна Вярхоўнаму суду нагадала такі яскравы факт. Калі адзін латыш, сам апухлы ад голаду, аддаў свой мізэрны паёк хлеба змучанаму беларускаму хлопцу, гэта прыкмецілі стражнікі. Яны накінуліся на вязня-латыша, білі яго ботамі, здзекаваліся да той пары, пакуль вязень не сканаў.

Калі Марыя Мацвееўна вярнулася на радзіму, яна знайшла замест вёскі галавешкі і быльнік. І тады вырашыла вярнуцца ў Латвію — да тых людзей, з якімі парадніласяў Саласпілсе.

Больш, чым хто іншы, прабылі ў Саласпілсе Шпакоўская Гунэфа Ігнатаўна са сваімі дзецьмі Марыяй, Лінай, Францам і Толікам: з лютага 1943 года па люты 1945 года.

Саласпілскія ўспаміны гэтай сям'і з барака № 24 надзвычай пякучыя.

**Марыя Мацвееўна**:

— Усё аднялі, голых пакінулі. У мяне косы з лентай адрэзалі і на слуп павесілі. Пасля лазні корчыліся на халоднай падлозе. Прыбіральня — поўная: жыжа расцякаецца па бараку. Між мужчынамі і намі загарадка. Сям'ю раздзялілі так: тры — сюды, тры туды...

**Гунэфа Ігнатаўна**:

— Бачым: дзеці паўміраўшыя ляжаць. Чэрві па іх поўзаюць. А жывыя станавіліся ў чаргу з алюмініевымі кружкамі. Ім нальюць гарачай баланды, і дзеці апякаюцца. Другі не ўтрымае страву — і застаецца галодны. Хто хворы і не здолее падысці да раздачы, таксама галодны застаецца. Малыя з 3-га ці 4-га паверхаў нараў калі і паспрабуюць злезці за ежай — упадуць на дол. Руку ці нагу зломяць. Таго падымуць і зноў пасадзяць на месца.

Майму Толіку таксама нейкія ўколы давалі. Ляжаў непрытомны. Але і ў трызненні ўспамінаў, як родных завуць, як суседзяў, як каго дома звалі, карову нашу, напрыклад...

Ашчапераць мяне дзеткі і плачуць: «Мамачка! Чаго мы такія няшчасныя? Чаму нас так мучаць?» А Франц, калі ўжо пачалі вешаць ім біркі, супакойваў мяне : «Мама, не плач, беражы здароўе. Можа, мы і ўвідзімся...»

**Марыя Мацвееўна**:

— У Саласпілсе майго бацьку замучылі. Забілі плёткамі гумавымі. І маці тры разы да сцяны ставілі, страляць збіраліся, нагамі падкідвалі...

**Гунэфа Ігнатаўна**:

— З 800 дзяцей за два s паловай месяцы ў жывых засталося 200. Пакойнікаў валаклі за вароты, зачапіўшы вяроўкамі за пяту.

**Марыя Мацвееўна**:

— Аднойчы мама тры бульбіны для нас узяла. За гэта яе паставілі на калені і прымусілі стаяком шчотку трымаць. Як толькі шчотка нахілялася, білі плёткай.

**Гунэфа Ігнатаўна**:

— Майго Толіка, калі мяне вывезлі ў Германію, пакінулі, саслабелага, у манастыры. Яго ўсынавіла рыжанка Нячаева Валянціна. Знайшла я свайго хлопца ў 1946 годзе. Падзякавала жанчыне за ратаванне сына. Цяжкая гэта справа — перадаваць дзіцятка з адных рук у другія. Бо і адна з нас мае на яго права і другая. Вайна такога накруціла, што потым дзесяткі гадоў народ разблытваўся...

Знайшла ў латышскіх прыёмных маці дзвюх сваіх дачок **Антаніна Мішкуцёнак** з вёскі Матукі. Але...

— Сваю трэцюю дачку я ўсё яшчэ шукаю... Можа, яе вочкі засыпаў саласпілскі пясок, калі яе, замучаную галоднай смерцю, закопвалі за калючым дротам. Можа быць... Але сэрца маці не хоча ў гэта паверыць. Яно ўсё яшчэ чакае і ціха пытаецца: «Дзе ты, дзе ты згубілася, мая дачушка?»

15 гадоў было сыну Шпакоўскай Гунэфы Ігнатаўны, калі карнікі палілі яго родную веску Гейжанава. Ужо дарослы, ён выступаў сведкам на пасяджэнні Вярхоўнага суда Латвійскай ССР, калі судзілі фашыстаў, здраднікаў народа. Вось абзац з газетнага артыкула «Шакалы»: «З-пад навіслых пасівелых броў Франц Шпакоўскі, абапіраючыся на сукаватую палку, абводзіць паглядам падсудных.

— Ці пазнаяце вы каго-небудзь з іх? — пытаецца ў яго еуддзя.

Тыя, што сядзяць на лаўцы падсудных, ёрзаюць, адварочваюцца.

— Вось яго ведаю,— худая рука цвёрда паказвае на Бумберса.— Гэта яго ўзвод выгнаў мяне і ўсіх жыхароў вёскі з нашых хат...

І ўсё спаліў датла...»

А нядаўна Шпакоўскі Франц Мацвеевіч паведаміў мне з Кохтла-Ярвэ наступнае:

«...За намі праскрыпелі жалезныя вароты. На тэрыторыі канцлагера была гразь, перамешаная са снегам. Першае, што мы ўбачылі: два ахоўнікі з плёткамі ў руках ганялі двух вязняў па плошчы. Ім камандавалі то «Лажысь!», то «Уставай!» і пры гэтым білі няшчасных плёткамі. Вязні настолькі былі змучаныя, што пры камандзе «Лажысь!» падалі прама ў гразь, і толькі ўдары плётак прымушалі іх уставаць.

А воддаль ганялі некалькі вязняў, у якіх з двух бакоў былі падвешаны дошкі. Злева мы ўбачылі, як вязні на насілках валаклі каменне і складвалі яго ў крушню. Другая пара вязняў цягала гэтае каменне назад.

Каля лагера ляжалі тысячы трупаў. Фашысты, прадчуваючы расплату, пачалі іх спальваць. А тут дзеткі прыбаўлялі ім работы. Трупы не паспявалі знішчаць.

Вясной 1944 года я быў вернуты з хутара ў лагер. Цэлы месяц нас рыхтавалі да нейкай працэдуры. Аказваецца, ішла вярбоўка ў паліцыю. Спачатку нам дэманстравалі ўсе жахі здзекаў над вязнямі, каб зламаць нашы душы. Потым пачалі нас апрацоўваць вярбоўшчыкі, каб уцягнуць у паліцыю. І ўсё ж у дзенв вярбоўкі фашысты аказаліся ў пройгрышы. З 200 юнакоў змаладушнічалі адзінкі. Усе мы глядзелі на іх з агідай. Пасля гэтага нас, нескароных, адправілі ў глыб Германіі...»

«У глыб Германіі...» Каб не вярнуліся, каб не ўбачылі роднай старонкі.

Вось і зноў пытаюся ў цябе, Браніслава: «Ці можаш пазнаць ты сярод тых, хто тут прамаўляў сваё слова, роднага чалавека? Ці пазнаеш свой шлях на пакручастых дарогах асвейцаў?»

І зноў перад табой і перада мной — новыя сведкі...

Вячэрняя газета «Рыгас Балс» («Голас Рыгі») аднойчы змясціла невялікі допіс Н. Богуш «Памятаем і ніколі не забудзем». Аўтар, а ёй аказалася Надзея Георгіеўна, народжаная ў вёсцы Красова Асвейскага раёна, разам з мамай, братам і сястрычкай аказалася за калючым дротам Саласпілса. У чэрвені 1943 года ў «Рукішы» («Карлікі») пад Саўлкрастамі («Сонечны бераг») з саласпілскага лагера прывезлі 70 дзяцей ад 2 да 12 гадоў. Сярод тых паўжывых істот была і Надзея.

Праз 35 гадоў пасля гэтага Надзея Георгіеўна Богуш выказала праз газету вялікую ўдзячнасць Э. Гайлітэ — сваёй выратавальніцы з прытулку «Рукішы».

Пасля сустрэчы з Надзеяй Георгіеўнай давялося шукаць і Э. Гайлітэ. Пісьмо прыйшло з пансіяната «Камунар» (Рыжскі раён) ад Эльзы Мікелеўны ПійпэГайлітэ. Завязалася перапіска.

Хутар «Рукішы», як паведамляла Эльза Мікелеўна, уяўляў сабой вялікі прасторны дом на самым беразе мора. Да вайны там размяшчаўся дзіцячы лагер для летняга адпачынку.

Эльза Мікелеўна там працавала з лета 1943 года. Загадчыцай прытулку была Каралёва Лідзія Іванаўна.

Хутка да невялікай групы дзяцей прыйшло папаўненне: з Саласпілса прывезлі Васілёнак Марыю з сынам, Лявонаву Ганну з дачкой, Равінскую Фрасенню з дваімі дзецьмі, Крукаву Палагею (а мо Праскоўю) з двума ўнукамі-малалеткамі. Эльза Мікелеўна дакладна памятае, што аднаго з іх звалі Пецем.

Як сведчыць Эльза Мікелеўна, дзеці сталаваліся хоць і не вельмі сытна, але пастулова акрэплі. І вось калі прывезлі яшчэ адну групу з Саласпілса — іх нельга было параўнаць ні з чым. Дзеці былі надобныя на жывых трупікаў, як паведамляе Гайлітэ. «Костачкі, абцягнутыя скурай, якая абсыпана рознымі болькамі. Сямігадовае дзіця спатыкалася і падала на кожным кроку. Пра меншых — няма чаго гаварыць».

Доўга змагаліся выхавацелі за жыццё дзяцей, пакуль іх хоць трошкі падлячылі. А тут новая бяда: эпідэмія шкарлятыны. Памерлі тры дзяўчынкі і два хлопчыкі. Іх пахавалі на могілках у Саўлкрастах. Маркотна ішла зіма. У трывогах і стоме закончыўся 1943 і пачаўся 1944 год. Вясной эпідэмія пачала адступаць. Усе ажылі, чакалі лета.

У маі раптоўна паведамілі, што прытулак пераводзяць на суседні хутар, які насіў назву «Цымерман». Раней там размяшчаліся ваеннапалонныя, якіх замарылі тыфусам. Дом «Цымерман» знаходзіўся ў 500 метраў ад «Рукішаў». Побач дома фашысцкія салдаты ўзводзілі пярэдні край абароны, капалі траншэі, бункеры, розныя ўмацаванні. Гэта трывожыла, нервавала дзяцей і дарослых.

У прытулку патаемна даведаліся, што нямецкі фронт адступае. Міма па дарозе цэлы тыдзень дзень і ноч ішла ваенная тэхніка, на грузавіках праязджалі гітлераўцы.

У сям'і Пуныняў, дзе пяклі для прытулку хлеб, мукі засталося на адну замешку. Заканчваліся ўсе прыпасы.

Вечарам 25 верасня зайшлі гітлераўцы і вырачылі вочы, убачыўшы, што ў іх на перадавой пазіцыі вячэраюць дзеці. Паступіў загад праз паўгадзіны пакінуць дом.

Так і не давячэралі ў прытулку. Як стаялі, выйшлі на двор. А куды ісці? Эльза Мікелеўна прапанавала вярнуцца ў «Рукішы» і схавацца там у вялізным склепе.

У склепе праз ноч было чуваць, як немцы ўзрывалі чыгуначную станцыю, дарогу, мост. Раніцой нехта смялейшы з хлопцаў высунуўся са склепа і радасна крыкнуў: «Нашыідуць!»

Сапраўды, паказалася наша разведка. Байцы, убачыўшы рух ля склепа, насцярожыліся і з аўтаматамі напагатове падышлі да склепа. Першымі не вытрымалі дзеці. «Свае!» — закрычалі яны. Тварылася неверагоднае. Абдымкі, пацалункі, радасныя слёзы.

Нашым салдатам расказалі, дзе знаходзяцца гітлераўскія пазіцыі, і байцы тут жа ў «Рукішах» пачалі займаць абарону.

Пад'ехалі тры машыны. Байцы пераносілі туды дзяцей. У гэты час іх абстралялі немцы. На шчасце, ніхто не загінуў. Толькі адзін салдат быў паранены, які сваім целам прыкрыў былога маленькага саласпілскага вязня.

Байцы спяшаліся вывезці дзяцей, бо над самай галавой праляталі дальнабойныя снарады. Ля дарогі, па якой ехалі, бачылі забітых салдат, тут жа ляжалі мёртвыя коні.

І вось машыны прыбылі ў Лімбажы. Людзей не было відаць. Горад нядаўна быў вызвалены, і яшчэ не ўсе галавешкі датлелі на яго руінах. Дзяцей прыняў камендант горада Лімбажы Афанасьеў Іван Андрэевіч. Ён зрабіў усё магчымае, каб знайсці жыллё. Не паспелі яны пасяліцца, як прывезлі дзецям хлеб і вялікі бітон малака.

А на ўсіх была толькі адна кружка. Елі па чарзе, са смакам, спаталяючы голад.

Першую ноч спалі дзеці на падлозе. Потым прывезлі з трафейных складаў начынне, прадукты.

А потым дзіцячы дом перайшоў у веданне гарадскога выканкома. І хоць яшчэ ваўсю кіпеў «курземскі кацёл», у Лімбажах дзеці ішлі на школьныя заняткі.

Не абышлося і без перапуду. Пасля нядаўніх баёў усюды яшчэ можна было знайсці міны, гранаты. Аднойчы з прагулкі адзін хлопчык прынёс дзіўную палку з прапелерам на канцы. Усе пачалі разглядаць цяжкаватую цацку. Нехта загадаў хутчэй вынесці яе на вуліцу. І толькі хлопчык выйшаў за дзверы разам з цікаўнай малечай, як там раздаўся моцны ўзрыў.

Усе, хто быў дома, замерлі. Баяліся падысці да дзвярэй, адчыніць іх, убачыць пакалечаных дзяцей. На шчасце, усе засталіся цэлыя. Толькі «стралок» прапаў. Кінуліся яго шукаць. Бачаць, яго вядзе вайсковец. Аказваецца, у руках дзяцей быў нямецкі гранатамёт. Калі ён выстраліў, граната выпадкова не ўзарвалася ў пакоі з дзецьмі, а вылецела праз адчыненае акно і прабіла сцяну супрацьлеглага дома.

9 мая, на самым ранку, нехта перадаў радасную вестку: Перамога! Дзеці забыліся пра снеданне. Узрушаныя, яны пабеглі ў цэнтр горада, дзе адбываўся мітынг. Потым іграў духавы аркестр. Усе спявалі, танцавалі, у тым ліку і дзеці з прытулка.

З таго дня, 9 мая, сталі чакаць родных. Таго-сяго знаходзілі бацькі. Але ў большасці дзеці засталіся сіротамі: не было каму прыехаць па іх. Іх размеркавалі па другіх дзіцячых установах.

— Мінула амаль два гады сумеснага жыцця са шматпакутнымі дзецьмі-вязнямі,— дадае Эльза Мікелеўна.— Жылі мы адной вялікай сям'ёй. Дзяцей у нас заўсёды называлі па імю. Мы стараліся суцешыць іх, улагодзіць пякучую душу...

І па вайне Эльза Мікелеўна Гайлітэ не раз наведвала «Рукішы». Пасля аднаўлення разбуранага вайной дома там некаторы час размяшчалася пачатковая школа. Потым дом перарабілі. Там зараз жывуць людзі, якія ўжо нічога не могуць дабавіць да гісторыі маленькага дзіцячага прытулку «Рукішы» на Сонечным беразе, ля самага бурштынавага мора.

## Частка другая

У 99-ай сярэдняй школе горада Мінска праходзіў вечар інтэрнацыянальнай дружбы, прысвечаны сустрэчы латышскіх і беларускіх школьнікаў. Сваім сябрам з Даўгаўпілскага раёна пра сваю рэспубліку расказала Наташа Раптуновіч, вершы беларускіх паэтаў прачыталі Сяргей Грамыка, Ларыса Шастакова... Аб укладзе беларускага народа ў вялікую перамогу над фашысцкімі захопнікамі расказаў прысутным выкладчык школы Леанід Канстанцінавіч Провараў. На вечары гучалі латышскія вершы і песні. Госці Мінсіса дзяліліся ўралсаннямі ад наведвання Беларусі. Прывітанне ад сінявокай Латгале — свайго роднага краю — перадалі мінчанам Саша Пятрова, Інга Васілюк, Інара Путэнэ, Лоліта Жалвэ...

Але ніхто так не хваляваўся ў гэты вечар, як выкладчыца школы **Марыя Валянцінаўна Зімніцкая**. Вось што яна расказала гасцям з Латвіі. Маленькая дзяўчынка стала ў час вайны вязнем канцлагера

Саласпілс. Ды ей пашчасціла на спагаду, цеплыню і ласку, здавалася б, чужых людзей. Знайшлася рыжанка, якая вярнула яе да жыцця.

— І тое, што я зараз перад вамі,— звярнулася класны кіраўнік, выкладчыца англійскай мовы Марыя Валянцінаўна Зімніцкая да латышскіх і сваіх школьнікаў,— я навек удзячна жанчыне, што зараз жыве ў Рызе. Вольга Іванаўна Кельдэр у той суровы, страшны час гітлераўскага тэрору ўзяла мяне за дачку, выратавала ад пагібелі.

Ці не таму Марыя Валянцінаўна на ўсё жыццё вызначыла сабе абавязак настаўніцы, выхавацелькі, маці. Дзіцё — парастак на вялікім дрэве чалавецтва. І як не турбавацца Зімніцкай, каб яе гадаванцы выраслі слаўныя і годныя свайго часу і свайго народа.

У час вайны сям'я Абуховічаў жыла каля чыгуначнай станцыі Бігосава. Стальную магістраль, што праходзіла тут з захаду на ўсход, пільна ахоўвалі гітлераўцы. Але баявыя дзеянні народных мсціўцаў былі ўдалыя перш-наперш таму, што ім дапамагала ўсё мясцовае насельніцтва. У ліку лясных байцоў быў і родны дзядзька Марыі Валянцінаўны — Іосіф Уладзіміравіч Абуховіч. Пра яго, камандзіра атраднай разведкі, успамінаюць у сваіх мемуарах былыя кіраўнікі партызанскага руху на Віцебшчыне.

Але ўсё па парадку пра слаўную партызанскую сям'ю Абуховічаў.

Адзін з Абуховічаў — Эдуард — быў першым маім карэспандэнтам і памочнікам, як толькі пачыналася вось гэта кніга.

**Антон Уладзіміравіч Абуховіч** (Бігосава):

— Нас да вайны пяць братоў было. Пачалася ўсенародная барацьба. Валодзю арыштавалі першага, але ён уцёк у Дзвінску з поезда і пайшоў у партызаны. Франц, калі яго вывозілі ў Иямеччыну, у Польшчы ўцёк з транспарту і таксама стаў партызанам. Юзік ваяваў у Сар'янскіх лясах. Калі спалілі нашу вёску, мяне, жонку і траіх дзяцей завезлі ў Саласпілс. Адтуль паслалі, ужо без дзяцей, на катаржныя работы. Нам удалося ўцячы з-пад аховы, адшукаць сваіх дзяцей: Зіну, Жэню, Аляксандра.

**Аляксандр Антонавіч Абуховіч** (Даўгаўпілс):

— Нашу сям'ю акупанты лічылі партызанскай, таму часта рабілі вобыскі, бралі бацьку на допыты. Аднойчы яго так збілі гумавымі палкамі, што ён два тыдні не мог падняцца. Успамінаю, як гітлераўцы штыкамі праколвалі капу сена, дзе былі схаваны лістоўкі. Іх нам перадалі партызаны, а я са сваім дзядзькам Абуховічам Уладзімірам раскідваў іх па дарогах. 10 сакавіка 1943 года нашу сям'ю і блізкіх сваякоў арыштавалі, сагналі ў вагон і адправілі ў Саласпілс. Потым я з сястрой апынуўся за 7 кіламетраў ад станцыі Огрэ — на хутары

Тручы ў доме Артура Ліепы. Там нас, знясіленых, хворых, галодных, выратавалі латышы.

У пачатку 1944 года я даведаўся, дзе знаходзяцца нашы родныя. Бацьку дазволілі забраць нас з хутара Тручы. А калі сям'ю спрабавалі вывезці ў Германію, на станцыі Амата нам пашчасціла ўцячы. Схаваліся ў сям'і Петэрсана. Так у другі раз выратавалі нас ад пагібелі латышы.

Я ў Латвіі атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка, стаў выкладчыкам у Даўгаўпілскім педінстытуце. А сястра Жэня працуе на заводзе ў Рызе. Зіна настаўнічае ў Рагачове.

**Эдуард Валянцінавіч Абуховіч** (пляменнік Антона Уладзіміравіча, Бігосава):

— Разам з бацысам мы прабылі ў Саласпілсе не больш тыдня. Затым нас перавялі ў дзіцячы барак. Пры гэтым перакладчык абяцаў людзям: няхай ніхто не хвалюецца — дзеці будуць дагледжаны. Але тут і пачалося цяжкае, галоднае жыццё на нарах. Нас марылі голадам, дзеці падалі як мухі. А адымалі ж ад мацярок нават грудных дзяцей. Праверка нараў — вось што выклікала ў нас вялікі страх.

Ноччу спецыяльная каманда прачэсвала нары: скідвала на праход дзяцей не толькі мёртвых, але і наўжывых. Іх збіралі на насілкі, грузілі ў машыны,

У канцы лета я трапіў на хутар. Але які з мяне работнік у шэсць гадоў? Неўзабаве дзятву з хутароў сабралі і павезлі ў Рыгу. Там і сустрэўся я з сястрой Марыяй.

Я трапіў у сям'ю Карэцкага Анатоля Уладзіміравіча. Гэта быў цудоўны чалавек. Ён вылечыў мяне. Па сутнасці, сям'я Карэцкіх выратавала мне жыццё.

**Марыя Валянцінаўна Зімніцкая** (настаўніца 99-й сярэдняй школы г. Мінска):

— Памятаю страшэнны барак, каменную шэрую падлогу. Прыносілі чай, хлеб з апілкамі. Калі бацькоў пасылалі на работу, дзеці заставаліся адны ў кутку. Праз тыдзень нас пад выглядам медыцынскага агляду разлучылі з бацькамі. Кожнаму навесілі на шыю бірку. Прайшоў яшчэ месяц пакуты. Ніхто нас не даглядаў. Малыя падалі з верхніх нараў і калечыліся. Падыходзілі машыны, і ў яе чорнае чэрава піхалі чарговую групу хворых. Аднойчы мы чулі, як за баракам у яме енчылі паміраючыя дзеці. Потым іх закапалі.

Мяне выхоўвала Вольга Іванаўна Кельдэр. У яе я адчула, што такое ласка, спагада, любоў... Калі падрасла, мяне Вольга Іванаўна адправіла ў школу.

**Вольга Іванаўна Кельдэр** (Рыга):

—У двары манастыра ўбачыла разам чацвёра дзяцей. «Абуховіч» — было напісана на адной з бірай. Дзеці стаялі як замарожаныя. Марыя хварэла на залатуху...

Яна пражыла ў нас амаль два гады. Была сёмай у нашай сям'і.

**Элеанора Дзяменцьеўна Абуховіч** (родная маці Марыі, Бігосава):

— З Саласпілса маю сястру Броню адправілі ў Германию, другую сястру — Ядзю — у Даўгаўпілс. Я з мужам апынулася пад Ленінградам. У нас сэрцы крывёю абліваліся: пра лёс жа сваіх дзяцей мы нічога не ведалі. Першую вестку падала Ядзя. Я не змагла паверыць у той цуд, што нашы дзеці жывыя і здаровыя, знаходзяцца ў нармальных умовах. Я так удзячна тым людзям, якія ў цяжкі час ўзялі на выхаванне наших дзяцей...

Мархель Броня... Броня Абуховіч... Ужо колькі разоў называлі знаёмае для мяне імя. І вось зноў ты не прызнаеш сябе, Браніслава. На паверку аказваецца: другая прыгадваецца дзяўчына, не тая сям'я, іншая дарога. А жыццё ідзе. Вунь у цябе і дачушка падрасла. Ці не столькі ёй гадоў, колькі табе было ў Саласпілсе? Цяпер нават болей? У яе — шчаслівае дзяцінства. Але як чакальна ўглядаецца яна ў твае вочы, быццам гэтым позіркам хоча ўлагодзіць, паправіць нялёгкі матчын лёс, выпрасіць для яго ўдачы. Дачушка — прадаўжальніца твайго роду, увасабленне будучыні. Але яе шчырыя вачаняты не ў сіле высвеціць тваё, Браніслава, дзяцінства, каб можна было ўбачыць карані і галіны твайго роду. Толькі сіла Жанчыны, і сіла Маці можа запоўніць сіроцкія прагалы лёсу. Ты — Маці, ты — Мацярык новага жыцця. І гэта табе дае сёння моц і надзею.

Бра-ні-сла-ва... Даўняе і дзіўнае ў цябе імя. Яно само кліча бараніць славу роду свайго, сваёй зямлі. А яшчэ імя загадвае быць у брані перад няшчасцем, перад злом, перад ворагам...

У паэме Міколы Нагнібеды «Матуля з Расой» на вобразе Дар'і Пятроўны Машэравай яскрава ўзнаўляецца лес жанчын, якія сталі на барацьбу з ненавісным ворагам разам са сваімі мужамі, сынамі. Ім было намнога цяжэй, чым мужчынам, весці паядынак з чорнымі сіламі вайны. У многіх мацярок, якія ўцалелі ў тым смяротным змаганні, да сённяшняга дня яшчэ ныюць незагойныя раны...

Слухайце адну з такіх мацярок — **Дземяншчонак Ганну Іванаўну**:

— Разам з мужам Паўлам, дзецьмі Алай, Генам і Шурам жылі мы ў вёсцы Старасекаў Двор каля Сакалішча. А перад самай вайной мужа прызначылі зампалатам у Клясціцкую рамонтна-механічную станцыю. Там і пакінулі яго, як камуніста, для падпольнай работы. Ён

толькі паспеў адправіць у тыл усю тэхніку, як нам прыйшлося шукаць схоў: набліжаліся акупанты. Жылі ў вёсцы Маркава, у маіх бацькоў, пакуль не прыйшлі з вобыскам немцы. На той раз ад фашыстаў ратаваліся тым, што сказалі, быццам у бацькі сухоты. І сапраўды, Павел Аляксандравіч, пакуль жыў у зямлянцы, аброс густой шчэццю, выглядаў састарэлым, нямоглым. Другога вобыску не чакалі — вярнуліся ў Старасекаў Двор.

Слухаю Ганну Іванаўну і думаю: адзін чалавек, а колькі ён убірае памяці, якая становіцца памяццю нашай гісторыі. Слухаю і запамінаю...

Вясной 1942 года пачаў набіраць моцы партызанскі рух. Але ўжо летам вораг напаў на след падполля. Сяляўскі паспеў, на шчасце, папярэдзіць Дземаншчонка. Павел Аляксандравіч з пляменнікам паспелі дабегчы да лесу, пакуль у вёску не ўехалі акупанты.

Дома засталіся Ганна Іванаўна і трое яе дзяцей. Паказаў бы хто-небудзь пальцам, што яна — жонка камуніста, і Ганне Іванаўне з дзецьмі не мінаваць бяды. Ды здраднікаў не знайшлося.

А Ганна Іванаўна расказвае далей:

— У партызанскім атрадзе я была сувязной. Хадзіла на заданні, збірала з дзецьмі зброю... І вось пайшла на наш край карная экспедыцыя. Карнікі знішчалі ўсё жывое. Было спалена і мае роднае Маркава. Я з мужам была на заданні. А вярнулася, то на нагах устаяць не здолела: спалілі маю бабулю і цёцю з дзецьмі. А пры аблаве ў лесе забралі ўсіх траіх маіх дзяцей разам з бацькам Іванам Міхайлавічам. Маці маю, Фядоссю Данілаўну, карнікі расстралялі на месцы...

Далейшы лёс партызанкі быў такі. У 1944 годзе Ганну Іванаўну кантузіла, і з асвейскага аэрадрома яна трапіла за лінію фронту ў шпіталь. Пасля вайны разам з мужам пачала шукаць сваіх дзяцей. Даведалася ў Латвіі, што іх мучылі ў канцлагеры: бралі кроў, праводзілі доследы... Слабейшых — спальвалі. Так загінулі сыны Гена і Шура. А пра Алу ніхто нічога пэўнага не расказаў.

Паўла Аляксандравіча не стала ў 1953 годзе. Ганна Іванаўна вяла свой пошук адна. І ў 1960 годзе ёй пашанцавала: выканаўчы камітэт Саюза таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца адказаў: «Ставім Вам да ведама, што Амерыканскі Чырвоны Крыж паведаміў нам наступныя звесткі пра Дземаншчонак А. П., якую Вы шукаеце...»

Яе незабыўная Алачка стала місіс Вільям Лоўлар, грамадзянкай Злучаных Штатаў Амерыкі. Але гэта не зменшыла радасці Ганны Іванаўны. Яна чытала і перачытвала перакладзеныя з англійскай мовы радкі дачушкі:

«Мая дарагая мамачка! Я атрымала твой мілы ліст і была вельмі рада даведацца, што вы ўсе здаровыя. Некалькі дзён таму, 12 мая, у нас тут, у Амерыцы, адзначалі Дзень маці, калі ўсе сыны і дочкі выказвалі павагу да сваіх матуль. Мне было вельмі цяжка, таму што я не змагла быць з табой...»

Доўга дачка і маці вялі перапіску, дамаўляліся аб сустрэчы... У адным з пісем да мяне Ганна Іванаўна напісала: «І вось ужо прайшло многа гадоў, як я не маю ніякіх вестак ад яе. Не ведаю, як быць мне са сваім горам? Бо нельга ж пасля ўсіх маіх доўгіх пошукаў, пасля радасных вестак — зноў усё беспаваротна згубіць...»

Ганна Іванаўна напісала мне са старажытнага горада Віцебска, дзе атрымала добрую кватэру ў самым сучасным мікрараёне, на праспекце Будаўнікоў, дом 18, корпус 1, кватэра 121. Мо за апошнія гады змяніўся адрас і місіс Вільям Лоўлар і па гэтай прычыне дачка і маці не могуць перапісвацца? То хто б дапамог перадаць ёй адрас мацярынскай любові? Двум не такім ужо далёкім кантынентам не пашкодзіць, калі яны злучацца танюсенькай ніткай сувязі між сэрцамі маці і дачкі. А калі хто засумняваецца ў гэтым, дазвольце напомніць, што пры такой нагодзе думала зямлячка Алы, даўняя крывічанка:

Няма лепшай ягадачкі,
як у лесе брусічанкі.
Няма лепшай гасцінaчкі,
як у роднай матулічкі.
Як матулічка памрэць —
дзе гасцінaчку мець?
Зарастуць усе сцежачкі,
Зарастуць дарожачкі...
А чым жа я церабіць буду?
Ды ці ранняй расою,
ды ці позняй слязою?..

Гэту песню пачуў я зімой на Віцебшчыне, там, дзе ў белай бяссонніцы разлеглася Бацькаўшчына Алы. І мне здаецца, што такія балючыя словы не могуць не дайсці аж да самага прадоння душы, дзе ў кожнага, нават самага ачужзлага чалавека патаемна смуткуе матчына мова.

У адрозненне ад Абуховічаў — усіх Шандараў, якая засталіся ў жывых, не раскідала па свеце. Нарадзіўшыся на Асвейшчыне, прайшоўшы Саласпілс, усе яны зараз лсывуць у Рызе. Вось што я дазнаўся пра іх лёс.

**Ганна Фёдараўна Шандар**:

— Карнікі наступаюць, а са мной пяцёра дзяцей і муж. Дзе ўжо тут хавацца ў лесе. І вось нас, арыштаваных, аглядае гітлеравец з балдавешкай у руках. Хто хворы — таго ўбок, спальваць. Здаровых мужчын пагналі ў Дрысу. Жанчын і дзяцей да дванаццаці гадоў везлі туды на машынах. 27 лютага 1943 года мы прыбылі ў Саласпілс.

Там пражылі тры-чатыры дні. І вось выклікалі да начальніка. Бачым біркі: кардоыныя, алюмініевыя — на чырвонай гумцы. Як бірку павесілі дзецям на шык нас — прэч з барака. Акружылі аўчаркамі. А раніцой павезлі ў Майданак. Там і загінуў мой муж Варфаламей.

**Васіль Варфаламеевіч Шандар**:

— Пасля таго як вывезлі бацькоў, мы трапілі ў баракі, толькі што пабудаваныя з сырых і мерзлых дошак, Пасцелі ніякай не было. Пасля снедання (кавалак хлеба і кава) хлопцаў ад пятнаццаці да дзевятнаццаці гадоў адпраўлялі на працу. НІчасліўчыкамі лічылі тых, каму даводзілася пераносіць дровы ў пральню. Яны маглі апынуцца каля групы зняволеных, у каго яшчэ не аднялі прадукты. Але калі стража заўважала, што хтосьці падняў з зямлі кавалак хлеба, таго каралі: білі або прымушалі выжымацца на руках. Думалася тады: хутчэй бы страціць прытомнасць — каб не адчуваць удараў.

Аднойчы зняволеная латышка (на жаль, не ведаю яе прозвішча і не памятаю лагернага нумара, бо яна працавала медсястрой і насіла белы халат) шапнула мне, што мой брат знаходзіцца ў бараку № 6 і яна дапаможа з ім сустрэцца. Парадкі ў лагеры былі жорсткія, але падпольная арганізацыя існавала: мы нават ведалі становішча на франтах. Добра была пастаўлена і ўзаемавыручка. З дапамогай медсястры я наведаў свайго брата Івана. Яму было два з паловай гады. Калі ўбачыў яго, зразумеў, што ён не жылец. Выратаваць яго я не змог.

Пераносіць голад дзецям было яшчэ цяжэй, чым дарослым. Таму мы былі рады, калі прыходзіла чарга спальваць смецце: там трапляліся бульбяныя лупіны. А ў маладым сасняку можна было назбіраць пупышак, надраць кары. Рады былі, калі ў суп траплялі конскія косці, асабліва ад капытоў касцяны сустаў: ён быў трохі мякчэйшы.

15 красавіка 1943 года нас, зусім змардаваных, пасадзілі ў аўтобус і вывезлі з лагера. Так я трапіў на хутар Дрэймані. Муж і жонка Блумы былі людзі прыязныя. Сам Блум у сельскай гаспадарцы не разбіраўся, і я, акрэплы, вельмі хутка заваяваў аўтарытэт земляроба. Працаваць даводзілася ад зары да зары, але затое я не быў

галодны. Дагэтуль не магу забыць, як кукавала мне першая зязюля. Многа тады яна мне налічыла гадоў...

Латышскую мову я засвоіў за тры месяцы, а праз паўгода запоем чытаў зімовымі вечарамі латышскія кнігі з бібліятэкі гаспадара.

**Аляксандр Варфаламеевіч Шандар**:

— Сярод дзяцей, якія засталіся ў бараку, я быў самы старэйшы. Пад маім наглядам аказаліся Пятро, Валя, Іван, а таксама пляменнік Скрыпка Васіль. І праз некаторы час мяне з Валяй адправілі ў Огрэ. Там размеркавалі па гаспадарках. Але потым каля двухсот дзяцей зноў вярнулі ў Огрэ. У аўтобусе, у якім я апынуўся, побач са мной ехаў у Рыгу ледзь жывы хлопчык. Даў яму выпіць малака. Але пакуль мы прыехалі ў горад, ён памёр.

15 красавіка 1943 года мяне, брата, сястру ўзялі ў сям'ю, дзе сваіх было двое дзяцей. Выхоўвалі нас Руткоўскія — Кацярына Іванаўна і Марцін Мікалаевіч. Як ні даглядалі нас, але Пятра так і не ўдалося выратаваць. Ён памёр ад туберкулёзу косці ў чэрвені 1948 года. Вельмі любіў маляваць. Ды не лёс...

Цудоўны чалавек быў і наш прыёмны бацька. Любілі мы яго вельмі.

Пасля вызвалення Рыгі я з сястрой пайшоў у школу. А ў жніўні 1945 года нас адправілі ў дзіцячы дом. Родная маці адшукала нас у снежні 1945 года. Памятаю, калі мы вярнуліся з бальніцы, дзе наведвалі хворага брата, дзеці нас сустрэлі радаснымі крыкамі: «Ваша мама прыехала!» На другі дзень я павёў маму да Руткоўскіх: яна хацела падзякаваць Кацярыне Іванаўне за выратаванне дзяцей.

Пасля заканчэння школы я пачаў працаваць каля Огрэ ў гаспадарцы, куды ўладкавалася і мама. У 1947 годзе паступіў у школу ФЗН, стаў будаўніком.

**Валянціна Варфаламееўна Брагіна**:

— Памятаю, як палаў наш дом, біўся на ланцугу сабака. Памятаю падводы, жывёлу, дарогу, людзей на дарозе. Згадваю Саласпілс такім: шмат людзей — голыя, яны бягуць па снезе.

Потым увайшла ў маё жыццё Кацярына Іванаўна. Перад ёй я буду ў вечным даўгу : за яе дабрыню, за тое, што ў самыя цяжкія гады яна дала прытулак (хоць у самой была вялікая сям'я) траім чужым дзецям, выратавала нас. Я прыняла яе, як сваю маці. І называла мамай, але яна мне не дазваляла гэтага. Гаварыла, што ў мяне ёсць родная мама і яна абавязкова вернецца.

Толькі потым, калі я сама стала маці, зразумела, колькі болю прынесла сваёй роднай матулі. Памятаю, калі ў 1946 годзе з дзіцячага дома прыехала на зімовыя канікулы, у доме мамы знаходзілася і

Кацярыыа Іванаўна. Я падбегла да яе, увесь вечар сядзела ў яе наўколенках, з ёю разам легла спаць.

Увогуле, мне шанцавала ў жыцці на добрых людзей. З удзячнасцю ўспамінаю настаўніцу па прозвішчу Нагле, якая, не шкадуючы ні сіл, ні часу, ўсё лета займалася са мной па латышскай мове. Дзякуючы добрым людзям я вылсыла, вывучылася... Маю цікавую работу, харошых сяброў.

Надзея Мартынаўна Нікалаева (дачка К. І. Руткоўскай):

— І вось мы паехалі па дзяцей. Памятаю, да нас хтосьці падышоў і сказаў бацьку: «Вось, Руткоўскі., твае дзеці»,— і паказаў на хлопчыка прыкладна майго ўзросту і дзяўчынку. А да іх туліўся яшчэ адзін хлопчык. Тады мама спытала: «Вы што — усе родныя?» Яны адказалі: «Родныя». Мае бацысі вырашылі іх не разлучаць: дзе двое, там і трэці.

Кацярына Іванаўна Рутісоўская:

— Узялі мы коўдру, паліточка (можа, яны маленькія?) і паехалі. Бачым: стаяць утраіх. І біркі на шыю павешаны... Калі мы вярнуліся дамоў, суседка ўбачыла нас і перахрысцілася. А я і кажу: «Можа, і не збяднеем». Так і трымаліся, пакуль не прыйшло вызваленне...

Актамі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, трафейнымі матэрыяламі і паказаннямі сведкаў пацверджана, што фашысты і іх прыслужнікі знішчылі ў Латвійскай ССР 313 798 мірных грамадзян. Сярод гэтых ахвяр генацыду было 39 835 дзяцей. І яшчэ адна лічба: з тэрыторыі рэспублікі акупанты вывезлі на катаржныя работы ў Германію 279 615 чалавек[24]... Тысячы і тысячи з гэтых людзей былі асвейцамі. Бо Саласпілс для тых, хто застаўся ў жывых, быў перасыльным лагерам, адной са «ступеней смерці». Сотні людзей розных узростаў навекі засталіся ляжаць у латышскай зямлі, пад імхом, дзірваном, пад сыпучым пяском дзюнаў...

У акце судова-медыцынскай экспертизы масавых дзіцячых магіл саласпілскага канцлагера ад 28 красавіка 1945 г. я прачытаў[25]:

«У канцэнтрацыйным лагеры Саласпілс нямецкафашысцкімі варварамі была арганізавана фабрыка кровапускання ў дзяцей для патрэб ваенных нямецкафашысцкіх шпіталяў, нават у немаўлят бралі кроў: па 100-200 грамаў за адзін раз, у выніку чаго многія з іх адразу гінулі. У старэйшых дзяцей кроў бралі часцей, па пяць і больш разоў на працягу 7-14 дзён.

Пры адступленні фашысты выкарыстоўвалі дзяцей і жанчын для прыкрыцця сваіх марскіх транспартаў ад бамбёжкі. Адзін такі

---

[24] Мы обвиняем..., с. 6-7.
[25] Мы обвиняем..., с. 208-212.

параход, які выйшаў з рыжскага порта разам з награбленай маёмасцю, вёз **Уладзіміра Гендзіка** (1935 года нараджэння, веска Мядзведзі). Увесь час, пакуль пераплывалі Балтыку, былых вязняў з Саласпілса трымалі на палубе — каб лётчыкі бачылі пасажыраў і не тапілі параход. Вось яны, словы сведкі:

— У Данцыг плылі на караблі. Фашысты з нарабаваным дабром уцякалі. Нас усіх, малых і дарослых, на палубу выгналі. І карабель не бамбілі. Нашы лётчыкі шкадавалі людзей.

Асвейцы прайпілі Саласпілс, Майданак, Асвенцім, Дахаў, Штутгоф, Маўтхаўзен, Равенсбрук і многіямногія іншыя пякельныя кругі. Многія назвы канцлагераў яны не памятаюць, асобныя — проста не могуць выгаварыць сялянскія вусны.

Мы чулі з табою, Броня, як і сёння гаруе маці. Ад яго, сына, засталася толькі памяць — і больш анічога. Усё астатняе — невядомасць. І вось з той невядомасці прыйшла да мяне вестка. На адвароце фотакарткі некалькі слоў: «На доўгую і добрую памяць сыночку Лёнечку ад таты Кобзева Сяргея Макаравіча. Сыночак, глядзі і ўспамінай свайго бацьку».

Словы гэтыя былі напісаны перад самай вайной. Той, хто пісаў іх, застыў перад фотакамерай у чырвонаармейскай форме, з нашыўкамі малодшага лейтэнанта. Ён быў мужам Шутко Соф'і Цімафееўны, з якою мы ўжо гутарылі ў Росіцы. Яна і паказала гэты даўнідаўні здымак. Толькі словы на іх адначасова і ўчарашнія, і сённяшнія, і заўтрашнія... «Глядзі і ўспамінай свайго бацьку». Ці прадчуваў воін, што прыйдзе да яго маці, свякроўкі Соф'і Цімафееўны, вось такое паведамленне: «Ваш сын, малодшы лейтэнант Кобзеў Сяргей Макаравіч, ураджэнец Варонежскай вобласці, у баі за сацыялістычную Радзіму быў верны воінскай прысязе, праявіў геройства і мужнасць, загінуў, знаходзячыся на фронце, 10 сакавіка 1943 года.

Пахаваны ў Мыскопе Верхне-Баканскага р-на Краснадарскага краю...»

Прыблізна ў час гібелі Сяргея Макаравіча яго жонка Шутко Соф'я Цімафееўна з сынам Лёткам знаходзілася ў Саласпілсе. Вось што яна расказала:

— Трушком беглі па насціле ў лазню. Маткі прытулілі да сябе дзяцей, плачуць. Праз чатыры дні каранціну зноў беглі голыя ў свой барак. Назаўтра ад «дэзінфекцыі» некалькі дзяцей памерла.

Праз два-тры дні выклікаюць па спіску да стала:

— Брасайце дзяцей!

У мяне выхапілі сына, далі прыкладам у спіну і выгналі.

У бараку, дзе дзеці, вокны чорнай паперай заклеил. Каб ні мы іх, ні яны нас не бачылі. У той дзень да баланды ніхто не дакрануўся.

Меншанькія на другі ж дзень сталі паміраць. Іх выносілі ў кошыках — і ў пясок закопвалі, пад карчы... У жывых кроў выбіралі. Засталіся трохгадовыя...

З Саласпілса Шутко Соф'ю адправілі ў Майданак. А яе сына ўзяла з канцлагера рыжанка Алена Смірнова. Ледзь выхадзіла Лёніка: такім ён быў слабенькім.

А Шутко Соф'я прайшла чорныя парогі Майданака, Асвенціма, Равенсбрука. За Гамбургам трупу ў 800 чалавек вязняў напаткалі саюзнікі-англічане. Соф'я Цімафееўна памятае, як прыехала ў іх размяшчэнне савецкая машына, як зайгралі пласцінку і пачулася песня «Ой вы, кони, вы, кони стальные...».

Два гады яна праслужыла ў вайсковай часці. Напісала знаёмай у Бігосава, дык тая адказала: «У Росіцы — адзін бур'ян. Ніводнага чалавека...»

І ўсё ж Соф'я Шутко вярнулася на бацькаўшчыну. Пачала шукаць сына. З Міністэрства асветы Латвіі ў 1949 годзе ёй напісалі, што «Шутко Аляксей Сяргеевіч, 1939 года нараджэння, на ўліку дзіцячых дамоў не значыцца».

Бацька яго хацеў назваць Лёнікам. Але так атрымалася, што ўсе дома пачалі зваць Лёшкам, Ляксеем. Шукалі Аляксея і родзічы з Варашылаўградскай вобласці. З Міністэрства ўнутраных спраў ЛССР родзічам нарэшце паведамілі, што ў выніку вышуку ўстаноўлена: Шутко Аляксей да 1945 года знаходзіўся ў грамадзянкі Смірновай Алены, а ў 1945 годзе ўзяты на выхаванне маёрам Савецкай Арміі Шалыгіным Дзмітрыем Андрэевічам, 1912 года нараджэння, які выехаў у Эстонскую ССР».

У апошнім абзацы было сказана: «Адначасова паведамляем, што, паводле тлумачэнняў гр-кі Смірновай, дзіцё знаходзіцца ў добрых умовах, вучыцца ў школе».

Але здарылася так, што гэта вестка да роднай маці не дайшла. Так ужо, відаць, распарадзіўся лёс. Ёй яшчэ ў 1954 годзе пісалі з Міністэрства асветы ЛССР наступнае:

«Аддзел дзіцячых дамоў Міністэрства асветы Латвійскай ССР паведамляе, што няпоўналетні Шутко Аляксей Сяргеевіч, 1939 года нараджэння, у дзіцячых дамах Латвійскай ССР не лічыцца і не лічыўся, а таксама на ўліку ўсыноўленых дзяцей не значыцца».

17 гадоў было Алёшу, калі яго наведала родная мама. Трывога і радасць змянілася болем. Сын не адразу прызнаў яе. Перад Соф'яй Цімафееўнай Шутко стаяў Шалыгін Аляксей Дзмітрыевіч. Спатрэ-

білася некалькі гадоў, перш чым Аляксей прыслаў у Росіцу фотаздымак свайго вяселля, якое адбылося 18 лістапада 1962 года. На ёй напісана: «Дарагой маме ад сына Аляксея і ад дачкі Вольгі».

З Соф'яй Цімафееўнай я гаварыў у Росіцы. Два яе браты, як і муж, не вярнуліся з фронту. Вякуе разам з трэцім братам — Аляксандрам, у якога ў гэтай жа самай Росіцы карнікі спалілі жонку і дачку.

Як дзве абвугленыя галінкі, стукаюцца ў званы жыцця дзве іхнія долі.

Але могуць сведчыць не толькі людзі, а і дакументы з часоў акупацыі. Адзін з іх — перада мною. Ды ўжо пра другую Шутко.

«І. (Толькі для бежанцаў ваеннага часу з тэрыторыі СССР. Латвійская генеральная акруга. Пасведчанне асобы № 1160. Тэрмін годнасці — да 7 ліпеня 1944 г. Прозвішча — Шутко, імя — Тамара. Дата нараджэння — 1935 г. (Фотакартка). (Пячатка). Подпіс адсутнічае з прычыны малалецтва ўладальніка пасведчання. Адбітак указальнага пальца левай рукі. Адбітак указальнага пальца правай рукі. Рыга, 7 лістапада 1943 г. Апазнавальны знак дзіцяці № 5223».

ІІ. «Дагавор аб патранажы над дзіцем. Міністэрства асветы здае і грамадзянка Зіедыньш Лізавета... прымае на патранаж, народжаную 7 лістапада 1935 г., Шутко Тамару Мікалаеўну, лічачы з 15 кастрычніка 1944 года... Звесткі аб бацьках дзіцяці. Бацькі расстраляны як партызаны».

Калі я быў у хаце Аляксандра і Марыі Скрыпкаў і яны мне расказвалі пра свой лёс, там я сустрэў і іх дачку, Ніну. Далейшая гаворка будзе мець самае непасрэднае дачыненне да ўжо згаданага дакумента.

Ніна Аляксандраўна прыехала да бацькоў з Рыгі. Жыве там. Як і сотні былых вязняў-асвейцаў, яе прыгарнула Савецкая Латвія.

— А ці ты расказала пра свайго бацьку? — звярнулася Ніна Аляксандраўна да мамы.

Не, Марыя Пятроўна не кранала яшчэ аднаго пякучага болю. А тая трагедыя адбылася за паўгода да карнай экспедыцыі ў лютым 1943 года.

Тут жа, у Росіцы, жыла вялікая сям'я Пятра Шутка, бацькі Марыі Пятроўны. Дар'я — яго жонка, Ганна — нявестка, Мікалай — сын (брат Марыі Пятроўны, у іх — двое дзяцей: Шура — дзевяць гадоў, Тома — сем. І жылі тут бабуля з дзядулем, дапамагалі ўнукаў гадаваць. Шутко Пётр да вайны служыў лесніком, быў сваім чалавекам у партызан. Па нейкаму злому даносу, а можа, і высачылі партызана, у двор Пятра Шутка аднойчы наляцела аблава. Ніна якраз была ў іх у гасцях.

— У сенях было двое дзвярэй. Пачула, як расчыніліся першыя, і там адразу ж пачалі страляць. На гэты ж час цётка Ганна выйшла пакарміць статак, а дзядзька на печы грэўся. Бабулі ў плячо разрыўная куля трапіла, дзядуля моцны стары быў, у яго два разы стралялі. Пасля першага стрэлу ён крыкнуў: «Божа, божа!» А яму: «Божа, божа?» І яшчэ раз стрэлілі. Дзядзька ў кутку асунуўся: яму ў жывот трапіла. Шуру і Тому пасля першых жа стрэлаў аглушыла, і яны паваліліся. Гэта я потым усё расцяміла, а пасля першага стрэлу ў сенцах у мяне толькі адна думка мільгнула: «Дзе схавацца?» У падпол? Знойдуць. І я шусь у падпечак (высокім быў) і за вугал схавалася. Пасля ўсёй расправы, чую, правяраюць хату. Падыходзяць да печы. Ну, думаю, па мяне. Валасы дыбам падняліся. Нехта нагнуўся, паглядзеў — не ўбачыў. Пайшлі. У сенцах заплакалі Шура з Томай. Загаласілі абое. Трэба ж, што тады мне запомнится — Шура слязамі давіцца: «Ну, хоць бы мой тата застаўся...» І Тома плача: «А хоць бы мая мама засталася...»

Пасля таго расстрэлу мы прыбеглі да мамінай сястры. Назаўтра партызаны хавалі ахвяр.

Гэта забойства адбылося яшчэ да карнай экспедыцыі. Захоп «жыццёвай прасторы для немцаў» не прадугледжваў існавання на ёй спрадвечных гаспадароў. Нездарма ў паказаннях згаданага ўжо Экельна ёсць такія радкі: «Гітлер сказаў, што работу ў «Остландзе» я павінен паставіць так, каб ва ўсёй тэрыторыі Прыбалтыкі і Беларусі быў поўны спакой...» Была праведзена такая «работа» і ў хаце Пятра Шутка.

Ніна Аляксандраўна пры нашай сустрэчы мне перадала рыжскі адрас Томы, якую ў той жахлівы чае разам з братам Шурам не паспелі забіць у росіцкай хаце. І вось я на вуліцы Гробіняс у Рызе і зноў елухаю страхотнае апавяданне пра расстрэл сям'і лесніка.

**Тамара Мікалаеўна Шутко** расказвае:

— Спачатку на вуліцы пачуліся крокі, потым у двары. Чуем стрэлы. Мама ўсім нам: «У хату!» —і зачыніла дзверы на засаўку. Стукаюць. Мы не адкрываем. Страшна завішчаў у хляве падсвінак. Мама не магла трываць, калі мучаць жывёліну. І адчыніла дзверы. Яе забілі прама з парога. У сэрца. Ойкнула і ўпала. Ёй на дапамогу кінуўся бацька. Яго ў жывот... Тут дзядуля, утрапёны, выскачыў. І яго... І бабулю... З хаты ў сенцы сыпанулі і мы: я з братам. Страляў доўгі, цыбаты, з цыгарэтай. Паглядзеў на нас, анямелых, засмяяўся...

Нас дваіх узялі матчыны бацькі. Пасяліліся ў Крэўніках. Хата — каля самага лесу. Да нас кожную ноч партызаны прыходзілі.

Калі тут з'явіліся карнікі, веска наша рушыла ў лес. Мы — апошнія ў абозе. Памятаю світанне: белыбелы снег і зыркае сонца над ім. Нават каровы той раніцой не мыкалі: усе баяліся карнікаў. І ўсё ж яны нас акружылі і пагналі ў Росіцу. Па дарозе бачыла, як дагарала мая родная хата, дзе восенню забілі бацькоў. Запомнілася, як гарэлі яблыні: нейкім дзіўным ружовым агнём.

Мужчын і жанчын аддзялілі, а дзяцей павялі ў касцёл. Яшчэ не зачыніліся за мной дзверы, і я бачыла, як адзін дзядуля хацеў выкінуцца з апавітага полымем дома. Мяне з брацікам штурхнулі, за спіной ляснула засаўка...

Колькі прабылі ў касцёле, не памятаю. Зноў ехалі на падводзе. Каля кожнай спаленай вёскі карнікі падсаджвалі на воз якое-небудзь дзіцятка. Каля аднаго двара падвода спынілася. Бачу: фашыст ідзе за весніцы. На панадворку жанчына трымае дзіця. Карнік хапае яго і б'е аб вугал галавой. І сам подбегам весела кіруе на падводу. Жанчына з немым крыкам за ім. Карнік лоўка рвануў аўтамат — і жанчына мёртвая кульнулася прама пад калёсы.

Иа тых падводах мы аж да Дзвінека даехалі. І толькі там нас перагрузілі ў вагоны. Цэлы цягнік дзяцей быў дастаўлены ў Саласпілс. Там загадалі распрануцца, ісці ў лазюо. Няпаленую. Лаўкі з гарбылёў, сцюдзёныя ад марозу. Смуроднае мыла...

У лагеры я ўбачыла сваю цётку, Алену Саўруцкую. З ёю было двое дзетак: шасцігадовая Феня і Коля васьмі гадоў. Учатырох мы і трымаліся.

Часам у блок заходзіла тоўстая цётка. Пройдзе, паглядзіць на нас, ацэніць. Здаравейшага адводзілі, перавязвалі жгутом руку, утыкалі іголку. Пасля такой працэдуры давалі міску баланды. У бараку супроць нараў быў прагал. Памятаю, як спецыяльная каманда сноўдала па нарах, збірала трупы дзетак і складвала іх на прагал.

Вясной мы выходзілі «на промысел». Елі траву, якая толькі траплялася, выкопвалі чарвей. Добрых такіх дажджавых чарвякоў выкалупвалі. І, о божа, таксама елі іх.

Як выжыла? Тут не лес. Хутчэй выпадковасць.

З Саласпілса мы трапілі ў дзіцячы дом. Ён размяшчаўся ў Рызе. Там пражылі месяцы чатыры. Потым мы з братам захварэлі на свінку. Нас разлучылі, і мы згубіліся амаль на... дваццаць гадоў.

Восенню 1943 года я трапіла ў Саўлкрасты, у арганізаваны акупантамі дзіцячы «прытулак». Кармілі там толькі адной бульбай. Адвараць яе і выкацяць на стол. Хадзілі мы як павукі: на тонкіх ножках, з апухлымі віслымі жыватамі. Хадзілі і восенню босыя.

«Прытулак» быў на беразе мора, падбіраліся мы і да рыбакоў, выпрошвалі рыбу. Елі адразу ж на беразе, сырую.

Наязджалі ў «прытулак» нейкія дабрачынныя дамы. Выбіралі дзяцей, забіралі. З адной з іх была знаёма Лізавета Францаўна Зіедынын. Я яе аднойчы бачыла ў «прытулку». Ёй спадабалася мая дваюрадная сястра Феня. Прыглядалася да дзяўчынкі. Відаць было, што хацела ўдачарыць...

...Гэта было 7 лістапада 1943 года. Гадавіна Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Дзень нараджэння Савецкай улады. У гэты дзень у «прытулку» зноў паявілася Лізавета Францаўна. Забаўляла нас, наставала. А потым сказала: «Хто хоча да мяне ў дочкі?» Усе дзяўчаткі пабеглі да яе. Усе хацелі быць яе дочкамі. А я засталася каля сцяны. Не падбегла. Лізавета Францаўна сумелася: «А ты?» — «Я не хачу,— прамовіла. І схлусіла: — У мяне ёсць мама». Я ўжо ведала, што ёй падабаецца Феня. Думала, як жа я пабягу ў дочкі прасіцца. Лізавета Францаўна тады падышла да мяне і сказала: «Ад сёння, Томачка, я твая мама».

Гэта было 7 лістапада 1943 года. Той дзень стаў для мяне днём нараджэння. Я не ведаю, калі нарадзілася ў сапраўднасці: усе ж дакументы згарэлі. Але ў гэтыдзень да мяне падышла з лагоднай усмешкай жанчына і назвалася маёй мамай. Ці магла быць большая радасць для маленькага вязня?

Фашысцкая няволя выхоўвала з нас рабоў. Тая рабская псіхалогія праяўлялася ў самых нечаканых момантах. Вось мяне прывезлі з Саўлкрастаў. Прывялі ў хату. Пасадзілі за стол. Я ўсёй душой згодна, што Лізавета Францаўна мая мама. Насупраць мяне за сталом яе муж. Яна гаворыць пра гэта. А я пытаюся: «Гэта мой гаспадар?»

Мама, успамінаючы той час, сказала, што я цэлы год пасля няволі не ўмела... смяяцца. Ніяк не атрымлівалася ў мяне ўсмешка. Мае вусны і душа былі адвучаны ад радасці...

Не раз прыходзілі да Зіедыньшаў акупанты забіраць мяне на параход. Прыходзілі жандары: адпраўляўся транспарт у Нямеччыну... Але, як свайго роднага сына Эйжэна, бераглі яны і мяне. Выгадавалі, вывучылі. Год працавала ў Фрунзе паліграфістам. Прыхварэла. Вярнулася да мамы. Назаўсёды. Тут, у Рызе, і правяла яе ў апошні шлях.

А брата Аляксандра знайшла выпадкова. Аднойчы ў электрычцы ехала. У другім канцы вагона хлопцы гаманілі. Аднаго то Сашкам называлі, то Шутко. На прыпынку гурт высыпаў на перон, а я ледзь дачакалася Рыгі — і ў адрасны стол. Жыве Шутко ў Яўнелгаве, адказалі мне, на хутары Ушуры. Ніводнага дня не чакала. Адразу ж напісала заяву на адпачынак і паехала да брата.

Кружу каля хутара і ніяк не магу зайсці ў хату. Баюся: а раптам не брат тут жыве. Нарэшце рашылася, адчыняю весніцы. Насустрач выйшла цётка, латышка.

— Тут Аляксандр Шутко жыве?

— А ты — Тамара? — усклікнула латышка.

Я не ўтрымалася на нагах і села на траву. І ад радасці, і ад нечаканасці.

— А ў вас пагляд аднолькавы,— растлумачыла мне Сашава мама сакрэт такога хуткага пазнання. Аказваецца, гэтая латышка ўзяла хворага Сашу. Яна з мужам мела сваіх сына і дачку. Хлопца паставілі на ногі, выгадавалі. Як і бацька родны, ён стаў лесніком, закончыў тэхнікум. Гэта Сашу каштавала многа сілы, волі, бо ён хлапчуком падарваўся на міне — асколкі руку і вока пашкодзілі. Але стаў моцны дзяцюк. Ажаніўся з латышкай. І калі яго мама састарэла і ў яе запыталіся, дзе будзе дажываць свой век, яна выбрала Сашу: «Ён жа сынок мой...»

У 1961 родзе Тамара Мікалаеўна наведала Беларусь і знайшла магілу бацькоў. Праз год яна знайшла брата Аляксандра, у саласпілскім паліточку якога былі зашыты даваенныя фотаздымкі родных таты і мамы. У яе апратку цётка Саўруцкая таксама зашыла фотакартку родных. І яшчэ адзін дакумент паказала мне Тамара Мікалаеўна — уласную бірку, якую акупанты прывязалі ёй да шыі для апазнання саласпілскіх вязняў. Бірка — гэта праткнуты цвіком шматок вокладкі з даўняй кнігі. На ёй па-нямецку надрукавана: «Шутко Тамара. Транспарт № 2. Без бацькоў». Да біркі, відаць, перад адпраўленнем у дзіцячы дом, была прыклеена палоска паперы. На ёй па-латышску напісана пяром: «Шутко Тамара. 1935 года нараджэння, Дрысенскага раёна Росіцкай воласці, в. Росіца. Бацька і маці расстраляны. Брат Аляксандр з сястрой бацькі знаходзяцца ў Саласпілскім лагеры (паводле яе расказу)».

Пазнаёміўся я і з «Дагаворам аб патранажы над дзіцем», выдадзеным ужо ў савецкі час і падпісаным Лізаветай Зіедыньш. Перачытваю асобныя пункты: «...даваць дзіцяці добрыя парады і настаўленні, добры прыклад у старанні, парадку і маралі, каб у ім абудзілася любоў да праўдзівасці, пачуццё абавязкаў сумленнага савецкага грамадзяніна, любоў да прыроды, да сваёй Радзімы».

Рыжанка Лізавета Францаўна Зіедыньш да апошняга слоўца споўніла святы мацярынскі абавязак. І вось пра што яшчэ думаю: Тамара Шутко, саласпілскі вязень з біркай ад кніжнай вокладкі, з апазнавальным знакам № 5223, сваё жыццё прысвяціла паліграфіі, набору светлых літар пад светлыя кніжныя вокладкі, якія ніколі больш

не павінны стаць жудаснымі біркамі дзіцячага рабства, апазнавальнымі знакамі новай вайны.

Многа прагалаў засталося на радаводным дрэве Тамары Мікалаеўны Шутко. Пакалечана яе бярозка, але жыве, мацуецца побач з іншымі яе слаўнае дрэва жыцця.

А жыццё — працягваецца. З яго віроў глядзяць шчырымі вачанятамі кветкі шыпшыны, бы чалавечы пульс, гучыць з яго віроў метраном Саласпілса. Памяць не сцішаецца.

Чалавек заўсёды ў руху — да памяці.

## КРЫЛО РАДЗІМЫ

*Не згасае, не згасне імя:*
*партызаны...*
*франтавікі...*
*Не імгненні плывуць, а вякі.*
*Я наддзвінскую клічу зару:*
*з песняй памяці я не згару,—*
*адплываю ў надзейныя дні*
*з абярэмам зямной цішыні.*

### Частка першая

У гэту кнігу, Браніслава, трапілі не ўсе ўспаміны асвейцаў. А запоўнены былі сотні старонак, атрыманы дзесяткі лістоў з розных мясцін нашай краіны. Восем гадоў я ўжо збіраю для цябе, Браніслава, матэрыял. Але ці толькі для цябе? Углядаюся ў твае вочы і ўяўляю крутабег часу: вунь маленькая дзяўчынка прастуе (за некалькі гадзін да вайны!) між кустоўя; вунь ты з мамай стаілася за дротам фашысцкага канцлагера, а на павеках застыў попел Асвейшчыны; вунь ты ўжо са сваім дзіцём узыходзіш на пліты Саласпілса; вунь ты шукаеш сваю радню...

Дзяўчынка... Сірата... Маці... А яшчэ каго можна ўявіць у тваіх вачах? Ці не сама Беларусь углядаецца ў трывожнае неба? Страціла кожнага чацвёртага — а не сірата ў брацкай сям'і народаў Краіны Саветаў; вымучаная і пакалечаная ворагам — а не зласлівая і помслівая ў сваёй гіетарычнай памяці; з працавітай рашучасцю, з надзеяй у сэрцы — гатовая тварыць мір, адстойваць праўду нашага ладу жыцця...

А «ўзнаванне», Браніслава, прадаўжаецца, бо наш пошук — йе закончаны.

І нібы з віроў жыцця далятаюць да цябе, Браніслава, новыя веесткі. Пішуць твае равесніцы, пішуць тыя мацяркі, якія маюць дзяцей «саласпілскага» ўзросту. Глядзяць на іх жанчыны і трывожацца за лёс сваіх гадаванцаў. Хоць бы не было новай вайны, хоць бы не напаткала іх новае полымя, уеёзнішчальнае полымя смерці.

Толькі вярнуўся я аднойчы з Задзежжа, а мне ўслед пісьмо: «Вы прыязджалі да нас, ды мяне не аказалася дома. Вы прасілі ўспомніць усё перажытае. Многа чаго ўспомніць не магу, таму што тады мне было ўсяго 8 гадоў. Нас забралі карнікі каля вёскі Маторына Расонскага раёна. Старых паставілі асобна і каля рэчкі Свольна

расстралялі. Дзяцей і здаравейшых жанчын пагналі на станцыю Дрыса. Так вось мы аказаліся ў Саласпілсе. Колькі ў лагеры прабыў — не памятаю, але не забыць той дзень, калі мяне разлучылі з маткай. Я застаўся з двума братамі, яшчэ меншымі, чым я. Разам мы прабылі мала: нас зноў разлучылі. Большых, каторыя маглі працаваць — пасвіць скаціну, насіць дровы, ваду,— пасадзілі ў аўтамашыны і павезлі на станцыю Сунтажы. Так я трапіў да Тэадора Ірбіціса. Гаспадыню звалі Элеанорай. Я і па сёння захоўваю іх фотакарткі. Ставіліся яны да мяне добра. І так як не мелі сваіх дзяцей, хацелі мяне ўсынавіць, перапісаць на сваё прозвішча.

Мама мяне знайшла на хутары Ірбіціс аў незадоўга да прыходу нашага войска. Але яшчэ акуианты былі ў сіле, ды і куды мама магла б мяне павезці? Таму засталася працаваць на суседнім хутары, абы бліжэй да мяне... Калі прыйшла Чырвоная Армія, мой былы гаспадар прапанаваў застацца жыць у іх, бо ведаў, што Беларусь амаль поўнасцю разбурана. Але мама не змагла застацца, падзякавала чалавеку, і мы рушылі на радзіму. Тэадор Ірбіціс падарыў нам карову, даў мукі, насення...

На месцы нашага пасёлка стаяў пустыр. Пачалі з зямлянак. Памагаць не было каму: мой бацька Іван Сцяпанавіч не вярнуўся з вайны. Ён загінуў на фронце яшчэ ў 1941 годзе. А мае браты Віця і Толік, з кім трапіў у Саласпілс, не знайшліся і па сённяшні дзень.

Зараз я працую механізатарам у калгасе «Каханавічы». Жывём у дастатку.

Вось і ўсё, што я мог вам напісаць. **Гузік Алег Іванавіч**».

Адразу ж хачу расказаць яшчэ пра адно пісьмо — ад Дзямідава, інжынера з Кіева, члена КПСС з 1936 года.

Веска Дубровы, дзе нарадзіўся Дзямідаў Маркіян Дзмітрыевіч, стаяла за 25 кіламетраў ад мяжы з Латвіяй і ў 15 кіламетрах — ад РСФСР. Ужо ў каицы 1941 года тут дзеййічалі атрады рускіх, латышскіх, беларускіх партызан. Яны былі гаспадарамі на ўсёй тэрыторыі раёна. З-за лініі фронту прыбывалі самалёты: якраз за вёскай Дубровы быў партызанскі аэрадром. Лясныя салдаты не давалі спакою акупантам.

У час карнай экепедыцыі, калі палілі вёску, маці Маркіяна выхапіла сына з калоны людзей, якіх вялі ў агонь. З Саласпілса Маркіян разам з братам яго маці Аляксандрам трапіў на хутар да гаспадара, які калісьці быў салдатам царскай арміі і мог так-сяк гаварыць па-руску. Хутар стаяў недалёка ад чыгункі, і ваеннапалонныя, якія працавалі побач, расказвалі хлопцам: калі ісці ўвесь час на ўсход, яны трапяць на сваю радзіму, у Беларусь.

І хлопцы вырашылі паспрабаваць шчасця. Набралі ў кішэні морквы, гароху і рушылі ў дарогу. Праз два тыдні дабраліся да граніцы. Але на родную зямлю ступіць не ўдалося: на Асвейшчыне праходзіла чарговая карная экспедыцыя. Давялося за кавалак хлеба працаваць на хутарах. Не абышлося без паліцыі: хлопцы былі сфатаграфаваны, з іх знялі допыт.

Іх вызваліла Чырвоная Армія летам 1944 года. Усякага зладзейства фашыстаў нагледзеліся хлопцывязні, але калі ступілі на родную зямлю, сэрца замерла. Усюды — спаленыя вёскі. Над зямлёй узвышаліся толькі печы з чорнымі комінамі. І ў Дуброве яны ўбачылі зямлянкі. Хлопцаў пазнала суседка, пусціла ў сваю зямлянку, дзе ўжо жылі дзве сям'і.

Каля Дубровы перасталі існаваць вёскі Курашы, Слабодка, Ярохі, Макуты... У асобныя спаленыя вёскі змаглі вярнуцца толькі 2-3 сям'і.

«У тым жа годзе я пайшоў у першы клас,— піша ў сваіх успамінах Дзямідаў.— Урокі праходзілі ў зямлянках. Вучыліся грамаце так: пісалі палачкамі па земляной падлозе, бо паперы, ручак, алоўкаў не было...»

Далёка разлегліся дарогі былых асвейцаў. Жывуць яны ў Сібіры і на Урале, у Ленінградзе і на Украіне. Марыя Кірылаўна Ермакова (Глінская), родам з вёскі Кісялі на Верхнядзвіншчыне, адгукнулася з Клайпеды:

«Многіх хлапчукоў з Саласпілса акупанты аддалі ў пастухі. Мой брат Пецця трапіў у сям'ю Браслінышаў. Гаспадары аказаліся добрымі людзьмі, клапаціліся аб ім. А калі ён расказаў гаспадыні Эрмінэ аб тым, што ў лагеры засталася яго маленькая сястрычка Марыя, гэта значыць, я, Браслінышы дабіліся дазволу ў ліпені 1943 года ўзяць мяне з лагера. Эрнэст Браслінш расказваў, што выцягнуў мяне, у поўным сэнсе гэтага слова, з таго свету. У Саласпілсе існаваў такі парадак: вельмі знясіленых дзяцей запіхвалі ў скрыні, якія потым і закопвалі за агароджай лагера. Хоць і жывой, але зусім аслабелай я таксама была ўпакавана ў скрыню. Вось такой ратавала мяне Эрміна Браслінш.

У 1946 годзе мая родная мама прыехала ў Латвію на пошукі дзяцей. Яна сустрэлася з намі, а старэйшую сястру Яўгенію мы знайшлі ў вёсцы Ліелстраўпэ Цэсіскага раёна ў Мацільды Лагздынын. Гаспадыня аказалася вельмі добрая і адукаваная жанчына. Мацільда Лагздынын падарыла Яўгеніі карову, выслабаніла пакой, і мы сталі жыць разам...»

Яшчэ хачу сказаць, што Эрміну Браслінш забілі фашысты за дапамогу вязням лагера. А сястра Яўгенія з маці і цяпер жывуць ў

саўгасе імя Леніна ў Цэсіскім раёне, Яўгенія — заслужаная работніца сельскай гаспадаркі Латвіі, узнагароджана ордэнам «Знак ХІашаны».

Зноў еду ў Рыгу. А калёсы вагона нібы паўтараюць жахлівы перастук апаленых сэрцаў былых вязняўасвейцаў. Па гэтай чыгунцы людзі ехалі ў невядомае... Каб жа можна было расшыфраваць, пра што гавораць колы на стыках чыгуначнага палатна! Можа, пра тое...

«Мяне і маю сям'ю з дзевяці душ схапілі і прыгналі ў росіцкі касцёл, дзе ўжо знаходзілася каля 1000 чалавек рознага ўзросту. Пасля трох сутак здзекаў тых, каго не спалілі, павезлі ў Саласпілс. У нас там загінула трое дзяцей. Мая жонка, пакутуючы ад гора, што лрынеслі фашысты, выплакала свае вочы, аслепла...»

Не, гэта не рэйкі прагрукаталі такія словы. Іх напісаў Саўлук Аляксандр Мацвеевіч з вёскі Канчаны.

Я вязу да цябе, Броня, вялікі багаж, цяжкі груз узяў з сабой у дарогу. Я вязу цяжкую і горкую памяць, памяць успамінаў.

І вось ужо цягнік імчыць па латышскай зямлі. Паўтараю, Броня, і твой даўні шлях. Паўтараю пякучы шлях Ліны Данатаўны Раводзінай з горада Куйбышава. Тады, у лютым 1943 года, яна была 6-гадовай Ліначкай Барона з вёскі Карценева. Прачытай, калі ласка, Броня, яшчэ адну вестку:

«Мне было тады шэсць гадоў, калі гарэлі побач вёскі і людзі беглі да Карценева (яна была на поўдзень ад чыгункі.— С. П. ) і да Латвіі, каб ратавацца. Нам ужо перадалі, што ў вёсцы Ліпаўкі спалілі маю родную бабулю і дзядзю з цёцяй. Мы чакалі такой жа расправы. І вось Карценева запоўнілі эсэсаўцы ў маскхалатах, на якіх былі намаляваны чэрап і косці...

У Сушках мяне з мамай загналі ў хлеў, набіты лк>дзьмі, і хацелі спаліць на віду астатніх, хто ў гэты хлеў не змясціўся. Нам было чуваць, як шастала салома: карнікі складвалі яе на падпалку. Было страшна: усе крычалі і плакалі.

Але нас не спалілі. Вецер павярнуўся з невыгоднага боку, і калі б хлеў загарэўся, то побач згарэлі б клуб і стайня, дзе размяшчаліся карнікі (так тлумачылі потым жыхары).

У Саласпілсе ў мамы нейкім цудам захавалася сумачка са здымкамі родных і блізкіх. Мы часта іх разглядалі і плакалі.

Па лагеры заўсёды разносіліся стогны і плач. Насупраць маіх нараў былі нары жанчыны з нашага сяла. І калі ў яе аднялі дзвюх дзяўчынак, яна страціла розум. Пасівела ўся ад гора і толькі нема крычала. Стамброўскую павялі, і больш ужо ніхто не бачыў пакутніцу. А дзяўчаткі выжылі і зараз працуюць у Рызе. Толькі адраса іх не ведаю.

Настаў той дзень, калі і мяне аднялі ад мамы. Назвалі наша прозвішча: «Барона!» Мама крэпка мяне пацалавала і, прыцiснуўшы да сябе, пачала злазіць з нараў. Нас прымусілі праз строй фашыстаў ісці на выхад. Гэта была цяжкая для нас дарожка. Мама ўся аслабела, але яшчэ моцна трымала мяне за руку. Яна думала, што бачыць мяне апошні раз, бо ведала, што тады рабілі з дзецьмі. Ужо на дварэ карнік схапіў мяне за руку і адарваў ад мамы. Маму адкіыулі ў другі бок. Дзіцячы барак быў цесна акружаны салдатамі. А перад імі крычалі маткі.

У гэты час у дзіцячым бараку нас пачалі забаўляць рознымі цацкамі, абаранкамі. Каб супакоіць, гаварылі, што нашы мамы за намі прыйдуць. Можа, і было б усё нармальна, ды мая мама неяк злаўчылася прабіцца праз заслон і падбегла да барака, падцягнулася да высокага акна і зазірнула, што там з намі робяць. Невядома чаго я ў гэту хвіліну глянула ў акно, убачыла яе твар і закрычала: «Мама!»

Усе дзеці ўскінуліся, ажывіліся. Фашыст збіў маму прыкладам з падаконніка і пачаў яе таптаць. Вязням удалося забраць маму ў свой гурт. Яны трымалі яе пад рукі, бо ляжачых расстрэльвалі на месцы...

Аднойчы нас вывелі з барака, пасадзілі на машыну і павезлі. Мы так саслабелі, што многія падалі з сядзенняў, іх укачвала. Я з нейкай дзяўчынкай уладкавалася наперадзе. Памятаю, што перада мной сядзеў тоўсты салдат. Патыліца ў яго была чырвоная і порыстая. Я, відаць, таксама траціла прытомнасць, але баялася ўпасці. Таму сядзела, глядзела на тую патыліцу і лічыла на ёй дзірачкі...

Нас прывезлі ў Ігатэ, пасялілі. Побач было не то возера, не то рэчка, зарослая высокай травой. Мы капалі карэнне аеру і елі: яно было салодкае. Памятаю, што нам заўсёды хацелася есці. Недалёка быў сметнік, дык мы і там часцяком шукалі што годнае для ежы і для цацак. Восенню хадзілі пад ліпы і збіралі ліпавыя гарошынкі. Пад дубамі шукалі жалуды.

Між сабой гаварылі мала. Нам не дазваляла гаварыць па-свойму акупацыйная адміністрацыя. Тут з нас рыхтавалі гітлераўцы сваіх будучых рабоў.

У кутку нашага пакоя заўсёды стаяла вядро з вадой, дзе моклі бярозавыя дубцы. Нас частавалі «бярозавай кашай» за кожны няправільны крок, за кожнае слова, вымаўленае на сваёй мове.

Мой ложак у Ігатэ стаяў насупраць акна, у якое стукаліся голыя галінкі. Было жудасна на душы, холадна і галодна. Заўсёды ўяўлялася мама, быццам яна дзесьці прабіраецца да мяне, хапаецца за падаконнік і хоча зазірнуць у акно, а калючыя сукі высахлага дрэва яе не падпускаюць. І я ноччу, каб ніхто не бачыў, ціхенька

падымалася з ложка, падыходзіла да акна і вачамі шукала маму ў цемені.

А потым нехта прыдумаў, што нашы мамы плылі да нас на параходзе, карабель той затануў і яны — таксама. З такой думкай і жылі, што ў нас нікога больш няма, што мы нікому не патрэбныя. Часам нас некуды адвозілі дактары ў белых халатах. А калі прывозілі, то сілы ўжо не было, мы толькі ляжалі. І ўсё з памяці тады некуды адплывала.

Летам 1944 года нейкая пажылая жанчына ўзяла мяне з «прытулка» да сябе на хутар. І хоць яна мяне не крыўдзіла, але я і там не наядалася, бо папрасіць лішнюю скарынку хлеба і не ўмела і баялася. Нас у Ігатэ нрывучылі да пакоры і маўчання, адтуль я магла выйсці толькі рабыняй.

Але прыйшоў час, калі нашы салдаты прагналі вора г а„ Некалькі воінаў прыбыло да маёй гаспадыні на пастой. Адзін еалдат прыкмеціў маю пужлівасць і замкнёнасць, прылашчыў мяне. Я папрасіла яго забраць мяне з сабой і адвезці на Беларусь. Ды што ён мог зрабіць? Трэба было гнаць фашыстаў на захад.

Праз некаторы час у вызваленым Ігатэ быў адкрыты савецкі дзіцячы дом, і я трапіла туды. Мае сябры ўсе засталіся жывымі. Ратавала іх адна жанчына, якая і пры немцах даглядала дзяцей. Калі пры адступленні фашысты рыхтаваліся ўзарваць дзіцячы прытулак, яна паспела вывесці дзяцей у лес і схаваць іх там. Хадзілі слухі, быццам тая жанчына была звязана пры акупацыі ці з падпольшчыкамі, ці з партызанамі. Яна і стала дырэктарам дзіцячага дома пасля вызвалення. З нагоды ўспомню такі выпадак. Аднойчы, яшчэ пры акупацыі, яна выклікала мяне да сябе ў пакой і паказала паштоўку, якая прыйшла ад маёй цёці Гілуць Соф'і (цёця жыве зараз у Бігосаве). У яе ў Саласпілсе аднялі траіх дзяцей. Сын цёці, 1936 года нараджэння, прапаў без вестак, дачку знайшла пазней, самага меншанькага сына замучылі ў Саласпілсе. Тут хачу згадаць і такое. Яшчэ ў Саласпілсе Гілуць Соф'я аднойчы аддала сваю пайку хлеба наглядчыцы дзіцячага барака, каб толькі глянуць на сваё немаўлятка. Тая прапусціла, але калі цёця ўбачыла яго, мёртвага і з ад'едзенымі пацукамі пяткамі, адразу самлела.

У хутараніна цёця часта плакала, бедавала, і ён рашыўся дапамагчы ёй знайсці дзяцей. Вось якім чынам трапіла яе паштоўка ў Ігатэ. Мая абаронца напісала па-латышску адказ цёці Соф'і, а я намалявала кветку, бо сама пісаць не ўмела.

Пасля вайны цёця Соф'я паведаміла пра мяне ў Карценева. Вёска наша не была спалена. Мае сестры вярнуліся дадому, а брат, аказваецца, загінуў за вызваленне Латвіі. Сястра Леакадзія напісала

мне ў Ігатэ, што збірае грошы на паездку па мяне. Перапісвалася з ёй зноў жа мая дырэктарка. Во я ўмела цяпер пісаць і гаварыць толькі па-латышску. У гэты час у маім дзіцячым доме былі іншыя выхавацелькі, мы адчувалі іх ласку і пяшчоту. Бегалі мы і да нашых салдат. Так хацелася, каб яны палюлялі на сваіх дужых руках.

Летам 1945 года я пасвіла кароў на адным з хутароў. За нашу работу людзі прывозілі прадукты ў дзіцячы дом. Г'аспадыня добра ставілася да мяне. Ёй было гадоў трыццаць, яна жыла разам са сваёй маці; хацела мяне нават удачарыць, але я ўжо ведала, што па мяне прыедуць, і жыла толькі чаканнем. А гэта было так цяжка — чакаць. На хутары ў мяне было сабачанё, мой друг, з якім я размаўляла ў полі, калі пасвіла кароў. Абдыму сабачку і шапчу яму ў вуха, як мне цяжка жылося, як я чакаю, калі па мяне прыедуць, і тады нам давядзецца развітацца. Шчанючок паціху скуголіў, быццам разумеў мяне, адчуваючы нашу разлуку, і злізваў з маёй шчакі слёзы.

І вось у жніўні 45-га года перад самым вечарам я ўбачыла дзвюх нашых дзяўчынак з дзіцячага дома. Яны здалёку яшчэ закрычалі:

— Ліна! Сястра прыехала, пайшлі!

Я кінула кароў, схапіла хустку — і бегчы. Ды гаспадыня перахапіла. Ужо вечарэла, да дзіцячага дома 5-6 кіламетраў, а ў той час блукалі розныя банды. Страшна ісці. Але я не магла заставацца на месцы ні хвіліны. І я не ішла, а бегла. Дзяўчынкі чуць паспявалі за мной.

А потым пачало цямнець, закрапаў дождж. Каля самага ўзлеску мы бачым: постаць чалавека вылучаецца на фоне лесу, да нас кіруе. Мы спыніліся: і раптам чуем голас нашай дырэктаркі. Яна сэрцам чула, што я не застануся начаваць, і вырашыла пайсці нам насустрач.

Па дарозе яна вучыла мяне гаварыць па-руску, бо я ведала толькі два словы «да» і «нет», турбавалася, як я паразумеюся з сястрой. Яшчэ днём у піянерскім пакоі дырэктарка паставіла два ложкі: для мяне і сястры. Калі мы зайшлі ў дом, яна сказала:

— Ціха, кладзіся побач на ложак. Не будзі сястру, яна Еельмі стамілася.

Я толькі папрасіла, каб яна пасвяціла запалкай. Хацелася паглядзець, якая яна, сястра.

Затаілася і чакала, калі ж сястра прачнецца. Прыслухвалася да кожнага яе ўздыху. А сястра ў сне трызніла, а потым ускочыла і пачала рукой шукаць мяне. Я таксама ўскочыла. Мы сядзелі ў цемені і плакалі. Яна мне ўсё нешта расказвала, я ж нічога не магла адказаць. Потым недзе ў памяці пачалі прарастаць успаміны і ўражанні дзяцінства. Усё выяўней я пазнавала сестрыны словы, і ў мяне —

рэдкія — сталі выплываць з памяці словы ў адказ, быццам з глыбіні нейкай...

Мы так стаміліся такой размовай, што разам заснул!. Тым больш што сястра дабіралася ў дзіцячы дом пяць сутак, нават у лесе начавала. Часам ёй паказвалі дарогу ў адваротным накірунку, але яна ўсё ж дабралася да мяне.

Раніцай Леакадзія прачнулася раней і доўга на мяне глядзела. Потым расказвала, што, пабачыўшы, пачала сумнявацца, ці сястра гэта каля яе: я вырасла, вельмі змянілася, а галоўнае, гаварыць з ёй не ўмела.

Калі я прачнулася, зноў пачалі мы нашу незвычайную гаворку. Я зноў толькі «да» і «нет». Хачу сказаць ёй, што я і ёсць яе сястра, а не магу. І мне стала страшна, што сястра не прызнае мяне, не возьме з сабой. Я анямела. І тады недзе з глыбіні маёй істоты вырЕаліся словы: «Жук... жаба...» Так яна мяне да вайны абзывала, калі я смалою лезла да сваёй любімай сястрычкі і не давала ёй праходу.

Гэта і вырашыла, што я сапраўды Ліна і што я — сястра родная, яе «жук-жаба».

У гэты ж дзень прыйшла мая былая гаспадыня і стала прасіць сястру пакінуць мяне на хутары. Абяцала выгадаваць, вывучыць... Але сястра, на маю радасць, сказала:

— Мы будзем посную бульбачку есці, але будзем разам!

Дома нас чакала маці. Якраз у той дзень, калі Леакадзія ад'язджала па мяне, вярнулася з Нямеччыны мама.

Вяртаючыся дадому, мы да Бігосава не даехалі: чыгунка была разбіта, і таму ішлі пешкі са станцыіі Індра. А дома вырашылі з мяне пажартаваць, назваўшы мамай другую жанчыну. Але як жа мама прыхавае свае вочы і свае слёзы, калі ўбачыць сваю самую меншанькую?

Канешне, я адразу пазнала маму, хоць яна была ўжо згорбленая і пасівелая. Уся веска прыйшла паглядзець на нас.

Пасля сямі класаў паступіла ў Даўгаўпілскі тэхнікум чыгуначнага транспарту і закончыла яго нават без троек.

А зараз працую ў Куйбышаве дыспетчарам на чыгунцы. Маю ўзнагароды за работу. Гадую дзвюх дачок. Стараюся выхоўваць іх душэўнымі, добрымі людзьмі. Душэўная цеплыня — гэта, лічу, самае неабходнае кожнаму чалавеку пачуццё. 16 ліпеня 1978 года ездзіла разам з дзецьмі ў Саласпілс на сустрэчу былых вязняў.

Цяжка мне было пісаць гэты ліст. Але затое лягчэй на душы стала, бо нікому не расказвала пра свой лёс. У мяне нават на рабоце мала хто ведае, што мне давялося перажыць...»

Броня, я табе хачу прачытаць некалькі лістоў» прысланых былымі вязнямі Саласпілса. У пісьме чалавек адкрываецца зусім інакш, чым у гутарцы, нават самай прыязнай.

Вось што напісала **Параднік Надзея Іосіфауна** з Ленінграда:

«Я не ведаю, ці змагу вам дапамагчы ў пошуках. Сама я нічым геранчным не вызначылася, толькі прыняла ўвесь жах і пакуты Салаепілса. Нарадзілася я і жыла ў вёсцы Корнікі. Немцаў вайной мы бачылі рэдка, толькі тады, калі яны прыязджалі грабіць людзей. У нас гаспадарамі становішча сталі партызаны. Муж маёй старэйшай сястры — Аляксандр Шаўрак — таксама стаў партызанам.

Калі пачалася экспедыцыя, мы пайшлі ў лес. Там нас і акружылі: мяне, маму, хворага брата Колю і сястру з двухмесячным дзіцёнкам. Муж яе, Шаўрак, пайшоў з атрадам, а мы, адыходзячы, трапілі на карнікаў. Калі прывялі нас у Сар'ю, пачаліся допыты.

Мяне пыталі: «Коля — партызан?» Я ўвееь час гаварыла: «Не!» Тады мяне адвялі да другіх палонных, з якімі і вывезлі ў Саласпілс, а ўсю сям'ю епалілі. Гэта было ў лютым 43-га.

Самыя цяжкія хвіліны вайны? Цяжка адказаць. Іх было многа. Спачатку я страшылася смерці, пасля таго, як нас захапілі ў лесе і пад стогам сена каля вёскі Леснікова паставілі на расстрэл.

Калі ж мяне адвялі ад мамы і ўжо было відаць, што родных пакараюць страшнай смерцю, мне захацелася памерці разам з імі. Як ні дзіўна, веру ў жыццё мне вярнулі ў Саласпілсе. Там былі людзі, якія нам гаварылі, што трэба з усіх сіл трымацца і што рускія ўсё роўна прыйдуць.

Аднойчы я згубіла прытомнасць. Ачнулася на верхніх нарах пад розным рыззём. Гэта мяне хавалі латышы. Адзін з іх, яго звалі Янісам, частаваў мяне сухарамі. Гэта ён мне дапамог перамагчы смерць, ён ратаваў ад гібелі, бо знясіленых адпраўлялі ў смяротны барак, адкуль не было вяртання.

Тыя добрыя людзі ратавалі не адну мяне. Дзе той Яніс зараз знаходзіцца, я не ведаю.

Які след пакінуў Саласпілс у маім лесе?

Не ведаю, як тут правільна адказаць. Гэты след застаўся на ўсё жыццё: нянавісць да фашызму, да вайны... Гэты след — хвароба сэрца і нерваў...

І нават у самыя вясёлыя хвіліны, калі я падыходжу да люстэрка і бачу сябе сівой (я пасівела ў Саласпілсе на 15-ым годзе жыцця), перад вачамі паўстае вайна.

Мне проста пашанцавала, што я засталася жыць. Я трапіла ў групу хворых дзяцей, якіх па сваёй сардэчнай дабраце ўзялі ў свае

сем'і хутаране. Мяне ад смерці ратаваў Грыезэ Паўлс са станцыі Кегумс. Там я пасвіла кароў, спраўляла хатнюю работу. Мяне не крыўдзілі, есці не шкадавалі. Там я і прычакала нашу армію, пасля чаго і вярнулася на радзіму...»

На гэты ліст, што зараз цытуецца, я паслаў Надзеі Іосіфаўне новы, з рознымі дадатковымі запытаннямі. І вось нібы чую, як гаворыць са мной беларуская ленінградка:

«...Ад Грыезэ Паўлса выехала восенню 1944 года. Ніколі яму не пісала. Нават не ведаю чаму. Проста не змагла паверыць, што я дома, што нікога не трэба баяцца. А яшчэ таму, што не хацела прыпамінаць перажытыя жахі. Але потым, у 1967 годзе, я ездзіла ў Рыгу і заглянула да Грыезаў. Гаспадара дома ўжо не было ў жывых. Сустрэла гаспадыня.

Яе сын Арвід служыў у Савецкай Арміі ў Ленінградзе, наведваў мой дом. Калі прыязджала гаспадыня да сына, заўсёды спынялася ў мяне. Аднойчы, успамінаючы вайну, яна прызналася: калі мяне вёў Паўлс з Саласпілса, падумала, што нейкая бабуля ідзе ў іх дом. Вось якімі рабіў канцлагер падлеткаў...

Аднойчы раніцай з нашага барака выбралі маладых прыгожых дзяўчат. Вечарам яны прыйшлі ў барак і з плачам кінуліся да сваіх родных развітацца. Яны былі чыстыя і добра апранутыя. Іх адрывалі ад родных і вялі ў аўтобус. Дзяўчаты толькі паспелі сказаць, што іх павязуць афіцэрам... Было вельмі цяжка бачыць усё гэта, хоць «цяжка» — гэта не тое слова...

...За ноч дзіцёнку трэба было сплесці 25 метраў саламянага шнура. Аднаго разу ці салома была крохкая, ці сілы не хапіла, але я не выканала норму. Мяне разбудзіла плётка, а пасля перамеру шнура я атрымала па спіне столькі ўдараў гумавай плёткай, колькі метраў не дапляла. І я не плакала...

Дзяцей старэйшых не аддавалі на хутары без дзяцей маленькіх. Вось і Грыезу Паўлсу акупанты аддалі акрамя мяне і шасцігадовага саласпілскага вязня Эдзіка Тазікава. Гэты хлопчык быў са Смаленска, але летам 1941 года прыехаў да бабулі на Асвейшчыну, дзе яго і забралі карнікі.

Спачатку мы па-латышску не разумелі, а па-руску ніхто з намі не гаварыў. І калі мучыў нясцерпны сум па радзіме, гэты Эдзік, які ўсё разумеў, як дарослы, прыходзіў да мяне, садзіўся побач і гаварыў:

— Давай я табе раскажу вершык: «Одеяло убежало, улетела простыня...» А хочаш — пра дзеда Мазая?

Ён ведаў толькі два гэтыя вершы і хоць паўтараў многа разоў, я прасіла расказачь яшчэ. Слухала іх, і мне станавілася лягчэй...

У госці да гаспадара часта прыходзілі рускія муж і жонка, якія працавалі на Кегумскай электрастанцыі. Аднойчы руская цётка прытуліла мяне, і калі я заплакала, яна мяне супакоіла і ціхенька сказала, што хутка прыйдуць нашы.

Але потым рускія перасталі хадзіць да гаспадара. І калі я спытала ў гаспадыні, тая адказала, што іх арыштавалі, бо знайшлі рацыю...

...Дзецям сваім я часта расказваю пра вайну, пра канцлагеры. Ездзіла з імі ў Саласпілс, паказала тую мясціну, дзе стаяў наш барак. Са мной яны заўсёды ласкавыя, паслухмяныя. Ведаюць, якія ў мяне сталі нервы і дзе я страціла здароўе...»

Аж з Данбаса прыслаў нам сваё пісьмо **Агурэцкі Мікалай Васільевіч**:

«...І я стаў прыпамінаць тыя навек цяжкія гады. У першыя дні вайны бачыў я, як ішлі мардатыя нямецкія салдаты. Яны радаваліся нашаму дзіцячаму гору.

На панадворку ў нас быў змайстраваны для дзяцей акопчык, накрыты варотамі. Гітлераўцы ведалі, што гэта не мост, а пераехалі коньмі (везлі кухню) праз гэта сховішча, дзе я з сястрой быў. Калі я выбраўся з-пад разламаных дошак, паказаў салдату, што там засыпал! зямлёй маленькую дзяўчынку. Яны засмяяліся, зайгралі на губным гармоніку, вывалаклі з акопчыка кухню і паехалі.

У той жа дзень на нашых вачах яны расстралялі двух параненых ваеннапалонных. Не пахавалі іх і людзям забаранілі пахаваць.

Зімой 42-га года я з братам Віктарам паехаў на кані па газу ў Асвею. У той якраз дзень немцы знішчалі яўрэяў. Яны дзяцей білі прыкладамі, калолі штыкамі. Усіх мясцовых жыхароў сабралі на гэты здзек і прымушалі глядзець. Яны гаварылі: з усімі, хто не скарыцца германскай уладзе, будзе так.

А калі ўсіх яўрэяў расстралялі з кулямёта, то яма, дзе ляжалі трупы, пачала шавяліцца. Тады карнік даў каманду спецыяльна пакінутым яўрэям кідаць на мерцвякоў вецце. І тут жа па іх пайшоў гусенічны цягач. Яма перастала шавяліцца. Гітлераўцы ўзрадаваліся. А адзін жандар у акулярах так быў задаволены, што аж пачаў скакаць, бы малое.

Вясною маці адвяла мяне да сваёй сястры ў Лісна. Вось тут я і ўбачыў нашых партызан. Усе, хто мог трымаць зброю, ішлі ў самую глуш лесу. Фашысты рабілі налёты на іх. Праўда, далёка ў лес не соваліся: на дарозе пастраляюць з кулямёта і вернуцца ў Асвею.

Але такія наезды часта абыходзіліся людзям вялікім горам. Аднойчы фашысты ўбачылі ў дзядзі Ясона двух сыноў. Каб яны не сталі партызанамі, вывелі іх на ростанькі, і кат аднаму і другому

стрэліў у галаву. Маці бараніла сыноў ад смерці, разам з імі ўпала на зямлю. Нейкім цудам адзін з іх застаўся жыць. А маладым жанчынам увогуле нельга было паказвацца на вочы акупантам.

Гэтай жа восенню даведаўся, што мой бацька пайшоў у партызаны і быў перапраўлены праз лінію фронту. Ён загінуў у 1943 г. у час наступлення на Курскай дузе. Так было напісана ў пахавальнай.

А ў Лісна партызан прыбывала ўсё больш і больш. Восенню, калі замерзла возера, пачалі садзіцца самалёты; прывозілі боепрыпасы, а вывозілі параненых.

Аднойчы праз сяло вярталіся з задания партызаны. У іх падбіўся адзін конь. Тады Бяльчонак ГІіліп запрог свайго каня ў партызанскія сані і гаворыць мне:

— Мікалай, едзь разам з партызанамі. Іm дапаможаш, а потым каня прыгоніш назад.

Раніцай дабраліся да вёскі Добры Плёс. Адзіп з партызан падышоў да мяне, узяў за руку:

— Пойдзем у сталоўку!

Там ён накарміў мяне і кажа:

— Малайчына ты. На вот табе боты, а то твае чаравікі знасіліся.

І ён распытаў, чый я і адкуль. Тады партызан сказаў, што ведае майго бацьку і што ў маёй роднай вёсцы акупантаў няма.

Да сваёй цёці Волі ў Лісна я ехаў героем. А потым вярнуўся разам з партызанскімі разведчыкамі ў сваю родную хату. Бацькі не застаў дома. Так яго больш і не ўбачыў.

А праз некаторы час пайшлі слухі, што на партызанскія атрады пайшлі карнікі. І вось у пачатку вясны 1942 года кожную ноч мы бачылі зарыва.

Праз нашу вёску ехалі і ехалі бежанцы. Яны вялі кароў, а каровы дзіка раўлі. Бежанцы расказвалі нам, што фашысты жывымі спальваюць людзей...

Неўзабаве да нас у вёску прыбег нямы. Ён быў волатаўскай сілы. У руках трымаў ствол ад нямецкай вінтоўкі. Паказаў, што прыклад абламаўся на галаве ў карніка. Ярасна матляў галавой, хочучы расказаць, як гэта было, і на ім распаўзалася абгарэлая вопратка. Потым расказалі сведкі, што нямога разам з яго аднавяскоўцамі загналі ў хлеў, каб спаліць. Відаць, не адзін карнік паплаціўся сваім чэрапам, раз удалося вырвацца волату са смяротнага акружэння.

Мая мама вырашыла таксама падацца ў бежанцы — паехаць да сястры Лены Валадзёнак у Ярохі. Усё пакінулі, нічога з сабой не бралі. Толькі мая бабуля адказалася выязджаць з хаты, сказала:

— Лепш я дома загіну, а ў свет не паеду...

А ў цёці Лены было столькі бежанцаў, што і ў хлявах тоўпіліся, хоць халаднавата было. Пасярэдзіне цётчынай хаты я ўбачыў вялізны чан. Наўкруг гэтага чана стаялі мужчыны і рабілі партызанам валёнкі.

Толькі і ў Ярохах было нам няўседна. Партызаны на ўскрайку лесу пачалі рыхтаваць абарону. Дзе не замерзлі зямлянкі, перараблялі іх у акопы.

Мы ўзялі самыя патрэбныя пажыткі і разам з цётчынай сям'ёй (сабралася 9 чалавек) паехалі на кані. Правадніком быў дзядзька Ціт Валадзёнак. І мы заехалі ў такую глухамань, што ўвогуле неба не было відаць. Зрабілі шалаш. Днём так-сяк перабіваліся, а ноччу мерзлі. Пачалі паліць вогнішча: нямецкія самалёты прыкмецілі, пачалі страляць па нас.

Мы ў тых нетрах трымаліся да той пары, пакуль было чым карміць каня і карову. Потым па сваім жа следзе сталі вяртацца. Хутка напаткалі процьму людзей. Не праехаць. Дзеці плачуць, каровы равуць, як дзікія.

Тады цёця Лена стала даводзіць, што ведае глухую мясціну, далёкую ад дарог. Ноччу мы туды і выехалі. Але і там было поўна народу.

Выкапалі невялікую зямлянку, так-сяк абсушыліся. Днём і ноччу людзі каровам на галовы мяшкі ўздзявалі, каб не так было чуваць, як яны равуць.

Як зараз памятаю, 25 красавіка 1943 года прама на нашыя зямлянкі ланцугом выйшлі карнікі. У мяне і сёння, калі ўспамінаю той момант, па спіне паўзуць мурашкі. Фашысты былі злыя, як звяры, п'яныя. Калі хто мерыўся адысці ўбок, забівалі напавал. А людзі, хто быў смялейшы і мацнейшы, усё роўна спрабавалі вырвацца з акружэння. Таму па лесе ўсчалася страляніна з кулямётаў і аўтаматаў.

Карнікі пачалі збіраць усіх і выводзіць з лесу. Сабралася ўжо чалавек 300. Такім скопам і загналі нас у Мілавідах у хлеў. Праз усю ноч чулася перастрэлка між партызанамі і карнікамі. Са сцен хлява толькі шчэпкі ляцелі. Хто, стоячы на каленях, маліўся богу, хто плакаў...

Пад раніцу партызаны паранілі вартавога каля варот хлява. Нехта з мужыкоў адчыніў вароты і стаў перавязваць параненага, які крычаў ад болю. Гэта ўсё бачылі з засады фашысты і назіралі. У 8 гадзін раніцы перастрэлка заціхла: партызанам не ўдалося адбіць нас. Тады азвярэлыя п'яныя карнікі асмялелі і, як скаціну на бойні, пачалі нас выганяць з хлява. Тыя хвіліны засталіся назаўсёды ў маёй памяці. Апанаваў такі страх, што я не мог заціснуць сківіды: так цакаталі зубы. А сэрца вырывалася з грудзей. Шапка, здавалася, вось-вось спадзе з галавы, бо валасы дыбам сгаялі.

Ніхто не хацеў ісці першы. Усе ведалі, што нас чакае смерць. А карнікі пасталі шарэнгамі. Білі людзей прыкладамі, нагамі...

Перад тым як выйсці з хлява, мая мама ўкруціла сястру Аню ў коўдру. Атрымаўся невялікі скрутак, які яна і ўсунула ў мяшок. Таму калі нас выгналі з хлява і паставілі па тры ў рад: я, мама і брат Віктар,— фашысты не дагадаліся, што скрутак у мяшку —гэта дзіця маленькае.

А тут карнікі пачалі выбіраць матак, у каго дзеці да сямі гадоў. Праз якую хвіліну ў той трупе, дзе мы засталіся, не было ўжо ніводнага маленькага дзіцёнка.

Я не ведаю, колькі мы прастаялі на вуліцы, але мая сястра не падала з мяшка ні туку.

Потым нас зноў завярнулі ў хлеў. Лходзі кінуліся на мерзлую капусту і пачалі ад млосці смактаць лісты. Рантам у кутку заплакала дзідё, прыкрытае саломай. За варотамі хлява, акрамя двух вартавых, нікога не было. Ніхто з ворагаў не пачуў плачу.

Жанчыны супакоілі дзіця, і мы праз шчыліны ў сценах пачалі глядзець, як пагналі нашых родных і блізкіх у суседні хлеў. Людзі ішлі між карнікаў па двое, а дзетак неслі на плячах. Відаць было, як Альчэўскай цяжка было несці дачку на плячах. Яе старэйшая Оля, якая была з намі, заплакала, але тут наперадзе пачуліся стрэлы. Людзей падганялі ў хлеў і там па чарзе забівалі.

А потым хлеў загарэўся з усіх бакоў. Усю ноч несла адтуль гарэлым мясам і скурай.

8 усёй групы засталося чалавек сто. На другі дзень у канцы вёскі нас чакалі падводчыкі. Іх мабілізавалі ў Латвіі. Нашы коні, каровы былі таксама палоўлены. Абоз рушыў наперад.

Мы яшчэ не даехалі да вёскі Мельніца, як трое карнікаў на конях з усяго ходу ўрэзалася ў нашу трупу. Умомант забілі адну жанчыну. Яе дачка кінулася да маткі. Абдымае, ужо мёртвую.

Праязджаючы спаленую вёску Лісна, адзін з латышоў-падводчыкаў знайшоў у зямлянцы хлопчыка гадоў мо двух. Той так ужо сплакаўся, што быў увесь сіні, згаладнелы.

Калі нас прыгналі ў асвейскую царкву, там ужо было многа народу. Было відаць, што да нас тут былі людзі: салома сцёрта ў пыл, а самае страшнае — вошы, не заснуць ад іх!

Прайшлі ад Мілавідаў да Асвеі 30 кіламетраў. У роце, акрамя снегу, нічога не было. А раніцай зноў у дарогу. Вечарам мы былі ўжо ў Палішчыне, на Латгаліі.

Простыя людзі спачувалі нам, хлеб давалі.

Вечарам пагруеілі ў вагон. Едзем. Цесната. Вады няма. Спім седзячы.

Закрываючы дзверы нашага вагона, кінулі чатыры буханкі хлеба. Нас жа і не помню колькі было. Калі ехалі, кацялкамі чэрпалі на хаду снег. Вось гэтым і жылі.

Калі сталі каля барака, то ў мяне і ногі падкасіліся: я ўбачыў дрот калючы, кансервавыя банкі, падвешаныя на ім, фашыстаў з сабакамі...

Падышоў бліжэй да дроту, а там мужыкі сядзяць і разбіваюць камень. Худыя, адны шкілеты ў паласатай вопратцы. Яны пачалі прасіць хлеба, солі, табакі, працягваючы свае страшна худыя рукі.

Загналі ў барак «А». Вечарам далі суп з высушаных буракоў і чорную каву. А на другі дзень далі 100 грамаў хлеба напалову з апілкамі. Суп быў такі, як і ўчора.

А перад абедам нас перагналі голых у другі барак. Пачаўся каранцін. У той красавіцкі дзень сыпаў дождж, было сіверна.

Ужо не памятаю, колькі мы пражылі ў лагеры. Запомнілася толькі, што праз адзін ад нашага барака знаходзіліся латышы-палітвязні. Іх прымушалі на насілках выносіць голыя трупікі дзяцей, задушаных газам. Адзін малады латыш сказаў нам, што фашысты атруцілі 300 дзяцей. Я сваёй маме пабаяўся гэта гаварыць, бо ў нас была маленькая Аня. Яна захварэла, і я пайшоў разведаць, у які барак яе перавялі: баяўся згубіць сястру.

Нам у тыя баракі, дзе знаходзіліся латышскія палітвязні, заходзіць не дазвалялі: сустракацца і размаўляць з імі было забаронена. Мы маглі перакінуцца словам з імі толькі ў туалеце. Так даведваліся, як ідуць баі на фронце, колькі ўжо загінула ў нашым лагеры, каго і куды будуць вывозіць, хто ўцякаў і каго злавілі...

За любую правінку каралі страшна ўсю брыгаду. Бачыў я, як прымушалі поўзаць ракам, уставаць і прысядаць. Вязні гразь ротам хапалі: так іх смага мучыла.

Я сам першую кару атрымаў за тое, што без дазволу выйшаў з барака і спазніўся на пераклічку.

І вось мяне паставілі пасярод барака, у адну руку далі мятлу, у другую — шчотку. Гэтае начынне трэба было пратрымаць на выцягнутых руках дзве гадзіны.

Першую гадзіну вытрымаў. На другой — пачаў плакаць. Мама таксама заплакала, пайшла да старшага прасіцца, каб мне даравалі. Той выштурхнуў маму са свайго пакоя.

А дзяжурны па бараку назіраў за мной. І калі б я толькі апусціў руку — гатоў быў біць мяне плёткай.

А мне ў той час здавалася, што ўсе мае жылы адмерлі і я зрабіўся такім нягеглым, што не змагу дабрысці да сваіх нараў. Мама не адыходзіла ад мяне, і калі дзяжурны сказаў: «Пастаў мятлу і шчотку ў куток»,— я адразу ўпаў. Але мама падхапіла мяне і адвяла на нары.

Часам мы знаходзілі на тэрыторыі лагера маладыя хвойкі. Выкопвалі тонкія карэньчыкі і жавалі. Елі да той пары, пакуль не званітуе...

Аднаго разу акупанты сабралі ўсіх маіх нягеглых аднагодкаў на машыны. Доўга стаялі каля цэнтральных варот лагера, а потым рушылі. Прывезлі ў воласць, высадзілі каля вялізнай кучы дроў. Хачу падзякаваць тым простым людзям, якія прыходзілі з навакольных хутароў і бралі нас, паміраючых, у свае сем'і.

Мяне пашкадаваў Віліс Калнозал з Ікшкіле.

Калі ён прывёз мяне на свой хутар, паспрабаваў яешта мне растлумачыць. Ды мы так і не паразумеліся. Віліcу на той час было 30 гадоў, ён жыў халасты. У доме знаходзілася яго маці 64 гадоў і цётка 75 гадоў. Віліс быў культурны чалавек, добры земляроб. Нікому не дазваляў крыўдзіць мяне. Сталаваўся я разам з усімі за адным сталом. Я звыкся з новымі людзьмі і хутка навучыўся гаварыць па-латышску. Разам з ВІлісам часта ездзіў у Рыгу, меў добрую вопратку, не галадаў.

Пражыў у Віліса лета і зіму.

Вясной 44 года мая мама ўцякла з катаргі і нейкім цудам знайшла сястру Аню, а потым і мяне. А брата Віктара дапамагла ёй адшукаць гаспадыня, у якой жыла Аня. Аню ж ратавала ад смерці Яўгенія Смірнова.

А Віктар працаваў у маёнтку Вэверы, недалёка ад Тукумса, каля станцыі Смардае. Там мама і засталася жыць разам з Аняй.

А ў мяне — неепадзеўкі. Так хораша было з Віліеам, ды рантам дачуўся, што яго хочуць мабілізаваць на работы. Ён не хацеў служыць акупантам, некалькі разоў перад чарговай камісіяй атрутнымі травамі націраў сабе ногі, і яны неймаверна пухлі. Ды ў апошні раз доктар сказаў: калі ён яшчэ раз пакажацца камісіі з хворымі нагамі, яго палічаць дэзерцірам і адправяць у канцлагер. Тады Віліс і кажа мне:

— Выязджай хутчэй да маці...

Дарогу да Тукумса я ўжо ведаў, але як жа ехаць, калі не маю аніякага дакумента. Як мінуць Рыгу, калі на кожным кроку правяраюць? Падумалася: «Зловяць — не відаць мне болей волі».

Ды мяне ратавала тое, што я быў апрануты па-латышску, добра знаў мову. І... трошкі пашанцавала.

Мама ўзрадавалася, калі ўбачыла мяне. Гаспадар не быў супроць майго прыходу, але затрывожыўся: як я буду жыць без прапіскі. Мама стала прасіцца ў гаспадара, а потым сказала:

— Фронт ужо зусім блізка. Дык зрабіце добрую справу...

Ён згадзіўся. І я стаў пасвіць кароў. Ды ўсё часцей наляталі нашы самалёты, абстрэльвалі і бамбілі дарогу, станцыі Тукумс і Смардас. Ужо добра была чуваць артылерыйская кананада. У хуткасці брата Віктара забралі капаць акопы. А калі савецкія танкі прарваліся да станцыі Смардас, нас, бежанцаў, забралі ў лагер Цэрпіс, што ў 12 кіламетрах ад Тукумса. Нас у лагеры застаўлялі рыць бліндажы, абкладваць іх дзірваном.

А перад новым, 1945 годам нашы самалёты разбамбілі тыя бліндажы, што мы ўзводзілі, і немцы ў паніцы кінуліся разбягацца. Многа было забітых, параненых.

Пасля Перамогі мы сабраліся і паехалі на радзіму. Але рамеснае вучылішча закончыў у Рызе, адтуль і ў армію пайшоў.

У 1955 годзе памерла мама, у тую ж восень я звольніўся з армейскай службы. Трапіў у Данбас. Жыву ў пасёлку Міронаўскім. У мяне добрая сям'я. Сын жанаты, унучка ёсць. А дачка вучыцца ў тэхнікуме.

Больш 20 гадоў прарабіў машыністам катлатурбіннага цэха. Пабудаваў сабе харошы дом з цэнтральным ацяпленнем, газам. Ёсць і легкавуха.

Зараз нам толькі б жыць! А вот няма галоўнага — гэта здароўя...»

Мы ўжо згадвалі партызана Літвінава і яго жонку — Ніну Міхайлаўну, цытавалі некалькі радкоў з яе характарыстыкі. З Асвеі Ніна Міхайлаўна мне напісала:

«Цяжка расказачь па парадку, як было. Скажу, што ўспомшо. Муж мой тым летам выходзіў з акружэння. Не прабіліся яны да фронту. Разам з маім дваюрадным братам Лукашонкам з Прошак сталі партызанамі. Яны ў лесе, я ў Асвеі. Чым магу — дапамагаю. Тады бургамістр і распарадзіўся: «Падгатовіць шыбеніцу і злавіць Літвінаву». А ў мяне на руках хлопец чатырох гадоў. Перадалі партызаны, каб уцякала з Асвеі. Я збіраюся, а за мной віжуюць. Я па адной вуліцы, хпікі — за мной. Неяк выкруцілася, пайшла полем да бальшака. Па правільнасці, мне трэба было ісці ў бок лесу, бо партызаны павінны былі выслаць падводу. Ды дужа. я баялася засады. Пайшла на Свяцішу, паблытала карты ворагу. Да Вышнарава я пад'ехала. Урублеўскі прывёз у Задзежжа. Толькі назаўтра трапіла ў партызаны. Так сын і я засталіся жывыя.

Усяго на наш атрад ішло чатыры карныя экспедыцыі. Перад першай мы не вытрымалі — выйшлі за фронт. Гэта было ў снежні 1943 года. Помню, як падышлі мы да Роўнага поля ў Расонскім раёне. Карнікі б'юць з гармат па балотцы. Толькі выходзім да Залесся — яны смаляць яшчэ мацней. Бачым: салдаты за намі на матацыклах. Мы ў дрыгву. Увалілася я з мальцам у ваду па горла. Не магу выбрацца. Яша Лось вярнуўся, схапіў мальца, мне руку падаў. Уцяклі.

Дванаццаць сутак былі тады галодныя. Нарэшце каля ракі напаткалі партызанскі атрад. Далі мне зямлянку, гарнец мукі. Наварыла я калатухі...

Але трэба было здымацца і ісці далей. Пайшла на Макуты. Так здарожыліся, згаладаліся, што калі аднойчы знайшлі капец бульбы, я пяць тазоў наварыла бульбы ў мундзірах. Зварым — і з'ядзім. Зварым — зноў з'ядзім... Не маглі наесціся.

Многія за фронт так і не прабіліся. То ў рэчку ўваляцца жанчыны з дзецьмі, то ў дрыгву. А колькі дзяцей сіротамі засталося. Плакалі ў лесе адны. У Савейках карнікі расстралялі некалькі сямей, але дзяцей усіх не знайшлі: пазашываліся тыя ад страху — хто дзе. Мы пазбіралі іх. Мяне яны ўсе мамай называлі. Потым гэтых сірот на самалётах адправілі за лінію фронту.

У час адной перастрэлкі з карнікамі загінуў мой муж.

А той, хто ўцалеў, вярнуўся на сваю стаянку. Ніхто не ведаў, што наш лагер фашысты замініравалі. Я тры разы хадзіла ў замініраваную зямлянку. Партызан адзін узарваўся, а мне зноў пашчасціла.

Былі мы ў сваім лагеры разам з латышскімі партызанамі, аж пакуль нашы з фронту вярнуліся. Шыла адзенне, пякла хлеб, даіла кароў...

Здарыўся ў нас адзін такі кур'ёзны выпадак. Нашы чакалі свайго самалёта. Распалілі пяць кастроў, але адзін неўпрыкмет патух. Чуем, ідзе самалёт на пасадку. Спусціўся. Ажно не наш, а нямецкі. Што за дзіва! Партызаны ўзялі лётчыка, а ён, маладзён, крычыць:

— Бандзітэн! Алес капут!

Але яго машына аказалася спраўнай. Сярод партызан былі лётчыкі. І вырашылі яны адправіць самалёт, а заадно і немца за лінію фронту. Садзіўся лётчык за пасажыра ў свой самалёт і ўжо гаварыў: «Бандзітэн — гут!» Бо яму нагаварылі пра партызан немаведама што, і ён думаў, што ў лесе сапраўды бандыты. Гебельсаўская прапаганда іначай і не называла нас, партызан.

Пасля вайны з жонкай партызанскага камандзіра Сімацкага, таксама ўдавой, вярнуліся на тое месца, дзе калісьці была Асвея. Чатыры калы загналі ў зямлю, трысцём прыкрылі. Так і жылі ў

самаробным будане. Хто быў крапчэйшы — зямлянкі строіў. Потым мне далі нямецкі вагончык дашчаны. Бітай цэглы было многа, і я да будана прыбудовачку зрабіла. Паявілася ў мяне печ. Сама зрабіла. Схаджу, пагляджу ў суседзяў, як печ выглядае, і ляплхо яе паціху.

А потым і хацінку сваю ў шулы з бэлечак паўзгарэлых склала.

20 гадоў працавала я старшынёй гарпасялковага Савета. Зараз на пенсіі. Ёсць у мяне і ўзнагароды: пяць медалёў. Так і жыву: колькі ўладзе нашай гадоў, столькі і мне...»

## Частка другая

Вораг, стаіўшыся каля мяжы нашай дзяржавы, зырыў не толькі на пярэдні край абароны, ён хацеў заглынуць нябёсы і нетры краіны, на якую рабіў напад. Таму і калыска з немаўляткам, і маленышя дзяўчынка Браніслава былі для гітлераўскага галаварэза «стратэгічным аб'ектам». І выхалены і выхаваны (па-свойму), у бездакорнай выпраўцы ваяка фюрэра, пацалаваўшы на развітанке на Захадзе ручку фрау, вырываў з рук росіцкай маці яе дзіця і разбіваў яго галавой аб вугал. Той вылюдак і той фюрэр паплаціліся за крыўды. Але хто забудзе ўсе страшэнныя страты, якія прынесла вайна?

Бухенвальд забраў у чалавецтва 56 тысяч жыццяў, Дахаў — 70 тысяч, Маўтхаўзен — больш як 122 тысячы, Майданак — каля паўтара мільёна, у Асвенціме фашызм знішчыў больш як 4 мільёны чалавек[26].

І вось знаходзяцца на Захадзе людзі, якія хочуць, каб усе гэтыя ахвяры былі забыты, каб ніхто на свеце не ўспамінаў людскія пакуты, канцлагеры, а заадно каб не ўспамінаў натхніцеляў і выканаўцаў масавага знішчэння — саміх гітлераўцаў.

Толькі вар'яты могуць сёння так заяўляць, быццам злачынствы фашыстаў — гэта «выдумка чырвоных», што ў Дахаў пражывалі здаровыя і вясёлыя вязні, што ў Майданаку «...можа і былі выпадкі жорсткасці, але сцвярджаць, што там было забіта 250 тысяч чалавек, прабачце, гэта — абсурд»[27]. Апошнія словы сказаны адвакатам з ФРГ Людвікам Бокам. І ён яшчэ абурана запытаўся ў журналіста, які браў інтэрв'ю: «Каму прыносіць карысць гэтае калупанне ў мінуласці? Мёртвых жа не ўваскрэсіш».

Не! Народная памяць якраз і ўваскрашае імёны паўшых, аберагае праўду ад крыўды, ад знявагі, аберагае людзей ад беспамяцтва. Не трэба быць вялікім матэматыкам, каб убачыць яўную розніцу хоць бы

---

[26] Фашизм под сенью их «свободы».— Комсомол, правда, 1983, 3 марта.
[27] Стрельников Б. Тихие старички.— Правда, 1977, 11 сент.

ў такіх майданаўскіх лічбах: паўтара мільёна і тыя 250 тысяч, якія назваў пан адвакат з ФРГ.

Каму прыносіць карысць такая падтасоўка? Сённяшнім адвакатам фашызму. А яны праводзяць сваю адвакацкую практыку і ў ФРГ, і ў ЗША, і ў другіх мясцінах, дзе фашызм знаходзіць для сябе спрыяльную глебу. Гэтыя «адвакаты» сёння спрабуюць абылгаць саміх сведкаў генацыду, ахвяр фашысцкай ідэалогіі. Чалавеканенавісніцтва. У гэтай бязбожнай падтасоўцы лічбаў і фактаў былыя вязні, былыя ахвяры, аказваецца, яшчэ і вінаватыя ў тым, што помняць.

Так, мы помнім вайну, каб не даць магчымасці новым агрэсарам паўтарыць злачынства. Так, мы помнім Перамогу, той меч, які рассек фашысцкую свастыку.

Зноў і зноў звяртаюся ў думках да маіх землякоў. Ніколі не паееліцца ў душах асвейцаў забыўчывасць да жудасных злачынстваў фашысцкіх захопнікаў на нашай зямлі, не прытупіцца няпавісць да войнаў, што нараджае імперыялізм. Побач з такой народнай памяццю ніколі не паявіцца бесклапотная дабрадушнасць.

Дазвольце ўявіць на міг, што з сучаснымі, «адвакатамі» фашызму праводзяць прэс-канферэнцыю... асвейцы. Забыўчывым людзям мае землякі напомнілі б, што такое вайна.

Гяч Ядвіга Дзяменцьеўна з вёскі Спеці сказала б:

— Дзень і ноч у Любліне народ падаў. Там, у Майданаку, загінулі сям'я Гажэўскіх з Росіцы, Оля Уселенак з Каменцаў, многа маіх знаёмых з Пагулянак. Як слата валіўся народ...

А Пірог Валянціна з вёскі Хамяно пану Людвіку Боку з ФРГ прамовіла б наступнае:

— У Любліне былі жанчыиы з дзецьмі. З-пад Віцебска прывезеныя. І малым трэба было стаяць па пяць гадзін на пляцы. А каля газоўняў ямы... Дзень і ноч гарэла ў тых ямах. Стаяць было немагчыма: дым смуродны, полымя паблісквае...

У камюніке Польска-Савецкай Надзвычайнай камісіі па расследаванню злачынстваў гітлераўцаў былі апублікаваны даныя пра лагер смерці Майданак. Знаходзіўся ён за дзве вярсты ад Любліна і займаў плошчу ў 270 гектараў. Пачалі яго будаваць яшчэ ў канцы 1940 года.

У згаданым камюніке ўпамінаўея намеснік начальніка лагера обер-штурмфюрэр СС Туман. Яго садысцкія здзекі добра запомнілі і асвейцы. Часта прыпаміналі гэта чорнае імя жанчыны Росіцы, Асвеі, Сар'і... Вось што расказала вязень Майданака — Пірог Валянціна:

— З Саласпілса ў Люблін нас прыбыло 600 чалавек. Мужчын было 200. Групу ў 25 чалавек, дзе я была, немка з сабакам старажыла.

Аднаго разу вяртаемся з поля ў лагер. Начальнік Туман аб'явіў рэвізію. У мяне знайшлі схаваную бульбіну. Тады Туман скамандаваў:

— На баты!

Гэта значыць — біць да смерці. Спачатку біла блокавая. Захакалася. Пачала обертка (наглядчыца) біць. Перастала. Стражніка нейкага захудалага прывялі. Ён зусім памаленьку біў. Мо не так ахвяру, як сябе шкадаваў. Гэта і ратавала мяне...

**Эма Аркадзьеўна Качан** расказвала мне ў Бігосаве, як расправіўся эсэсаўскі кат з яе бацькам, Аркадзем Скрыпкам. Той працаваў недалёка ад поля, дзе разам з другімі жанчынамі збірала чарот жонка Аркадзя. Неўпрыкмет падпоўз, каб узяць гароху сваім таварышам. Гэта запрыкмеціў Туман і напусціў на вязня аўчарку. Сабака кускамі мяса вырываў з жывога цела чалавека, а эсэсавец любаваўся, як вязень ператвараецца ў крывавыя шматкі...

**Мароз Валянціна** з Росіцы сказала б на той прэс-канферэнцыі:

— Як я ведаю, з нашага транспарту ў 1000 чалавек у Майданаку выжыла 20-30. Загінулі там і мае бацькі: Домна Яфрэмаўна, Іосіф Іванавіч.

Там любілі так здзекавацца: ставілі між дротам, па якім ток ідзе. Хто абяссілее, павернецца — згарыць...

**Вархоб Настасся** з Росіцы дадала б:

— І Люблін, і Равенсбрук — гэта былі істрабіцельныя лагеры. У Майданаку толькі пры мне 31 тысяча людзей праз крэматорныя трубы «на вольнасць» пайшла, гэта значыць — «на свабоду». За нейкую правіннасць мне 25 плётак далі — і слёз не было. Кончыліся. Такой пары быць не можа нідзе на свеце!

Праясніць абсурд «адвакатаў» фашызму магла б і **Станкевіч Альбіна Міхайлаўна** з вёскі Карценева, былы вязень Саласпілса, Майданака, Асвенціма — № 87025, Равенсбрука і яшчэ аднаго, назвы якога жанчына не памятае, але добра ведае, што той размяшчаўся каля Бухенвальда.

— Як маткі крычалі ў Саласпілсе! Пра той крык словамі не раскажаш. Галовамі аб зямлю біліся, так дзетак шкадавалі. З красавіка 1943 года я была ў Майданаку. Там на кожным кроку паміралі. На мне з электрычным токам доследы праводзілі. Калі аднойчы мы ў полі працавалі, на нас святло нейкае накіравалі з будкі, што стаяла на гэтым жа полі. Рукі і ногі адразу аслабелі. Пухіры ўзняліся, вада з іх пацякла. Вечарам — праверка, камісія ходзіць. Забралі нас, хворых, на дослед. І ўвесь час кроў бралі. Многа бралі, бо аж млела, хадзіць не магла. Праз тыдзень-другі сказалі: «Хто можа работаць — выходзьце!»

...За нейкую правінку паставілі нас, пяць-шэсць дзяўчат, між дроту, па якім пусцілі ток. Стаялі, пакуль не страцілі прытомнасць...

Пра тое, што гітлераўцы ў канцлагерах трымалі вязняў як паддоследных жывёлін, сведчыць і **Яфім Трафімавіч Ліпаўка**. У 1943 годзе, ужо пасля карнай экспедыцыі, ён трапіў у спісы ненадзейных: відаць, даведаліся ворагі, што Яфім Трафімавіч да вайны быў прыняты кандыдатам у члены ВКП(б), працаваў настаўнікам, кантужаны на фінскай вайне.

З дрысенскай турмы Ліпаўка трапляе ў Грамы: быў у прадмесці Полацка такі канцлагер. Адтуль яго вывезя! ў Штутгоф, са Штутгофа — у Дахаў. «У Дахаў над намі праводзілі страшэнныя эксперименты. Спачатку нас заразілі малярыяй, потым — тыфам. А мяне тыф не ўзяў, бо, відаць, і крыві ў целе не было: адзін шкілет. За што было ўчапіцца таму тыфу, калі я важыў усяго толькі 39 кілаграмаў?»

У Дахаў Яфім Трафімавіч так знясілеў, што не мог ні рухацца, ні гаварыць. Ён быў выкраслены са спіскаў жывых. Яшчэ пры свядомасці яго адвезлі ў крэматорый. Але там была доўгая чарга, бо печы не спраўляліся спальваць трупы. Так ён некалькі дзён чакаў свайго смертнага часу.

Гэтыя мукі былі прыгатаваны чалавеку свядома. Як можна забыць такое, як можна забыць і праз тысячу гадоў глумление, здзек, усё, што прыгатаваў чалавецтву фашызм?

Яфіма Ліпаўку выратавала рашучае наступление савецкіх салдат.

Чырваназорная Перамога і яго выратавала ад смерці, і Еўропу — ад Майданакаў, Асвенцімаў, Дахаў...

«Каб ім і свет быў нямілы», «Каб яны і ў труне перавярнуліся...» Відаць, гэтыя бяскрыўдныя кленічы часам гучаць у вуснах пакрыўджаных, але ўвогуле нязлобных людзей занадта ласкава. Усёдаравальнасці быць не можа. Хай спапяліць памяць усіх тых, хто падымаў руку на чалавека, на чалавецтва. Злачынства не абяляецца з гадамі, не рэабілітуецца за даўнасцю часу. Асвея і асвейцы і па сёння памятаюць гэтыя святыя запаветы жыцця.

Спазнаў, што такое фашызм, і **Замбар Браніслаў Ігнатавіч**. Яму прыйшлося бачыць яшчэ тых, хто ў першай сусветнай вайне спрабаваў учапіцца сваімі жалезнымі кіпцюрамі за нашу зямлю. Ды абламаліся тыя кіпцюры.

Браніслаў Ігнатавіч расказваў, як ён у 1919 годзе з фронту прыязджаў у водпуск на баявым кані. Два тыдні пабыў на радзіме — і зноў у паходы. А ваяваў ён з 15 мая 1915 года. У 1916 годзе ад самога Брусілава атрымліваў баявыя загады.

Потым ваяваў у корпусе легендарнага Гая.

На старажытным гербе Дрысы мы бачым імклівага конніка з занесеным над галавой мячом.

Хапіла ад Замбара новаму пакаленню псоў-рыцараў. Нездарма ў самыя нетры Нямеччыны адправілі карнікі ўсю яго сям'ю.

Як самую дарагую рэліквію паказваў мне Браніслаў Ігнатавіч свае ўзнагароды, якія захаваў праз усё жыццё, а таксама пісьмо Віцебскага абкома Кампартыі Беларусі і выканкома абласнога Савета дэпутатаў працоўных — гарачае і сардэчнае віншаванне з высокай урадавай узнагародай, медалём «За боевые заслуги», якім ён удастоены за актыўны ўдзел у Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайне і ў барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады.

Падумаць толькі: што бачылі людзі, што перажылі... Які невыносны здзек прыдумалі фашысты: чакаць вязням сваёй чаргі ў крэматорыі, бачыць канвеер смерці, па якім ты паволі рухаешся ў ненажэрную печ. «Чакаеш смерці як збавення? — нібы пытаецца фашыст.— Не,— спыняе ён канвеер смерці.— Мучся. Кожнай клетачкай дранцвей ад нашай сілы, ад нашай усёмагутнасці... Ты яшчэ не ўвесь памёр, каб з цябе атрымаўся добры попел. Высыхай, усведамляючы свой поўны канец... Знікай паволі, каб і душа не змагла перасяліцца ў родную кветку, у далёкую галінку на абпаленай бярозе...»

Нібы рэха гучалі словы, пачутыя мною на цяжкіх дарогах асвейцаў: «Не знайшлі сваіх сыноў Уселенак Юзэфа... Гілуць Соф'я...» Юхневіч Кацярына з Задзежжа запыталася ў манашкі ў Рызе пра сына Лёніка сваей родзічкі Ніны Стомы. Манашка знайшла радок у сшытку і прачытала: «Стома Лёня памёр 14 красавіка 1943 года. Пахаваны на дзіцячых могілках».

У красавіку 1943 года да жаночага манастыра ў Рызе (вуліца Крыш'яна Барона, 128) падыходзілі крытыя ваенныя аўтамашыны. У акце Надзвычайнай рэспубліканскай камісіі ад 5 мая 1945 года я прачытаў:

«Страшную карціну ўбачылі сведкі: з закрытых грузавікоў не раздаецца ні гуку, не чуваць дзіцячых галасоў. Калі адкінулі брызент, людзі ўбачылі дзесяткі замучаных, хворых, замардаваных дзяцей. Яны скурчыліся і дрыжаць ад холаду. Лахманы ледзь прыкрываюць маленькія цельцы, пакрытыя нарывамі, лішаямі, каростай. Дзеці босыя, проставалосыя. З-пад бруднага рыззя відны на грудзях абрыўкі кардону, падвешаных на вяроўцы. На гэтых таблічках відаць надпісы: прозвішча, імя і ўзрост дзіцяці. На многіх бірках, аднак, відаць толькі адно слова: «унбэкантэр» (невядомы). Дзіцячы барак у лагеры, вечны страх і пагрозы, катаванні і тэрор фашысцкіх садыстаў адвучылі маленькіх пакутнікаў гаварыць».

Чытаю далей: «...немцы... пагрузілі дзяцей у машыны і адвезлі ў порт на пагрузку ў трум гандлёвага парахода «Мендэк». Усяго было пагружана з гэтых дзіцячых дамоў 300-330 дзяцей ва ўзросце ад неішлькіх месяцаў да чатырох гадоў. Дзяцей трымалі ў труме карабля на працягу двух дзён... Была страшная карціна пры пагрузцы, дзеці плакалі і крычалі, немаўляты былі складзены радамі на дне жалезнага трума... У кастрычніку 1944 года карабель адправіўся ў невядомым кірунку».

Не ўсіх знайшоў я былых вязняў з Асвейшчыны, не ўсіх распытаў...

Памятаеце, у пачатку кнігі латышскі паэт Эйжэн Вэверыс успамінаў партызанскага паэта з Віцебшчыны? Прыгадваю даўнюю публікацыю Еўдакіі Лось («Літаратура і мастацтва». 25.X.1968 г.) — «Жыў паэт партызанскі». Пра свайго земляка з Ушаччыны Е. Лось пісала так: «З хаты яго забралі паліцаі, павезлі ў Лепель. Васьмёра дзетак галасіла па бацьку. Дзе падзелі бацьку — невядома. Кажуць, закатавалі ў турме. Кажуць...»

Тут жа надрукаваны чатыры вершы партызанскага паэта, да вайны калгаснага брыгадзіра Івана Іванавіча Лукашонка. Яго вершы былі як зброя. «Іх змяшчалі ў насценгазетах і баявых лістках». Дык, можа, вершы Івана Лукашонка падымалі дух вязняў фашысцкіх канцлагераў, усялялі надзею на волю, на хуткую перамогу над ненавісным ворагам?

Недзе жывуць яго дзеці, недзе жывуць тыя, хто хоць калісьці бачыў ці чуў пра паэта з партызанскай Віцебшчыны. Верагодна, што гэта яго з Лепеля перапраўілі ў Полацк, а адтуль — у Саласпілс. Бо з Полаччыны найчасцей адпраўлялі нескароных у гэты лагер пад Рыгай.

Няма ў жывых зараз і Еўдакіі Якаўлеўны, хто першы абнародаваў вершы Івана Лукашонка. Але ўсё ж хочацца спадзявацца, што нейкія драбніцы з жыцця і гібелі гэтага слаўнага чалавека. ўспомняць людзі і дапамогуць узнавіць нам вобраз яшчэ аднаго змагара за волю і незалежнасць Радзімы.

Зноў і зноў вяртаюся да шматлікіх галасоў, што прагучалі, нібы магнітафонны запіс.

Што замест высновы можна сказаць? Што наша памяць — гэта не помета. Не помслівая наша памяць, а сцвярджальная, высакародная, справядлівая і — чэсная. Чэсная памяць чэсных людзей.

Але, на жаль, ёсць і другая «памяць», а дакладней, беспамяцтва, беспардонная фальсіфікацыя мінулага.

Хачу прывесці такі факт. У газеце «Знамя юности» (14.9.1982) быў надрукаваны артыкул «Неанацызм па тэлефоне». Там пісалася, што

варта ў ФРГ набраць код горада Людвігсхафена, а потым нумар аб'яўленага тэлефона, як у ацісаз чалавек пачуе магнітафонны запіс. Стужка, да прыкладу, можа растлумачыць, што «даныя пра ваенныя злачынствы нацызму не сапраўдныя, так як мы, немцы, на... злачынствы проста не здатныя».

Што гэта — падман з дапамогай тэхнічных сродкаў? Або хітрасць, каб улагодзіць сумленне недабіткаў фюрэра? ЦІ новая гнюснасць, каб адурманіць наіўнага юнца, падрыхтаваць з яго фашыста, толькі з прыстаўкай «неа»...?

У адказ на гэту сучасную мярзотнасць магу толькі прапанаваць адрасы соцень людзей з такога маленькага куточка маёй радзімы, як Асвейшчына, якія добра ведаюць, што такое фашызм і на што была здатная пры Гітлеру яго «вышэйшая раса» забойцаў. Лішні раз напомніць пра гэта нават сёння, праз столькі гадоў пасля Нюрнберга, вельмі і вельмі неабходна. Бо фашыстам, былым і сённяшнім, выгадна, каб у людзей была кароткая памяць, каб усе на свеце забылі жудасныя лічбы іх «дзейнасці».

Кожны раз я вяртаюся з Верхнядзвіншчыны, як са споведзі. Сустрэчы з Прыдзвіннем даюць мне зарад творчай энергіі. Бо людзі тут — з вялікім жыццёвым вопытам, народнай мудрасцю, актыўнай жыццёвай пазіцыяй, з незнішчальным жыццялюбствам, са спрадвечнай святой прагай да працы. Воіны Вялікай Айчыннай вайны сталі будаўнікамі, земляробамі. У адноўленым жытле зноў паявіўся найвялікшы клопат: «Каб з аднаго каласочка было паўрашаточка, а з аднаго снапочка была цэлая бочка». Як тут зноў не нагадаць Ганну Васільеўну Ушакову з вёскі Марозы. Яна была першая трактарыстка ў першых калгасах. Чым магла, дапамагала партызанам змагарнай Асвеі. Нават тытунём, соллю, запалкамі... Гэта сёння мы забылі цану гэтым рэчам. Перажыла чорныя блокі Равенсбрука. Пасля вайны знайшла ў Латвіі сына — маленькага вязня Саласпілса. Памятаеце, той прасіў, каб з хлебам заснуць. Маленькі чалавечак быў тым рады, што будзе ўдыхаць хоць водар хлеба, які, а ён гэта ўжо разумеў, нельга з'есці адразу, нельга з'есці — увесь.

У гаспадарцы Ушаковай Ганны Васільеўны не было нават сякеры. Яны пражылі да зімы 1945 года на пажарышчы роднай хаты ў шалашыку, зробленым з алешніку, абкладзеным ад ветру сенам, а паверх — зямлёй. Разам з падобнымі на яе лесам асвейцамі гэта жанчына аддавала свае сілы аднаўленню роднай зямлі, умацаванню свайго калгаса. І зараз, ужо старэнькая і хворая, сухарлявенькая жанчына не можа быць без работы. Летам, бывала, папросіць вынесці ў агародчык, бо сіла ног засталася ў карцэрах Равенсбрука. І цэлы

дзень працуе: праполвае, даглядае тое, што буяе, што расце, намоцна ўчапіўшыся каранямі ў горкую, шматпакутную зямлю — на месцы былых папялішчаў. Каля такіх людзей, як Ушакова, Кадыш Юзэфа, Мароз Валянціна, Варахоб Настасся, Мархель Савелій, Высоцкая Ніна, сям'я Юхневічаў, Абуховічаў, Уселенкаў, якія перажылі вайну, нельга быць раўнадушным да жыцця, да працы, да ўсяго, чым мы сёння багатыя. І па сённяшні дзень для людзей Прыдзвіння праца — як неабходнасць, як абавязак душы, як выкананне доўгу перад Радзімай, перад палеглымі за яе... Вось чым адметныя апаленыя вайной людзі з вёсак Марозаў, Каменцаў, Сар'і, Росіцы...

Хочацца, каб людзям Асвейшчыны, людзям з харошымі сэрцамі, залатымі рукамі, жылося яшчэ лепш: яны заслужылі ратным і мірным працоўным подзвігам павагу да сябе.

Людзі вёскі імкнуцца працаваць лепш, чым учора, гаспадарыць разумней, эфектыўней. Бо ведаюць цану хлебу, цану сваёй працы, ведаюць цану жыццю.

...Уеё яшчэ шукае сваіх бацькоў, сваю радню наша знаёмая Броня. Штогод у трэцюю нядзелю ліпеня ў Латвіі праходзіць Дзень памяці ахвяр Саласпілса. А іх — 100 тысяч! 100 тысяч, дарагая Броня. Мо ў гэтым страшным шэрагу і твая маці?

Броня часта бывае ў Саласпілсе, куды штогод з'язджаюцца вязні, бывае і на Кургане дружбы, што насыпаны недалёка ад Прошак у Верхнядзвінскім раёне. Штогод у першы тыдзень ліпеня тут збіраюцца баявыя пабрацімы. І сустракаюцца каля падножжа Кургана.

На наклон перад усенародным подзвігам бацькоў і прыехалі мы з Броняй на Курган дружбы. Да яго ідуць тры алеі: кляновая з тэрыторыі РСФСР, ліпавая — з Латвіі, бярозавай алеяй ідуць беларусы. Паперадзе нашай калоны — воіны з вянком, за імі дзяўчаткі ў прыгожых народных кроях, тут і праслаўленыя ветэраны — воіны Савецкай Арміі, былыя партызаны, партыйныя і савецкія работнікі... Бачу народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, побач з ім — першага сакратара Верхнядзвінскага райкома партыі Аляксандра Піліпавіча Каваленку...

Разгортваю складзенае ў салдацкі трохкутнік запрашэнне на свята: «Дарагі таварыш! Ты прыйшоў на Курган дружбы. Гэта мясціна ўвасабляе несмяротны ратны подзвіг савецкіх людзей, непарушнае воінскае брацтва рускіх, беларусаў і латышоў у гады Вялікай Айчыннай вайны...

Навек застануцца ў памяці народа імёны мужных воінаў, партызан і падпольшчыкаў, якія ратавалі свет ад фашысцкага рабства.

Будзь дастойны памяці паўшых! Памятай, таварыш, што ад тваёй працы на шчасце Краіны Саветаў залежыць мір і дабрабыт на Зямлі! Мацуй адзінства народаў СССР, інтэрнацыянальную дружбу брацкіх сацыялістычных краін!»

У чашы Кургана ўспыхвае свяшчэнны агонь. Хвіліна маўчання... Урачыста гучыць Дзяржаўны гімн СССР... На флакштоку лунае Дзяржаўны сцяг Савецкага Саюза..

На мітынгу гаварылі не толькі пра баявое адзінства народаў-пабрацімаў, а і пра сённяшнюю працоўную згуртаванасць, узаемавыручку, сацыялістычнае спаборніцтва Себежскага, Лудзенскага, Верхнядзвінскага раёнаў. Вечарам загарэўся партызанскі касцёр. Каля агню дружбы — былыя змагары за Перамогу з Мінска і Рыгі, Ленінграда і Пскова, Калініна, Ноўгарада, Кіева, Віцебска... Зноў пад небам былога Брадкага партыеанскага краю гарэла зыркае полымя. Полымя Міру, а не полымя вайны...

Мы вярталіся з Кургана дружбы... Заціхла жывая шматлюдная гаворка, і зноў урасталі ў задумёную, шапаткую цішыню. Падумалася, што калі сыдуць адсюль людзі, кожны клёнік, кожная ліпка, бярозка зноў будзе прамаўляць ад імя якога-небудзь тутэйшага чалавечага роду, галінка — ад імя сям'і: спаленай і жывой, а кожны лісток — ад імя загінуўшай і ўваскрэслай чалавечай душы...

...І што больш сказаць Браніславе? Што сказаць гэтай чакальнай цішыні?

Браніслава маўчала. Я расказаў ёй толькі маленькую долю з пражытага яе землякамі. Каго з асвейцаў прызнала яна блізкім да яе лесу, да яе шляхоў? Я не пачуў адказу. У яе засталася толькі адзіная мара, пра якую і паведаміла Браніслава не то мне, не то бярозам каля Кургана дружбы: каб роднае дзіцятка не зведала яе лесу, каб слова «мір» лагодным і вечным сонцам кружыла над кожным светлым домам нашай планеты.

На развітанне я расказаў Браніславе пра адну публікацыю-пошук у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», дзе расказвалася пра лес беларускага хлопчыка Колі, былога вязня Саласпілса, «якога выратавала латышская сям'я Кляменцьевых і прозвішча якой ён стаў насіць». Аўтар нарыса спадзяваўся тым самым адшукаць сапраўднае прозвішча чалавека. Сам Мікалай пісаў з Рыгі так[28]: «Даведацца ў сорак з лішнім гадоў пра сваіх бацькоў, чый ты родам, адкуль ты — само па сабе шчасце. Газетная публікацыя адрадзіла ў мяне надзею знайсці каго-небудзь з маіх родных». І вось Коля чакае, хто ж адгукнецца... А

[28] Літ. і мастацтва, 1983, 16 верас.

лес яго вельмі падобны да лесу Браніславы. З ліста відаць, што яны самі, іх бацькі ішлі поруч у тыя векапомныя гады. У вачах Браніславы ўспыхнулі іскаркі: — І я таксама не губляю надзеі знайсці сваю радню. Не адна ж я такая... Пашчасціць... Павінна і мне пашчасціць!

## ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

*Карнікамі не забітыя,*
*кручаныя — у вузел...*
*Ведаю ад незабытых,*
*кім я завуся.*
*Я з Беларусі,*
*з вёсачкі напаўпакінутай,—*
*з адкрытай, як рана, памяці.*
*Песнямі я сігавіты,*
*якімі зямлю сваю славіце.*
*Далі мне пазыку:*
*кагорту слоў мовы-пароды;*
*далі мне пазыку:*
*любоў, запавет несмяротны...*
*З народам, братам усіх народаў,*
*ніколі не буду,*
*ніколі не буду бязродны.*

Я не магу паставіць кропку ў гэтай дакументальнай аповесці. Кніга-пошук не закончана, бо не закончаны сам пошук людзей, народжаных пад небам Асвеі. Спадзяюся, што на публікацыю ўспамінаў, згадкі пра незабыўныя шляхі асвейцаў пошта прынясе новыя звесткі пра лёс людзей з Брацкага партызанскага краю. Таму я не развітваюся ні з Браніславай, ні з маімі знаёмымі — сааўтарамі гэтай кнігі. Не развітваюся і з чытачамі, якім абяцаю працяг аповесці пра новыя сустрэчы з людзьмі суровага лёсу, пра іх незгасальную Памяць.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## ЗМЕСТ

У сааўтарстве з землякамі
Пад небам Асвеі
Смерць у растэрміноўку
Сіла мацярынская
Крыло Радзімы
Замест пасляслоўя

Панізнік С.

Бранiслава: Дакум. аповесць. [Для сярэд. і ст. шк. узросту].— Мн.: Юнацтва, 1985.— 174 с., 8 л. іл.

Аўтар, карыстаючыся паказаннямі сведкаў і архіўнымі дакументамі, расказвае пра жорсткія расправы гітлераўцаў на Асвейшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На шматлікіх прыкладах паказана дружба беларусаў, рускіх, латышоў, якая дапамагла ім аб'яднаць свае намаганні ў ратаванні маленькіх вязняў Саласпілса.

Выкрываюцца чалавеканенавісніцкія ідэі фашызму, народная памяць заклікае да пільнасці перад пагрозай новага замаху імперыялістычнай рэакцыі на жыццё чалавецтва.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год